Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

15 ЛІПЕНЯ 2009 г.
СЕРАДА
№ 129
(26487)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«Прамая лінія»

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ, ДАПАМОГА

Апошнім часам статыстыка адзначае паступовы рост нараджальнасці. А адсюль — і павелічэнне цікавасці да тэмы сацыяльнай падтрымкі сем'яў і дзяцей. Дапамогі па доглядзе, бясплатнае харчаванне для дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў, дадатковыя гарантыі працоўнага заканадаўства бацькам — аб усім гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандры Васільеўны ЛІСОЎСКАЙ** і **кансультанта гэтага ж аддзела Марыны Барысаўны АРЦЁМЕНКІ.**

УВАГА! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе 21 ліпеня з 15 да 16 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.

«Прамая лінія»

ЯКІЯ ХВАРОБЫ ПАГРАЖАЮЦЬ ВАЧАМ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ

Сёння ўсё больш дзяцей становяцца пацыентамі афтальмолагаў. Якія прычыны зніжэння зроку ў дашкольнікаў? Як пазбегнуць зрокавых перагрузак падлеткам? Ці маецца генетычная схільнасць да тых або іншых захворванняў вачэй? Што рабіць, калі зрок пачаў падаць? На гэтыя і іншыя пытанні, звязаныя з работай органаў зроку ў дзяцей, падчас «прамой лініі» адкажа **галоўны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі БелМАПА Вікторыя Леанідаўна КРАСІЛЬНІКАВА.**

«Прамая лінія» адбудзецца 17 ліпеня, у пятніцу з 15.00 да 16.00 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефоне 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко).

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ДАРУЧЫЎ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БОЛЬШ ВЫСОКУЮ ДАСТУПНАСЦЬ БАНКАЎСКІХ КРЭДЫТАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў звярнуць асаблівую ўвагу на работу банкаўскай сістэмы па крэдытаванні рэальнага сектара эканомікі, у тым ліку па стварэнні ўмоў для паляпшэння даступнасці крэдытаў банкаў як насельніцтву, так і прадпрыемствам. Такую задачу ён паставіў 14 ліпеня ў час справаздачы старшыні праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча.

Пётр Пракаповіч паведаміў, што Нацбанкам будуць прыняты дадатковыя меры для выканання гэтага даручэння.

Прэзідэнту Беларусі даложана аб выніках работы банкаўскай сістэмы краіны за першае паўгоддзе 2009 года.

Ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу банкаўская сістэма краіны працавала над вырашэннем дзвюх галоўных задач: забяспечыць стабільную работу самой банкаўскай сістэмы і зрабіць усё магчымае для развіцця рэальнага сектара эканомікі. Як адзначыў Пётр Пракаповіч, у першым паўгоддзі гэтыя задачы максімальна выкананы, а таксама выкананы ўсе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі.

Банкаўская сістэма працуе стабільна. Нарошчваюцца ўласны капітал, рэсурсная база. Як падкрэсліў кіраўнік Нацбанка, у краіне няма ні аднаго праблемнага банка. Галоўным напрамкам работы банкаўскай сістэмы з'яўляецца і вырашэнне пытанняў па выкананні паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2009 год. З гэтай мэтай банкамі забяспечваецца пастаяннае крэдытаванне эканомікі. На 1 ліпеня запазычанасць па крэдытах у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года вырасла амаль у 1,5 раза. Стабільна працуе плацежная сістэма. За 6 месяцаў 2009 года было праведзена ў 1,6 раза больш плацяжоў, чым за адпаведны перыяд мінулага года.

Пётр Пракаповіч таксама нагадаў, што ў першым паўгоддзі ваганне курсу беларускага рубля ў адносінах да карзіны замежных валют было ў межах калідора +/- 5 працэнтаў. Нягледзячы на тое, што гэты калідор пашыраны да 10 працэнтаў, ваганне ў межах +/- 5 працэнтаў захоўваецца і цяпер, адзначыў Пётр Пракаповіч. Ён падкрэсліў, што ў бліжэйшы час няма неабходнасці выходзіць за гэту мяжу.

Што датычыцца золатавалютных рэзерваў, то ў параўнанні з пачаткам года іх запасы выраслі больш як на $200 млн. Як адзначыў старшыня праўлення Нацбанка, гэта павелічэнне невялікае, аднак важны сам факт нарошчвання. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў няўхільнага выканання асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі і ў другім паўгоддзі. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу максімальна выканаць усе заданні па развіцці банкаўскай сістэмы, забяспечыць і ў далейшым яе стабільнае развіццё і выкананне па выніках года ўсіх паказчыкаў.

Акрамя таго, Прэзідэнту даложана аб выніках работы Брэсцкай вобласці ў першым паўгоддзі, а таксама аб выкананні асобных даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу на вырашэнне пытанняў па правядзенні эксперыменту ў развіцці Шклоўскага і Пружанскага раёнаў. Як адзначыў Пётр Пракаповіч, работа гэтых раёнаў будзе ўзята пад асаблівы кантроль. У найбліжэйшы час кіраўніку дзяржавы будзе прадстаўлена праграма па іх развіцці.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Ва Урадзе

Фота БЕЛТА.

ДЗЕЦІ ПАДЧАС ЖНІВА АДПАЧЫВАЮЦЬ...

Аналізуючы сітуацыю і разважаючы аб ходзе падрыхтоўкі да ўборкі збожжа, **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён ШАПІРА,** зрэшты, пачаў з добрай навіны. У прыватнасці, ён паведаміў пра тое, што ўжо завершаная ўборка траў першага ўкосу, і пры ўсіх «сюрпрызах» надвор'я прайшоў укос вынікова: удалося нарыхтаваць 8,5 млн тон сенажу і 1,8 млн тон сіласу — гэта на 2,5 млн тон больш у параўнанні з адпаведнымі леташнімі паказчыкамі. А далей міністр распавёў аб праблемах, якія могуць паўплываць не лепшым чынам на ход жніва. Так, Сямён Шапіра праінфармаваў, што ў правядзенні ўборкі будзе прымаць удзел 12931 збожжаўборачны камбайн. На пачатак ліпеня статыстычная гатоўнасць камбайнаў складала 90 працэнтаў, зернесушылак — 87, іншых машын, што занятыя на ўборцы, — 90—94 працэнты. Аднак спецыялісты міністэрства, якія выязджалі ў гаспадаркі, заспелі іншую карціну, менш аптымістычную ў параўнанні з пададзенымі звесткамі. У прыватнасці, за 2 тыдні да пачатку масавага жніва 1200 камбайнаў былі не падрыхтаваныя да ўборкі, у межах рэспублікі да яе не гатовымі былі 47 раёнаў. Сярод найгорш падрыхтаваных у гэтым сэнсе міністр назваў Талачынскі, Браслаўскі, Пастаўскі, Дубровенскі, Докшыцкі, Мастоўскі, Слонімскі, Бярэзінскі, Клецкі, Кармянскі і Чэрвеньскі раёны. Акрамя таго, у кіраўніка Мінсельгасхарча шмат пытанняў і да зімовага рамонту тэхнікі, на які было выдзелена 40 мільярдаў рублёў. «Выдзеленыя грошы, — заўважыў ён, — пайшлі не па мэтавым прызначэнні». У якасці прыкладу міністр згадаў адну з гаспадарак Салігорскага раёна, дзе бюджэтныя сродкі для рамонту збожжаўборачнай тэхнікі былі накіраваныя для разліку з камерцыйнымі структурамі за раней выдзеленыя запчасткі. «Гэта пацвярджае, што аблвыканкамы не кантралююць выкарыстанне бюджэтных сродкаў», — заўважыў Сямён Шапіра. Між іншым, не выкупленымі былі таксама некалькі дзясяткаў камбайнаў і больш за 1400 рухавікоў, якія былі адрамантаваныя заводамі: прадпрыемствы цяпер чакаюць, калі ж гаспадаркі іх забяруць. «На гэта патрабуецца ўсяго 6 мільярдаў рублёў, — сказаў міністр. — Шэсць абласцей не маглі знайсці па 1 мільярдзе на гэтыя мэты, пры тым за першае паўгоддзе сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі атрымана каля 4 трыльёнаў выручкі».

Праваленай была, паводле яго слоў, і праграма гэтага года па ўводзе да пачатку ўборачнай зернесушыльных комплексаў. Між іншым, кіраўнікі раёнаў і гаспадарак, якіх тычылася крытыка, запэўнілі Мінсельгасхарч, што да 1 жніўня зернесушылкі будуць здадзеныя. У адваротным выпадку, папярэдзіў Сямён Шапіра, будуць прымацца арганізацыйныя і кадравыя рашэнні. Акрамя таго, правалена таксама праца па пераводзе топачных агрэгатаў на дзейныя зернесушылках на мясцовыя віды паліва: напрыклад, у Брэсцкай вобласці з 74 не ўстаноўлена ні аднаго, у Мінскай — са 106 толькі 2.

Прэм'ер-міністр краіны Сяргей Сідорскі на гэта катэгарычна заявіў: «Было дастаткова часу для выканання плана, але, на жаль, ёсць асобныя зрывы па зернесушыльных комплексах». Кіраўнік урада запатрабаваў забяспечыць іх увод, а таксама даручыў да 1 жніўня завяршыць усе запланаваныя мерапрыемствы па пераводзе зернесушылак на мясцовыя віды паліва. Вяртаючыся ж да пытання забеспячэння гаспадарак тэхнікай, ён падкрэсліў, што камбайны павінны быць пастаўлены ў мінімальныя тэрміны: на працягу ліпеня пытанне трэба закрыць. Сяргей Сідорскі таксама заявіў, што падчас жніва збожжаўборачныя камбайны не павінны прастойваць: гаспадаркі, у якіх больш за суткі тэхніка не будзе працаваць, будуць несці пакаранне. Ён зазначыў: «Камбайны павінны выкарыстоўвацца, і калі яны ламаюцца, вязіце запчасткі, рамантуйце, выводзьце іх на палі». На думку прэм'ера, імпартная тэхніка павінна абслугоўвацца ў такім жа рэжыме. «Дылеры, — лічыць ён, — калі яны хочуць працаваць у нашай рэспубліцы, павінны забяспечыць тэхніку дэталямі: няхай бяруць верталёты, самалёты, але паставяць дэталі, калі іх тэхніка прастойвае».

Як паведаміў Сямён Шапіра, сёлета таксама прынятае рашэнне аб забароне дзіцячай працы на ўсіх збожжаўборачных канвеерах. Кожны год тут адбываюцца няшчасці не толькі з дарослымі, але і з дзецьмі. У прыватнасці, летась, згадаў міністр, двое дзяцей былі траўмаваныя электраразрадам.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Адпраўка ў войскі маладога папаўнення пачнецца 15 ліпеня

Адпраўка ва Узброеныя Сілы Беларусі, іншыя войскі і воінскія фарміраванні грамадзян, прызваных на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве, пачнецца 15 ліпеня. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення камплектавання Галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генштаба Узброеных Сілаў Беларусі Сяргей Пузакоў, перадае карэспандэнт **БЕЛТА.**

Усяго для праходжання тэрміновай ваеннай службы на пасадах салдат і сяржантаў плануецца прызваць каля 10 тыс. чалавек і амаль 2 тыс. -- для службы ў рэзерве.

Урачыстыя провады новага папаўнення пройдуць у ваенных камісарыятах краіны. У Мінску ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя пачатку адпраўкі ў войскі новага папаўнення, адбудуцца 15 ліпеня на базе Мінскага гарадскога зборнага пункта, які адкрываецца. У гэты дзень амаль 300 чалавек, прызваных ваеннымі камісарыятамі Мінска, папоўняць рады Узброеных Сілаў, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў.

белагропромбанк
традиции будущего

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 года
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	240164,9	166282,5
3	Средства в Национальном банке	1102	2	188926,6	306205,9
4	Ценные бумаги:	1103		908753,0	420596,5
	для торговли	11031	3	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	5,3	-
	в наличии для продажи	11033	3.2	908747,7	420596,5
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	133404,1	83642,0
6	Кредиты клиентам	1106	5	15514966,6	9037072,0
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	35595,3	16662,6
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	428582,7	305504,6
9	Прочие активы	1109	8	127316,5	54504,2
10	ИТОГО активы	110		17577709,7	10390470,3
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	2099791,3	773422,7
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	2780337,9	1627413,6
14	Средства клиентов	1206	11	7898018,5	5366208,8
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		196887,1	252710,5
16	Прочие обязательства	1209	12	151512,6	67833,6
17	ВСЕГО обязательства	120		13126547,4	8087589,2
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	3828633,5	1878634,0
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		85500,1	41861,8
22	Накопленная прибыль	1214	14	310524,9	206204,5
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	226503,8	176180,8
24	ВСЕГО капитал	121		4451162,3	2302881,1
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		17577709,7	10390470,3
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	15029131,7	8467923,3
28	Обязательства	1302	17	2691562,5	1832373,6

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 года
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	Процентные доходы	2011		961507,0	422225,0
2	Процентные расходы	2012		684095,9	284085,6
3	Чистые процентные доходы	201	18	277411,1	138139,4
4	Комиссионные доходы	2021		107825,3	81496,4
5	Комиссионные расходы	2022		13544,5	5697,5
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	94280,8	75798,9
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	(-122173,5)	25653,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	(-432,9)	157,5
9	Доход в форме дивидендов	205		145,2	80,6
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	81626,3	29514,6
11	Прочие доходы	207	23	186637,9	12373,4
12	Операционные расходы	208	24	184767,9	144062,6
13	Прочие расходы	209	25	27778,1	5606,7
14	Налог на прибыль	210		45967,8	22988,9
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		95728,5	50030,5

Председатель Правления С.Н. Румас
И.о. главного бухгалтера И.А. Медвецкий

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней:
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

БЕЛАРУСЫ ПАЦЯРПЕЛІ Ў ДТЗ У КРЫМЕ

Учора раніцай на аўтадарозе Сімферопаль — Феадосія — Керч у ДТЗ трапілі «Жыгулі» і мікрааўтобус з турыстамі.

Паводле звестак інфармагенцтваў, аварыю справакаваў кіроўца легкавушкі, які пайшоў на абгон грузавіка і выехаў на сустрэчную паласу, па якой рухаўся мікрааўтобус. Віноўнік ДТЗ у выніку сутыкнення загінуў на месцы, яшчэ аднаго пацярпелага не змаглі выратаваць урачы ў бальніцы. У медустановы з месца здарэння быў дастаўлены яшчэ 21 чалавек, 17 з якіх былі шпіталізаваныя. Паводле звестак МНС Украіны, сярод пацярпелых ёсць і 5 жыхароў нашай краіны: двое магіляўчан і трое віцябчан.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УРАД БРЫТАНІІ АДМЯНІЎ ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ

Урад лейбарыстаў адмяніў у Вялікабрытаніі пенсійны ўзрост, палічыўшы, што ён абмяжоўвае правы пажылых людзей.

У Вялікабрытаніі ўжо ў гэтым годзе будзе ліквідавана само паняцце пенсійнага ўзросту: людзі змогуць працаваць столькі, колькі яны самі палічаць неабходным, і пакуль будуць спраўляцца з усімі службовымі абавязкамі.

Ініцыятыву растлумачылі тым, што ў сучасным брытанскім грамадстве ўзрост чалавека практычна перастаў адчувацца з-за сацыяльных і працоўных зменаў, людзі захоўваюць актыўнасць да гранічнага веку і застаюцца запатрабаванымі нават на схіле сваіх гадоў.

А летась упершыню ў краіне колькасць пенсіянераў перавысіла колькасць школьнікаў.

Свой унёсак у адмену пенсійнага ўзросту зрабіў і цяперашні эканамічны крызіс. Праведзенае па замове ўрада адмысловае даследаванне паказала, што для пераадолення цяжкіх наступстваў крызісу брытанцы павінны працаваць на 7 гадоў даўжэй. Аднак урад вырашыў наогул адмяніць пенсійны ўзрост. Застаецца толькі вызначыць, з якога ўзросту і каму будзе выплачвацца мінімальная дзяржаўная пенсія.

ДЭФІЦЫТ БЮДЖЭТУ ЗША ЎПЕРШЫНЮ ПЕРАВЫСІЎ ТРЫЛЬЁН ДОЛАРАЎ

Паводле звестак міністэрства фінансаў ЗША, дэфіцыт бюджэту ў 2009 фінансавым годзе, які стартаваў у кастрычніку 2008-га, упершыню ў гісторыі дзяржавы перавысіў трыльён долараў.

Бюджэтны дэфіцыт у памеры $1,086 трлн быў дасягнуты па выніках чэрвеня — дзявятага месяца фінансавага года. Між тым як чэрвень традыцыйна лічыцца прыбытковым месяцам для амерыканскай казны.

Асноўнай прычынай рэкорднага росту дэфіцыту амерыканскага бюджэту аналітыкі лічаць дзяржвыдаткі, накіраваныя на барацьбу з фінансавым крызісам і падтрыманне эканомікі, а таксама зніжэнне падатковых паступленняў.

Акрамя таго, значны ціск на бюджэт аказваюць ваенныя выдаткі на вайну ў Іраку і Афганістане.

Раней паведамлялася аб тым, што прагназаваны памер бюджэтнага дэфіцыту ЗША на 2009 фінансавы год складае $1,8 трлн, што ў чатыры разы больш за дэфіцыт у 2008 годзе.

ПРЭЗІДЭНТ ЛІТВЫ АДМОВІЛАСЯ АД ПАЛОВЫ ЗАРПЛАТЫ

Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ адмовілася ад паловы зарплаты, якая належыць ёй як кіраўніку краіны, на карысць дзяржаўнай казны. Зарплата прэзідэнта Літвы складае каля 21 тысячы літаў (больш за 6 тысяч еўра).

Як заявіла Грыбаўскайтэ, ёй будзе хапаць паловы зарплаты і штомесячнай выхаднай дапамогі, якая належыць ёй як былому камісару Еўрапейскай камісіі па бюджэце і фінансавым планаванні. Дарэчы, сума дапамогі пасля выплаты ўсіх падаткаў складае 7,9 тысячы еўра.

Выхадная дапамога выплачваецца на працягу трох гадоў усім камісарам Еўрасаюза, якія пакінулі пост, у выпадку, калі іх зарплата на новай пасадзе меншая за ранейшую ўдвая. Пры гэтым сума дапамогі складае палову былой зарплаты камісара. Грошы паступаюць з агульнага бюджэту Еўрасаюза.

Адпачыць у Беларусі

АЎГУСТОЎСКІ КАНАЛ ЗАПРАШАЕ...

Усіх, хто трызніць рамантыкай вандровак, хоча пабачыць некранутыя месцы роднай зямлі і адчуць подых прыроды, чакае Аўгустоўскі канал — выдатны помнік гідраўлічнай архітэктуры першай паловы XIX стагоддзя. У свеце існуюць толькі два аналагі гэтага воднага шляху — у Швецыі і Вялікабрытаніі. Сёння канал — папулярная зона адпачынку. У сезон навігацыі, з вясны да позняй восені, сюды імкнуцца прыехаць на выхадныя, каб падыхаць свежым паветрам, палюбавацца прыгажосцю прыроды, паплаваць на лодках, катамаранах і, безумоўна, на цеплаходзе. Артэрыя канала праходзіць па месцах ляснога масіву Аўгустоўскай пушчы, дзе захаваліся рэдкія віды раслін і жывёл. А самая вялікая на канале плаціна шлюза ў Дамброўцы з высокім вадаспадам становіцца месцам прыхільнікаў каскадных ваннаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ISSN 1990 - 763X

Беларусь надае вялікае значэнне развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з Францыяй

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі з нацыянальным святам — Днём узяцця Бастыліі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь надае вялікае значэнне развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з Францыяй ва ўсіх сферах. Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею на тое, што двухбаковыя адносіны будуць паспяхова развівацца на карысць народаў дзвюх краін.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У Выканаўчым камітэце СНД у Мінску 14 ліпеня адбылася цырымонія адкрыцця фотавыставы, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння выдатнага палітычнага дзеяча, выбітнага дыпламата Андрэя Андрэевіча Грамыкі.

Фота Максіма ГУЧАКА, БЕЛТА.

Сітуацыя

Беларусь часова забараніла ўвоз свініны з Літвы

Галоўнае ўпраўленне ветэрынарыі з Дзяржаўнай ветэрынарнай і Дзяржаўнай харчовай інспекцыямі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі з 13 ліпеня 2009 года да высвятлення эпізаатычнай сітуацыі ў Літве часова забараняе ўвоз у Беларусь жывых свіней, спермы кныроў, свініны і прадуктаў яе перапрацоўкі з Літоўскай Рэспублікі ў сувязі з выяўленнем выпадку класічнай чумы свіней. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла прэс-сакратар Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Дар'я КАЗЛОЎСКАЯ.

Прыпыняюцца дзеянні раней выдадзеных дазволаў на ўвоз вышэйназваных тавараў. Забараняецца ўвоз названай прадукцыі ў паштовых пасылках і ручной паклажы пасажыраў. Гэтыя дзеянні з беларускага боку прыняты на падставе пісьма Дзяржаўнай харчовай і ветэрынарнай службы Літоўскай Рэспублікі.

У Паневяжыскім раёне Літвы на свінаферме Pasodele, якая належыць дацкай кампаніі, зарэгістравана ўспышка свіной чумы. Дзяржаўная харчовая ветэрынарная служба Літвы паведаміла, што пасля лабараторнага пацвярджэння захворвання на свіную чуму была накладзена часовая забарона на вывад свіней з тэрыторыі Літвы. Аб выпадку захворвання праінфармаваны Еўрапейская камісія і суседнія краіны. Аб'яўлены каранцін, прымаюцца ўсе меры, каб не дапусціць распаўсюджвання захворвання. На фермах Pasodele знішчаны 445 свіней, завезеных у Літву з Даніі, праведзена дэзынфекцыя.

Праведзены агляд усіх свінагадоўчых комплексаў, што знаходзяцца непадалёк, праходзяць лабараторныя даследаванні: аналізы на чуму бяруць у свіней і дзікоў, што насяляюць навакольле Паневяжыса. Свіная чума не ўяўляе небяспекі для людзей. Заражэнне зарэгістраваным у Паневяжыскім раёне тыпам віруса не назіралася ў Еўропе ўжо 9 гадоў. У 2007 годзе такі вірус, што выклікае свіную чуму, быў зарэгістраваны ў краінах Азіі і Паўднёвай Афрыкі.

Як нас дураць

Махляр, а «па сумяшчальніцтве» — дырэктар

Па ўсёй Беларусі «наслядзіў», выкарыстоўваючы мудрагелістыя схемы і залішні давер партнёраў, 46-гадовы махляр, а «па сумяшчальніцтве» — дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасцю. Доўгі час яму ўдавалася, як кажуць, выходзіць сухім з вады, аднак у Ваўкавыскім раёне, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, нячысты на руку бізнэсмен ўсё ж трапіў у поле зроку праваахоўнікаў і быў узяты пад варту.

Паводле інфармацыі **начальніка аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Ваўкавыскага РАУС маёра міліцыі Максіма ПАРЫШКУРЫ,** яшчэ на пачатку сваёй прадпрымальніцкай дзейнасці гэты мінчанін, будучы заснавальнікам адной з камерцыйных структур, зарэкамендаваў сябе чалавекам з сумнеўнай рэпутацыяй, з-за чаго была накладзена забарона на яго ўдзел у статутных фондах арганізацый розных формаў уласнасці. Але што з гэтага? Мужчына стаў... скупляць фірмы, мінуючы вызначаныя законам абмежаванні, а ў якасці заснавальнікаў за невялікае ўзнагароджанне выступалі падстаўныя асобы. Увагнаўшы ў даўгі чарговую камерцыйную структуру, махляр браўся за наступную.

З 2007 года махляр прычыніў эканамічныя страты шэрагу прадпрыемстваў, у тым ліку і Ваўкавыскага раёна. На адным з іх, да прыкладу, прадпрымальнік узяў станок з намерам зрабіць яго рамонт па істотна завышаных цэнах з наступным «адкатам» свайму контрагенту. А ў Лідзе назваўся службовай асобай іншай фірмы і махлярскім шляхам завалодаў дзвюма сеялкамі (кошт тэхнікі склаў каля 40 мільёнаў рублёў), якія затым апынуліся ў Гомельскай вобласці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Абзац

◢ **Дзеці шасці і дванаццаці гадоў пацярпелі ў ДТЗ у Мінску. Вадзіцель аўтамабіля «Фальксваген Пасат» на скрыжаванні сутыкнуўся са скутарам, у выніку быў паранены 12-гадовы пасажыр скутара. Вадзіцель такога ж аўтамабіля наехаў на 6-гадовага хлопчыка, які пераходзіў дарогу. Хлопчык атрымаў раненні.**

◢ У аздараўленчым лагеры «Зорачка» пад Баранавічамі прапалі тры мабільнікі. Міліцыя пачала шукаць злодзеяў і было выяўлена, што ў пакоях корпуса пабывалі вучні Быценьскай школы-інтэрната — залезлі праз форткі вокнаў. Тэлефоны вярнулі.

◢ **У міліцыю з заявай звярнулася 81-гадовая жыхарка Бырысава. Яе 22-гадовая ўнучка за некалькі дзён да гэтага сышла з дому, і яе месцазнаходжанне было невядомае. Следча-аператыўная група, якая прыбыла на месца, знайшла ў шафе ў кватэры пенсіянеркі труп дзяўчыны з цялеснымі пашкоджаннямі. Міліцыя вызначыла, што ўвечары ў дзень знікнення ўнучкі яе 33-гадовы сябар пасля сумеснага распіцця спіртных напояў збіў дзяўчыну да смерці з-за рэўнасці, пасля чаго цела схаваў у шафу. Падазроны затрыманы.**

Поўны абзац

◢ Шэраг турыстычных агенцтваў Францыі прапануюць кампенсацыю людзям, якія не атрымалі дастаткоўкай колькасці сонца падчас адпачынку. Так, дзве кампаніі будуць часткова кампенсаваць выдаткі турыстаў на паездку ў тым выпадку, калі колькасць сонечных дзён на працягу любога тыдня іх адпачынку складзе не менш чатырох. Яшчэ адна кампанія будзе разлічваць суму страхоўкі на падставе спадарожнікавых звестак пра надвор'е ў тым рэгіёне, дзе адпачываў турыст. Сума кампенсацыі можа дасягаць 400 еўра. На мабільны тэлефон ці электронную пошту адпачывальнікаў будуць прыходзіць адпаведныя паведамленні. Праз некалькі дзён пасля вяртання дадому яны могуць атрымаць чэк з кампенсацыяй. Летась па выніках такой акцыі выдаткі на паездку былі часткова кампенсаваныя 10 % яе ўдзельнікаў.

◢ **Кіданне вясельнага букета з борта самалёта прывяло да крушэння лятальнага апарата. Самалёт упаў на інтэрнат, дзе сабралася каля 50 чалавек. Інцыдэнт адбыўся непадалёк ад італьянскага горада Ліворна. Маладыя, якія бралі шлюб, вырашылі зрабіць абрад кідання вясельнага букета незамужнім гасцям больш разнастайным — і арандавалі лёгкі самалёт. Кідаць букет меўся пасажыр самалёта — 44-гадовы Ізідора Пенсьеры. Самалёт пралятаў у гэты момант над рэстаранам, дзе сабраліся госці. Але букет трапіў не да іх, а ў рухавік самалёта, у выніку чаго ён загарэўся. 60-гадовы лётчык, страціўшы кантроль над самалётам, спікіраваў на інтэрнат, дзе было каля 50 гасцей. На шчасце, ніхто з гасцей не пацярпеў, толькі кідальнік атрымаў ЧМТ і пераломы абедзвюх ног. Такім чынам, вяселле было сапсаванае, і на святочную вячэру ніхто не застаўся.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Першы «базарны» інвестыцыйны форум

У Віцебску падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў упершыню праходзіць міжнародны інвестыцыйны форум. Ідэя яго правядзення належыць старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандру КОСІНЦУ. Ён павіншаваў усіх удзельнікаў, якім улады абяцаюць падтрымку ва ўсіх цікавых прапановах.

Нагадаю, што па ініцыятыве губернатара аналагічны маштабны форум адбыўся сёлетняй вясной. На ім былі прадстаўлены 150 інвестыцыйных прапаноў на агульную суму каля мільярда рублёў, з якімі пазнаёміліся бізнэсмены з 20 краін. У выніку былі заключаны дагаворы і пагадненні на 350 мільёнаў долараў.

Цяпер чакаецца, што «базарны» форум будзе яшчэ больш прадукцыйным. Лепшага часу, чым на «базары», для бізнэс-сустрэч і прыдумаць нельга. Патэнцыйныя інвестары могуць на свае вочы ўбачыць, як насычаны правінцыйны горад рознымі падзеямі, упэўніцца, як выгадна можна было б укласці грошы ў развіццё турыстычнага і гасцінічнага бізнэсу, пункты харчавання і гэтак далей. Хоць, канешне, мясцовыя ўлады зацікаўленыя ў інвестыцыях у рэгіён у цэлым.

Сярод усяго іншага дзелавым людзям прапануецца ўкласці грошы ў стварэнне віцебскага парка забаў — аналаг Дыснейленда. Пры гэтым будаўнічыя работы ажыццявяць тутэйшыя спецыялісты. Спадзяюцца знайсці інвестараў і для будаўніцтва гасцінічных комплексаў у Віцебску і Полацку. І віцебскаму гатэлю з аднайменнай назвай ужо даўно патрабуецца рэканструкцыя.

Прыярытэтны інвестыцыйны праект — стварэнне сучаснага транспартна-лагістычнага цэнтра ў раёне віцебскага аэрапорта. Мяркуецца выкарыстанне аэрапорта, што мае сертыфікат міжнароднага ўзроўню, для ажыццяўлення транзітных пералётаў з Італіі ў Маскву і Піцер. А пад Оршай, у пасёлку Балбасава, плануюць стварыць базы для размяшчэння малой авіяцыі — самалётаў і верталётаў са сталіцы Расіі.

Яшчэ наконт глыбінкі. Ёсць прапанова адкрыць у Глыбоцкім раёне вытворчасць натуральных вінаградных вінаў і каньяку, а ў Паставах — прадпрыемства па вырабе сучасных матэрыялаў з адходаў дрэваапрацоўкі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

А ТВОРЦЫ ХТО?

Магіляўчане выбіраюць ганаровую дзясятку выбітных асобаў у гісторыі свайго горада

Праект «Творцы магілёўскай гісторыі» прапанавала гараджанам цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк. Яе дырэктар Галіна КРАЎЧАНКА заўважыла, што маладыя людзі цікавяцца расійскім выданнем «100 чалавек, якія змянілі ход гісторыі». З гэтага і нарадзілася ідэя правесці сваё апытанне грамадскай думкі.

— Проста я задумалася: а ці ведаюць магіляўчане пра тых, хто ствараў нашу гісторыю? — расказала яна. — Таму наш праект — гэта не проста маніторынг, але яшчэ і добрая асветніцкая праца.

Бібліятэкары звярнуліся да гараджан з пытаннем: «Каго з землякоў Вы лічыце выбітнай асобай?» І прапанавалі спіс з амаль двух дзясяткаў вядомых прозвішчаў. Сярод іх дружкары, асветнікі, навукоўцы, грамадскія і рэлігійныя дзеячы, пісьменнікі, мастакі, краязнаўцы.

У апытанні ўжо ўзялі ўдзел каля тысячы магіляўчан. Людзі галасуюць на гарадскіх інтэрнэт-сайтах і ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы. Там кожныя некалькі дзён абнаўляюцца звесткі пра дзясятку лідараў. Пакуль спіс творцаў магілёўскай гісторыі ўзначальвае **Ота ШМІДТ** — навуковец, акадэмік, Герой Савецкага Саюза, арганізатар асваення Паўночнага марскога шляху.

На другім месцы **пісьменнік Канстанцін СІМАНАЎ,** які прысвяціў свае творы абаронцам Магілёва ў Вялікую Айчынную вайну. А на трэцім — мастак **Павел МАСЛЕННІКАЎ,** імя якога носіць Магілёўскі мастацкі музей.

Сярод папулярных гістарычных асобаў — самыя розныя людзі. Напрыклад, праваслаўны архіепіскап **Георгі КАНІСКІ,** які жыў у XVIII стагоддзі, а цяпер прылічаны да ліку святых. Ураджэнец Магілёва **Міхаіл СУДЗІЛОЎСКІ,** які стаў географам-вандроўнікам, а потым — прэзідэнтам Гавайскай Рэспублікі. **Спірыдон СОБАЛЬ** — друкар, які ў XVII стагоддзі выдаў першы беларускі буквар. Губернатар **Аляксандр ДЭМБАВЕЦКІ,** які напрыканцы XIX стагоддзя склаў унікальны «Вопыт апісання Магілёўскай губерні».

— У нашай анкеце можна не толькі выбраць дзесяць чалавек са спісу, але і зрабіць свае прапановы, — паказвае стос анкет Галіна Краўчанка. — Напрыклад, я запісала Мікалая Гартынскага, гісторыка і асветніка XIX стагоддзя. Людзі ўзгадваюць цяперашніх кіраўнікоў горада і краіны, краязнаўцаў, дзеячаў культуры. А адзін магіляўчанін запісаў свайго дзеда Фёдара, танкіста.

Галіна КРАЎЧАНКА заклікае магіляўчан прагаласаваць за галоўных творцаў гісторыі свайго горада.

Галасаванне па творцах магілёўскай гісторыі працягнецца яшчэ некалькі месяцаў. Пасля таго, як дзясятка канчаткова вызначыцца, бібліятэчная сістэма мяркуе выдаць буклет і зрабіць электронную прэзентацыю, прысвечаныя кожнай асобе і, за адным разам, Магілёву часоў яе жыцця. У планах наступнага года — выданне дзіцячай энцыклапедыі па гісторыі Магілёва.

Ілона ІВАНОВА.

Беларусь і свет

СЛОВА — ЗА ЗАПРОШАНЫМІ

Польшча як член Еўрасаюза чакае ініцыятыў ад... усходніх партнёраў

З 2007 года пачаўся дастаткова інтэнсіўны палітычны дыялог паміж Беларуссю і Польшчай, — адзначае **пасол Польшчы ў Беларусі Генрык ЛІТВІН.** За гэты час праведзены шэраг сустрэч на ўзроўні міністраў замежных спраў, намеснікаў прэм'ер-міністраў. «Дыялог развіваецца, ён вядзе да сустрэч на яшчэ больш высокім узроўні», — падкрэсліў кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва Польшчы ў Беларусі. І падрыхтоўка сустрэчы на найвышэйшым узроўні, паводле слоў пасла, вядзецца, хоць сёння пакуль і рана гаварыць пра тое, калі яна можа адбыцца. Больш акрэсленай выглядае перспектыва сустрэчы кіраўнікоў урада. «Цяпер можам гаварыць пра сустрэчу прэм'ер-міністраў, без сумнення», — запэўніў дыпламат. Ён падкрэсліў, што яе трэба падрыхтаваць, і чакаецца, што гэта адбудзецца досыць хутка.

Усходняе партнёрства Генрык Літвін назваў самай важнай ініцыятывай апошніх гадоў, а нашу краіну — ключавым партнёрам Польшчы на Усходзе. У рэалізацыі праграмы многае залежыць ад актыўнасці партнёраў, падкрэслівае кіраўнік дыпмісіі. Польскі бок перш за ўсё разлічвае на ініцыятыву беларускага боку (і пра гэта Польшча гаворыць не як наша суседка, а як удзельніца ЕС, такая пазіцыя Еўрасаюза распаўсюджваецца не толькі на Беларусь — на ўсіх удзельнікаў Усходняга партнёрства, нагадаем, што апроч нашай краіны ў праграму запрошаныя Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова і Украіна) у рэалізацыі канкрэтных сур'ёзных праектаў. Маецца на ўвазе не толькі эканамічнае супрацоўніцтва, але і гуманітарная сфера. Ёсць ужо канкрэтныя эскізы такіх праектаў, і яны разглядаюцца.

Беларуска-польскія кантакты ў сацыяльна-культурнай сферы — даўнія і плённыя. Добра паказала сябе «Нясвіжская акадэмія» — ініцыятыва, у рамках якой беларускія, украінскія, расійскія спецыялісты ў галіне культурнай спадчыны павышаюць узровень сваёй падрыхтоўкі пры ўдзеле спецыялістаў з іншых краін, у асноўным з Польшчы. Польшча, як і Беларусь, прайшла цяжкія перыяды ў сваёй гісторыі, многае з культурнай спадчыны было знішчана. Падыход польскіх спецыялістаў у гэтай справе можа выкарыстоўвацца ў Беларусі, мяркуе кіраўнік дыпламатычнай місіі. Ёсць разважаюцца сцягі дзяржаў — членаў ЕС і жоўтыя зоркі Еўрасаюза на блакітным фоне. Стальная канструкцыя мачтаў з'яўляецца падарункам Гданьскай суднабудаўнічай верфі. З Польшчай звязана назва і дзядзінца Еўрапарламента, які носіць імя загінулага год таму ў аўтакатастрофе еўрадэпутата, былога міністра замежных спраў гэтай краіны Браніслава Герэмека. А ў цэнтры дзядзінца стаіць шкляны шар — мастацкі твор, падараваны горадам Вроцлавам.

У Страсбургу, як вядома, дэпутаты знаходзяцца толькі некалькі дзён у месяц, падчас пленарных пасяджэнняў. Сюды ўсякі раз прыбываюць з Брусэля вялізныя скрыні, у якіх перавозіцца ўся офісная гаспадарка дэпутатаў, якая вяртаецца пасля сесій назад у сталіцу Бельгіі, дзе знаходзяцца пастаянныя офісы еўрапейскіх выбраннікаў і ўся адміністрацыя. Такая працэдура амаль паўсюдна (іншае меркаванне, па вядомых прычынах, толькі ў французаў) лічыцца стратай часу і грошай. Раскоша існавання штаб-кватэры Еўрапарламента ў Страсбургу абыходзіцца еўрапейскім падаткаплацельшчыкам у 200 млн еўра ў год. Час ад часу дэпутатаў турбуе інфармацыя аб тэхнічным стане цудоўнага, але непрактычнага будынка ў Страсбургу. У жніўні 2008-га абваліўся дах у зале пленарных пасяджэнняў. Калі б у той час там былі дэпутаты, то гэта магло б выклікаць значныя людскія ахвяры. У апошні час дэпутатаў таксама непакоіць інфармацыя аб дрэнным супрацьпажарным стане будынка.

Пастаянныя паездкі дэпутатаў з Польшчы ў Брусэль і Страсбург і праца ў Еўрапарламенце даволі шчодра аплачваюцца. Пачынаючы з гэтага склікання, польскія дэпутаты зарабляюць нароўні з прадстаўнікамі іншых дзяржаў: 7665 еўра ў месяц. Плюс да гэтага атрымліваюць па 287 еўра сутачных за кожны дзень знаходжання ў Еўрапейскім парламенце і пакрыццё транспартных выдаткаў.

На колькасці дэпутатаў Польшча займае шостае месца ў ЕП. Колькасць мандатаў залежыць ад велічыні насельніцтва. Больш за ўсё дэпутатаў — 99 — ад Германіі, менш за ўсё — 5 — ад Мальты. У Еўрапарламенце дэпутаты засядаюць не ў нацыянальных, а ў палітычных групах. Палякі сканцэнтраваныя ў трох фракцыях: «Грамадзянская платформа» і Польская сялянская партыя — у групе хрысціянскіх дэмакратаў, Саюз левых дэмакратаў — у сацыялістычнай групе, а «Закон і справядлівасць» — у групе кансерватараў і рэфарматараў.

Разам з Бузэкам у памяшканнях яго сакратарыята зоймуць месцы паўтара дзясятка адказных супрацоўнікаў і дапаможнага персаналу. Згодна з існуючым становішчам, з кожным новым скліканнем ЕП мяняецца ўвесь склад супрацоўнікаў, уключаючы сакратарак. Ужо вядома, што ў кабінеце Бузэка акрамя палякаў будуць працаваць прадстаўнікі з Венгрыі, Румыніі, Францыі і Германіі. Бузэк, як кіраўнік ЕП, будзе старшынстваваць у двух органах. Гэта прэзідыум, у склад якога ўваходзяць 14 намеснікаў старшыні, і Канферэнцыя старшыняў, у склад якой уваходзяць кіраўнікі ўсіх фракцый парламента.

Што плануе змяніць новы старшыня ЕП? «Нам не хапае жывых дыскусій у ЕП на ўзор брытанскага парламента. Думаю, мы іх увядзём у найбліжэйшыя 2,5 года»,— заявіў Бузэк.

У распараджэнні старшыні ЕП паўтара дзясятка пакояў, у тым ліку салон для прыёму гасцей, а таксама службовы «БМВ» з вадзіцелем. Кабінет старшыні знаходзіцца на 13-м паверсе аднаго з будынкаў у Брусэлі. З яго адкрываецца цудоўная панарама, а з-за пісьмовага стала відаць усе найважнейшыя будынкі ЕС, уключаючы Еўракамісію і Савет Саюза. Кабінет мае форму літары L. Асабістых акцэнтаў няшмат, затое там ёсць элементы сучаснага мастацтва. Найбольш выразным з'яўляецца фрэска «Выкраданне Еўропы», падараваная Іспаніяй. А раз у месяц Бузэк будзе перарэзджаць у Страсбург, дзе на 16-м паверсе будынка ЕП у яго таксама ёсць цудоўны кабінет з фантастычным выглядам на горад і басейн перад будынкам.

Атрыманне прадстаўніком Польшчы пасады старшыні Еўрапарламента можа азначаць для Беларусі больш канструктыўны дыялог з Еўрасаюзам, бо менавіта Польшча пры падтрымцы Швецыі была ініцыятарам еўрапейскай праграмы «Усходняе партнёрства». Сам Ежы Бузэк у адрозненне ад Ганса Пёттэрынга, папярэдняга спікера Еўрапарламента, настроены на ўмацаванне адносінаў па лініі Мінск—Брусэль.

Падрыхтаваў Міхаіл БАЦЯН.

ПАЛЯК УЗНАЧАЛІЎ ЕЎРАПАРЛАМЕНТ

Учора ў Страсбургу адкрылася першая сесія Еўрапейскага парламента (ЕП) новага склікання, якую польская газета «Жэчпаспаліта» назвала гістарычнай, паколькі старшынёй такой аўтарытэтнай установы ЕС упершыню становіцца палітык з-за былой «жалезнай заслоны».

— Я ўсхваляваны. Гэта канец падзелу Еўропы на «вы» і «мы», — сказаў, выступаючы напярэдадні перад журналістамі на прэсавай канферэнцыі, былы польскі прэм'ер-міністр Ежы Бузэк. Яго выбранне было прадказальным, бо кандыдатуру польскага палітыка падтрымалі ўсе самыя важныя палітычныя групы Еўрапарламента — не толькі хрысціянскія дэмакраты і сацыялісты (яны заключылі пагадненне, згодна з якім старшынства ў цяперашнім скліканні парламента будзе падзелена на два роўныя тэрміны паміж Бузэкам і нямецкім сацыялістам Марцінам Шульцам), але і лібералы, кансерватары і рэфарматары, а таксама зялёныя, для якіх выбранне паляка на адну з самых важных пасад у ЕС з'яўляецца сімвалам аб'яднання Еўропы.


НАША ДАВЕДКА

Ежы Кароль Бузэк нарадзіўся 3 ліпеня 1940 года. Прафесар у галіне тэхнічных навук. Актывіст прафсаюза «Салідарнасць» з моманту яго заражэння. Дэпутат Сейма III склікання і прэм'ер-міністр у 1999—2001 гг. Упершыню быў абраны дэпутатам Еўрапарламента 13 чэрвеня 2004 года найбольшай у Польшчы колькасцю галасоў. Член евангелісцка-аўгсбургскай царквы.

Як адзначаюць аналітыкі, выбранне Бузэка дазволіць 50 польскім еўрадэпутатам, з якіх 31 выбраны ўпершыню, адчуць сябе ў Страсбургу больш свабодна. Але гэта не адзіны польскі акцэнт у сталіцы Эльзаса. Ля ўвахода ў Еўрапарламент стаіць 28 гіганцкіх мачтаў, на якіх развяваюцца сцягі дзяржаў — членаў ЕС. Стальная канструкцыя мачтаў з'яўляецца падарункам Гданьскай суднабудаўнічай верфі. З Польшчай звязана назва і дзядзінца Еўрапарламента, які носіць імя загінулага год таму ў аўтакатастрофе еўрадэпутата, былога міністра замежных спраў гэтай краіны Браніслава Герэмека. А ў цэнтры дзядзінца стаіць шкляны шар — мастацкі твор, падараваны горадам Вроцлавам.

У Страсбургу, як вядома, дэпутаты знаходзяцца толькі некалькі дзён у месяц, падчас пленарных пасяджэнняў. Сюды ўсякі раз прыбываюць з Брусэля вялізныя скрыні, у якіх перавозіцца ўся офісная гаспадарка дэпутатаў, якая вяртаецца пасля сесій назад у сталіцу Бельгіі, дзе знаходзяцца пастаянныя офісы еўрапейскіх выбраннікаў і ўся адміністрацыя. Такая працэдура амаль паўсюдна (іншае меркаванне, па вядомых прычынах, толькі ў французаў) лічыцца стратай часу і грошай. Раскоша існавання штаб-кватэры Еўрапарламента ў Страсбургу абыходзіцца еўрапейскім падаткаплацельшчыкам у 200 млн еўра ў год. Час ад часу дэпутатаў турбуе інфармацыя аб тэхнічным стане цудоўнага, але непрактычнага будынка ў Страсбургу. У жніўні 2008-га абваліўся дах у зале пленарных пасяджэнняў. Калі б у той час там былі дэпутаты, то гэта магло б выклікаць значныя людскія ахвяры. У апошні час дэпутатаў таксама непакоіць інфармацыя аб дрэнным супрацьпажарным стане будынка.

Пастаянныя паездкі дэпутатаў з Польшчы ў Брусэль і Страсбург і праца ў Еўрапарламенце даволі шчодра аплачваюцца. Пачынаючы з гэтага склікання, польскія дэпутаты зарабляюць нароўні з прадстаўнікамі іншых дзяржаў: 7665 еўра ў месяц. Плюс да гэтага атрымліваюць па 287 еўра сутачных за кожны дзень знаходжання ў Еўрапейскім парламенце і пакрыццё транспартных выдаткаў.

На колькасці дэпутатаў Польшча займае шостае месца ў ЕП. Колькасць мандатаў залежыць ад велічыні насельніцтва. Больш за ўсё дэпутатаў — 99 — ад Германіі, менш за ўсё — 5 — ад Мальты. У Еўрапарламенце дэпутаты засядаюць не ў нацыянальных, а ў палітычных групах. Палякі сканцэнтраваныя ў трох фракцыях: «Грамадзянская платформа» і Польская сялянская партыя — у групе хрысціянскіх дэмакратаў, Саюз левых дэмакратаў — у сацыялістычнай групе, а «Закон і справядлівасць» — у групе кансерватараў і рэфарматараў.

Разам з Бузэкам у памяшканнях яго сакратарыята зоймуць месцы паўтара дзясятка адказных супрацоўнікаў і дапаможнага персаналу. Згодна з існуючым становішчам, з кожным новым скліканнем ЕП мяняецца ўвесь склад супрацоўнікаў, уключаючы сакратарак. Ужо вядома, што ў кабінеце Бузэка акрамя палякаў будуць працаваць прадстаўнікі з Венгрыі, Румыніі, Францыі і Германіі. Бузэк, як кіраўнік ЕП, будзе старшынстваваць у двух органах. Гэта прэзідыум, у склад якога ўваходзяць 14 намеснікаў старшыні, і Канферэнцыя старшыняў, у склад якой уваходзяць кіраўнікі ўсіх фракцый парламента.

Што плануе змяніць новы старшыня ЕП? «Нам не хапае жывых дыскусій у ЕП на ўзор брытанскага парламента. Думаю, мы іх увядзём у найбліжэйшыя 2,5 года»,— заявіў Бузэк.

У распараджэнні старшыні ЕП паўтара дзясятка пакояў, у тым ліку салон для прыёму гасцей, а таксама службовы «БМВ» з вадзіцелем. Кабінет старшыні знаходзіцца на 13-м паверсе аднаго з будынкаў у Брусэлі. З яго адкрываецца цудоўная панарама, а з-за пісьмовага стала відаць усе найважнейшыя будынкі ЕС, уключаючы Еўракамісію і Савет Саюза. Кабінет мае форму літары L. Асабістых акцэнтаў няшмат, затое там ёсць элементы сучаснага мастацтва. Найбольш выразным з'яўляецца фрэска «Выкраданне Еўропы», падараваная Іспаніяй. А раз у месяц Бузэк будзе перарэзджаць у Страсбург, дзе на 16-м паверсе будынка ЕП у яго таксама ёсць цудоўны кабінет з фантастычным выглядам на горад і басейн перад будынкам.

Атрыманне прадстаўніком Польшчы пасады старшыні Еўрапарламента можа азначаць для Беларусі больш канструктыўны дыялог з Еўрасаюзам, бо менавіта Польшча пры падтрымцы Швецыі была ініцыятарам еўрапейскай праграмы «Усходняе партнёрства». Сам Ежы Бузэк у адрозненне ад Ганса Пёттэрынга, папярэдняга спікера Еўрапарламента, настроены на ўмацаванне адносінаў па лініі Мінск—Брусэль.

Падрыхтаваў Міхаіл БАЦЯН.

Жыццё сучаснага чалавека

РАМОНТ НА ЕЎРАПЕЙСКІ МАНЕР

Сёння ў наш ужытак цесна ўвайшло такое паняцце, як «еўрарамонт». Праўда, многія так дакладна і не ведаюць, што ж яно абазначае: паклеяць новыя шпалеры ды вокны пафарбуюць і ўжо лічаць, што зрабілі рамонт на еўрапейскі манер. Другія ж падыдуць да справы больш адказна: аздобяць сваё жыллё абавязковымі элементамі навамодных паняццяў — падвясная столь, падлога з падаграваннем, шклопакеты, вінілавыя ці ўспененыя шпалеры... Але наколькі такая суперсучасная прыгажосць бяспечная для здароўя? У чалавека, які жыве ў новым стагоддзі, нямала сумненняў у экалагічнасці ды няшкоднасці абыдзенных рэчаў. Асабліва гэта датычыцца рознага роду будаўнічых матэрыялаў, якія сёння, у асноўным, вырабляюцца з выкарыстаннем хімічных складнікаў. Амаль усе яны вылучаюць пэўную колькасць мікрачасцінак, мікрадозаў шкодных рэчываў. Аднак у той прадукцыі, якая прайшла сертыфікацыю, гэтае вылучэнне не перавышае гранічна дапушчальных канцэнтрацый. І тым не менш, як яна ўздзейнічае на арганізм?

Каб разабрацца ў сучасных сінтэтычных матэрыялах і іх якасці, я звярнулася па дапамогу да **загадчыка лабараторыі прамысловай таксікалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены Леаніда ПАЛАВІНКІНА.**

— Леанід Васільевіч, размову я хачу пачаць з папулярных у наш час шклопакетаў. На вашу думку, ці варта ставіць іх у сваім доме, ці бяспечныя яны для здароўя?

— Бяспечнае акно ці не — у першую чаргу залежыць ад фірмы-вытворцы. Калі вы вырашылі ставіць шклопакеты, будзе не лішнім пацікавіцца, кім яны зроблены. У наш час з'явілася нямала нядобрасумленных вытворцаў, якія для вырабу такога акна выкарыстоўваюць старыя тэхналогіі ды абсталяванне, а з іх дапамогай немагчыма дасягнуць якасці. Як вядома, шкоднымі з'яўляюцца тыя рэчывы, што незапалімерызаваліся. У няякасным акне гэтыя небяспечныя для здароўя рэчывы «ляцяць» у жыллё, прычым гэты працэс можа адбывацца дастаткова доўгі час. Таму раю абавязкова даведацца пра фірму-вытворцу, краіну, дзе была выраблена прадукцыя, пацікавіцца санітарна-гігіенічным сертыфікатам на яе.

Аднак, як паказала практыка, тыя вокны ПВХ, што сёння выкарыстоўваюцца ў памяшканнях, дастаткова бяспечныя. Праблема заключаецца вось у чым: ніхто дакладна не можа сказаць, што будзе з імі праз 10—15 гадоў з-за тых тэмпературных перападаў, якія ўласцівыя нашай краіне. Кожны палімер пад уздзеяннем вільгаці, ультрафіялетавых выпраменьванняў, хістання тэмпературы паступова вылучае вельмі таксічныя манамеры. На жаль, гэта праблема да канца не вывучана ні ў нас, ні за мяжой.

Акрамя таго, патрэбна падбіраць матэрыял у залежнасці ад месца яго выкарыстання. Скажам, у дзіцячы пакой найлепш паставіць

драўлянае акно, замест лінолеуму — выкарыстаць паркет, а вінілавыя шпалеры замяніць на звычайныя, на папяровай аснове.

На кухні, дзе ўвесь час горача ды вільготна, таксама варта падбіраць адпаведныя матэрыялы. Не раю выкарыстоўваць у гэтым памяшканні паліперныя пліты, якія з павышэннем тэмпературы пачынаюць вылучаць шкодныя рэчывы. Іх пах не заўсёды можна ўлавіць, але на здароўі гэта адаб'ецца. Асабліва небяспечныя, на маю думку, такія апрацоўчыя матэрыялы, як драўняна-стружкавыя панэлі і тыя фенолфармальдэгідныя і карбамідныя смолы, якія змяшчаюцца ў шырока вядомай ДСП. Шкоднымі для чалавека яны не з'яўляюцца толькі ў тым выпадку, калі ДСП пакрытая спецыяльным ахоўным пластам.

— Сёння на рынку вельмі шмат тавараў для рамонту самых розных фірмаў, на любы густ і кашалёк. Як не разгубіцца ў такім наплыве і выбраць сапраўды няшкодны для здароўя тавар?

— Пакупнік павінен арыентавацца не толькі на свой густ ды кашалёк, але і на свой... нос. Бывае, і яго дастаткова, каб выявіць няякасны тавар, які мае ўстойлівы пах хіміі. Такі моцны «хімічны водар» можа застацца ў кватэры надоўга, і нават праветрыванне тут не дапаможа. Таму, яшчэ раз паўтаруся, не пасаромейцеся папрасіць адпаведныя дакументы на тавар ды... панюхаць яго.

— Леанід Васільевіч, ведаю, што ваш цэнтр спецыялізуецца на ацэнцы бяспечнасці паліперных матэрыялаў. У чым заключаецца працэдура даследавання?

— Гэта цэлы комплекс работ, якія мы праводзім у акрэдытаваных лабараторыях з дапамогай спецыяльных метадык, дзе замяраем тое, што вылучаецца са шкоднага матэрыялу.

Першым этапам практычных іспытаў з'яўляецца самы просты і надзейны тэст — ацэнка інтэнсіўнасці паху. Калі ён моцны і рэзкі, гэта ўжо можа стаць падставай для адмовы ў рэгістрацыі.

Далей мы праводзім санітарна-хімічныя іспыты ўзораў. У спецыяльна абсталяваных камерах задаецца неабходная тэмпература і падаецца паветраны паток пэўнай хуткасці. У выніку — вызначаецца канцэнтрацыя хімічных рэчываў, якія вылучае матэрыял у розных рэжымах эксплуатацыі.

Трэці этап прадугледжвае вывучэнне фізічных параметраў прадукцыі, напрыклад, ці здольнасць назапашваць на сваёй паверхні электрастатычныя зарады. Ужо даказана, што павышаны ўзровень электрастатыкі вядзе да збірання на столі, сценах пылу. А гэта добрая глеба для размнаж

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

15 ліпеня 2009 г. № 25 (177)

ГОД РОДНАЙ ЗЯМЛІ

ЧАЛАВЕК ПРАХОДЗІЦЬ... ЯК ХТО?

...У тонкага знаўцы беларускага фальклору Уладзіслава Галубка ёсць невялікі па памерах твор «Як млынар спілаваў «Святую Ядвігу». Ёю, «Святою Ядвігаю», называлі вельмі старую таямнічую сасну. Яна помніла і караля Стэфана Баторыя, і вялікага князя Вітаўта, яна была сведкай нараджэння першых дзяржаў на тэрыторыі Беларусі... А потым яе загубілі. Загінула сведка гісторыі — і цяжка стала зямлі...

Цяжка стала і адной з галоўных вуліц нашага Чэрвеня. Сёлета ўвесну прысады на ёй спілавалі напалову. І цяпер гэтыя абрубкі дрэў не выклікаюць у сэрцах нічога апроч болю. Застаецца толькі ўспамінаць, як прыгожа тут усё цвіло, як напаўнялася паветра дзівосным водарам, як дараваўся цень і прахалода.

Сваёй таемнасцю і багаццем адорваў людзей і лес. Але сёння ён таксама чакае паратунку, бо жыхары райцэнтра панадзіліся вывозіць сюды бляшанкі з-пад фарбаў, іржавыя халадзільнікі, колы ад трактароў ды аўтамабіляў, слоікі...

Не разумею і таго, як можна пасля наведвання лесу пакінуць тут пустыя бутэлькі, пластыкавы посуд, паперу?!.

Іншымі словамі, чалавек, адпачываючы альбо будуючы сабе ўтульнае жытло, проста па-дзікунску губіць навакольнае асяроддзе.

Дайшло да таго, што без ягоных «скарбаў» не знойдзеш цяпер ніводнай лясной дарогі. Чым жа гэта абернецца праз гады, калі ўжо цяпер у лесе зрэдзь дзе ўбачыш пралеску, фіялку лясную, якіх дваццаць гадоў таму былі цэлыя плантацыі...

А нашы дарогі... Раён амаль дваццаць гадоў ужо мае свой асфальтавы завод, і пры гэтым у горадзе заасфальтавана толькі шэсць вуліц. Па Савецкай увесну ці пасля дажджу можна прайсці хіба ў гумовых ботах. Штогод, такое ўражанне, рамантуецца толькі адна з галоўных вуліц — вуліца Барыкіна.

Але ж зрухі ёсць: не так даўно на плошчы запрацаваў фантан... І цяпер ля яго збіраюцца мамы з немаўлятамі, падлеткі, усе жыхары...

Жыццё іх, сацыяльна-бытавыя ўмовы мяняюцца, але, на жаль, марудна. А між тым старажытны Ігумен — багаты на гістарычную і культурную спадчыну: тут нарадзілася маці Максіма Багдановіча — Марыля Мякота; тут, на гарадскіх могілках, пахаваны яго дзед; тут, у маёнтку Убель, радзіма сусветна вядомага кампазітара Станіслава Манюшкі і сусветна вядомага мастака — Хаіма Суціна. У мястэчку Смілавічы, дзе ён нарадзіўся, знаходзіцца палацавы комплекс... У вёсцы Раванічы, за 35 кіламетраў ад горада, чакае свайго аднаўлення каралеўскі маёнтак Сяхней-Слатвінскіх. Ёсць у раёне і мясціны, звязаныя з паўстаннем Кастуся Каліноўскага.

Але слаўнае ў нас не толькі мінулае. У вёсцы Ляды жыве вядомы ўжо не толькі на радзіме, але і за яе межамі майстар разьбы па дрэве Мікола Няхай; у самім Чэрвені — прафесійны жывапісец і скульптар Генадзь Матусевіч, у вёсцы Язоўкі меў надзел зямлі вядомы званар Велікапольскай царквы і дзед кампазітара Ігара Лучанка — Лукаш, тут нарадзіўся яго бацька — Міхаіл Лучанок — яркі, таленавіты чалавек, музыка, які разам з Уладзіславам Галубком сталі роданачальнікамі першага перасоўнага нацыянальнага тэатра...

Іншымі словамі, навакольная прырода, якая шчодра адарыла Ігуменскі край талентамі, — чакае сёння ўвагі і паратунку. Тады горад і раён, да якога рукой падаць са сталіцы, зможа стаць адным з галоўных цэнтраў развіцця турызму Мінскай вобласці.

Вольга НАЗАРУК.

г. Чэрвень.

НЕ МОЖАМ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫСОКІ ЗАРОБАК ВЯСКОЎЦУ,

тады забяспечым кармамі яго кароўку

Старшыня Валяўкоўскага сельскага Савета Аляксандр Парахневіч на гэтай пасадзе тры гады, а характарызуюць яго ў раённым Савеце дэпутатаў як дасведчанага кіраўніка. Гэта таму, што раней на працягу некалькіх гадоў Аляксандр Віктаравіч кіраваў адной з гаспадарак раёна, і практыка работы з людзьмі ў яго ёсць. Сёлета ён занесены на раённую Дошку гонару. Адзначылі яго за тое, што актыўна адстойвае інтарэсы простых вяскоўцаў.

На тэрыторыі Валяўкоўскага сельсавета 22 вёскі, 641 сядзіба, дзе пражываюць 1355 чалавек: сярод іх 363 пенсіянеры і 236 дзяцей. Адны вёскі — густанаселеныя, дзе пачуеш рознагалоссе дзіцячых галасоў, а ёсць і такія, дзе пераважаюць пустыя дамы, і жыве толькі адзін чалавек.

Аляксандр Віктаравіч адзін-два разы на тыдзень вядзе прыём жыхароў непасрэдна ў вёсках, аддаленых ад сельсавета. Мне давялося прысутнічаць на адным з яго прыёмаў.

Да яго спяшаліся вяскоўцы, каб пракансультавацца па розных жыццёвых пытаннях. Аднаму чамусьці ў лясгасе не выпісалі драўніны, хоць заўсёды гэта было без праблем. Другому патрэбны талоны на паліва. Старшыня абяцаў разблытаць непаразуменне з лясгасам, а талоны аформіць і прывезці на наступным тыдні.

Гэткія прыёмы выгадныя для пажылых людзей. Ім не трэба траціць цэлы дзень на паездку ў сельсавет па даведку і талоны на паліва: старшыня прыедзе на месца для вырашэння іх праблем.

Аляксандр Віктаравіч — у віры жыцця простых вяскоўцаў, якія жывуць далёка ад вялікіх гарадоў. Па паводзінах людзей з глыбінкі старшыня намагаецца прагназаваць, як будзем жыць далей. Яго трывожыць тое, што скарачаецца колькасць жыхароў на тэрыторыі сельсавета: смяротнасць пераважае над нараджальнасцю ў два і болей разы. Ён перажывае, што сёлета на тэрыторыі сельсавета не зарэгістравалася ніводнай пары маладажонаў.

Вядома, моладзь цяпер не спяшаецца ўзаконіць сям'ю. Жывуць нярэдка грамадзянскім шлюбам. Ды яно і такіх пар зусім мала. У вяскоўцаў жа без вясельнага свята ўсё менш жыццёвай энергетыкі. Аляксандр Віктаравіч разважае ўслых пры сустрэчы:

— Асфальтавалі дарогі, добраўпарадкоўвалі школы і крамы, у цэнтральных вёсках шэраг новых дамоў з выгодамі. А тая невялікая колькасць моладзі, што ёсць у вёсках, пасля заканчэння школы па-ранейшаму імкнецца ў горад. Бацькі з усіх сілаў цягнуцца ў заробках, каб забяспечыць ім вучобу. А пасля заканчэння вучобы яны застаюцца жыць і працаваць у горадзе. І не зважаюць, што ёсць у сельскай мясцовасці жыллё і месца працы, а ў горадзе цяжка знайсці дастойны заробак і жыллё дарагое. Відаць, трэба было крыху раней асфальтаваць дарогі і будаваць катэджы з выгодамі, каб затрымаць моладзь у вёсцы. А цяпер не вярнуць іх туды, дзе з кожным годам больш нежылых дамоў. Вунь як у вёсцы Русаны: дзевяць пустых дамоў і толькі ў дзясятым жыве пажылы мужчына.

Дык якое выйсце ўбачыў Аляксандр Парахневіч, каб хоць не абязлюдзелі густанаселеныя яшчэ вёскі, што павінна рабіць мясцовая ўлада і кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў?

Аляксандр Віктаравіч упэўнены, што трэба садзейнічаць матэрыяльнаму дабрабыту вяскоўцаў. Калі будзе магчымасць зарабіць грошай на дастойнае жыццё, то не пабягуць так шпарка ў горад. І калі ў большасці гаспадарак нізкі заробак, то ёсць яшчэ шанц зарабіць працай на сваім падворку, трымаючы жывёлу ці вырошчваючы агародніну на прысядзібным участку або арандаваным полі.

Далей старшыня Савета расказаў, як садзейнічаюць вяскоўцам, каб яны трымалі кароў і здавалі малако дзяржаве, кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў «Арловічы», імя Чарняхоўскага і «Прыдняпроўскі», што знаходзяцца на тэрыторыі Валяўкоўскага сельсавета.

Вёска Ляды, цэнтр СВК «Прыдняпроўскі», 220 сядзіб, і трымаюць тут 236 кароў. Раніцай выганяюць з гэтай вёскі тры вялікія статкі. Кіраўнік СВК Аляксандр Чаркасаў выдзяляе добрую пашу, на зіму забяспечвае сенам кароў сваіх працаўнікоў бясплатна (плацяць толькі за дастаўку). Падчас сенанарыхтоўкі не пакідаюць без апекі і тых, хто працуе ў школе, сельсавеце і інш. Праўда, яны плацяць за дастаўленае ў двор сена крыху больш, але цана даступная.

Аляксандр Парахневіч таксама жыве ў Лядах і трымае на падворку дзве каровы. Летась за сена, якое прывезлі ў двор, заплаціў 60 тысяч рублёў. Ён сцвярджае, што кароў трымае толькі дзякуючы такому забеспячэнню. У іншым выпадку не трымаў бы, бо нарыхтаваць кармы на зіму не мае часу. Гэтак жа скажуць многія жыхары Лядоў. Вынік эканамічнай палітыкі кіраўніка наступны.

Штодня жыхары Лядоў здаюць дзяржаве каля 2,5 тоны малака з падворкаў. Тут ёсць і стацыянарны прыёмны пункт, куды раніцай спяшаюцца людзі: хто на тачцы, хто на машыне ці веласіпедзе — вязуць малако. Тут жа аператыўна замяраюць літры і тлустасць малака. Усе паказчыкі запісваюць у асабістую кніжку малаказдатчыка па выніках кожнага дня. І грошы за малако выплачваюцца своечасова.

Не рэдкасць, калі на малацэ жыхар вёскі зарабляе столькі, колькі на дзяржаўнай рабоце. А два заробкі — гэта ўжо і на бытавую тэхніку можна адкласці, і на аўтамабіль. Не дзіўна, што Ляды сёння каціруюцца як адна з вёсак, дзе людзі жывуць заможна. А ў недалёкім мінулым яна лічылася ў Дубровенскім раёне адной з вёсак, населеных беднатой.

З забеспячэннем жывёлы на падворках кармамі на зіму аналагічная сітуацыя ў гаспадарках імя Чарняхоўскага і «Арловічы». Тут, калі ў двор не даставяць сена, то надзеляць сенакосам і скосяць. Канкралююць, каб была багата травой паша. Праўда, прыёмны пункт малака яшчэ не абсталявалі. Але ў СВК імя Чарняхоўскага малакавоз на працягу дня шнуруе па вёсках, забіраючы ў адно аддзяленне машыны малако з дзяржаўных фермаў, а ў другое — ад гаспадарскіх кароў. І трэба бачыць, як каля свойскіх кароў на пашы ў абедзенны перапынак стаіць шэраг уласных аўтамабіляў і веласіпедаў. Гаспадыні хуценька дояць сваіх рагуляў, і тут жа пад'язджае малакавоз, каб забраць сырадой.

Вось так садзейнічае мясцовая ўлада вяскоўцам на Дубровеншчыне, каб сталі яны заможнымі.

Вольга ШУТАВА.
Фота аўтара.

РЫНАК ПРАЦЫ

Добра там, дзе ёсць зарплата

Змяншэнне прапаноў на рынку працы, пераход прадпрыемстваў на няпоўны тыдзень ці вымушаныя водпускі — не сакрэт, што сёлета ўсё гэта стала адметнасцю многіх буйных гарадоў. Аднак зусім іншы малюнак назіраецца ў невялікіх рэгіёнах, дзе па-ранейшаму ці не галоўнай застаецца праблема... дэфіцыту працоўнай сілы. У прыватнасці, сёння на 55 афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных у Чавускім раёне прыпадае адразу 211 вакансій. І ці ўдасца задаволіць большасць заявак працадаўцаў — пакуль застаецца пытаннем.

Завод жалезабетонных вырабаў, масласырзавод, ільнозавод, камбінат кааператыўнай прамысловасці — назваць раённую прамысловасць «буйной» немагчыма нават пры ўсім жаданні. Зрэшты, тут ёсць і адваротны бок медаля. Невялікія прадпрыемствы хоць і не здольныя «выцягнуць» з датацый мясцовы бюджэт, але працуюць без сур'ёзных збояў — казаць аб масавых скарачэннях сёння не выпадае. А тым больш не сутыкаецца з праблемай «лішняга персаналу» і па сутнасці асноўная галіна — сельская гаспадарка.

— Як і паўсюль, мы маем крыху абмежаванае кола прапаноў для жанчын, апроч медыкаў, няшмат варыянтаў і для работнікаў бюджэтнай сферы, — распавядае **намеснік начальніка раённага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віктар САРОКІН**. — Але гэтыя праблемы даволі ўмоўныя. Пры жаданні кожны беспрацоўны практычна ў любы час можа прайсці бясплатнае прафесійнае навучанне ці перанавучанне амаль па 30 спецыяльнасцях і атрымаць сабе месца. Што ж да выбару, то ён працягвае толькі ўзрастаць — ужо з пачатку года колькасць вакансій павялічылася больш чым на 17 %.

Сёння гарадское прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі шукае інжынера-цеплатэхніка, стропальшчыка, дворнікаў; спажывецкая кааперацыя робіць заяўкі на гандляроў і вадзіцеляў; вузел электрасувязі разлічвае атрымаць вядучага інжынера і кабельшчыка; аграсэрвісу патрабуюцца слесар, інжынер-энергетык, аператар ПЭВМ, галоўны эканаміст; прыватным прадпрыемствам — электрыкі, станочнік, вальшчык лесу, вадзіцель лесавоза...

Значную колькасць вакансій «выстаўляюць» і прадпрыемствы АПК — яны запрашаюць даярак, заатэхнікаў, трактарыстаў, вадзіцеляў, электрыкаў, электрагазазваршчыкаў, аграномаў, ветурачоў. Словам, патэнцыяльнае «поле для дзейнасці» атрымліваецца самым разнастайным. Але бянтэжыць адно — прапановы па зарплаце.

Сапраўды, **у Чавусах ёсць вакансіі, «падмацаваныя» мільёнам рублёў, зрэдчас можна пачуць і сярэднюю лічбу зарплаты па раёне — каля 600 тысяч. І ўсё ж гэта, хутчэй, выключэнне. Па большасці свабодных працоўных месцаў прапануецца 300—400 тысяч.** А то і менш. І адсюль — вялікая колькасць «незакрытых» вакансій.

— У нас ёсць даволі ўдалая праграма добраахвотнага перасялення на сталае месца жыхарства і працы ў іншую мясцовасць, перш-наперш у вёскі, — адзначае Віктар Сарокін. — Усе, хто выказвае такое жаданне, забяспечваюцца жыллём, а таксама дзяржаўнай падтрымкай: служба занятасці бярэ на сябе выдаткі па перавозе маёмасці, робіць выплату «пад'ёмных» у памеры 7 бюджэтаў пражытковага мінімуму на галаву сям'і і па 1 пражытковым мінімуме — на кожнага яе члена. БПМ на сёння складае 243 тысячы рублёў, адпаведна, канчатковая сума атрымліваецца даволі адчувальнай. Аднак зразумела: змяніць звыклы асяродак наважыцца далёка не кожны. Таму колькасць тых, хто пагаджаецца на перасяленне, звычайна нязначная — 4-5 сем'яў у год.

Не вырашае праблемы і размеркаванне выпускнікоў навучальных устаноў. Яго відавочны плюс — тая ж перспектыва жылля. А відавочны мінус — зноў-такі нізкая зарплата.

— Не аднойчы даводзілася чуць: сёння жыць у вёсцы можна, — працягвае Віктар Сарокін. — Бо тут ёсць усе шанцы займець уласны дом, ёсць прысядзібныя ўчасткі, добрая, на першы погляд, праца. Але якраз з апошняй і ўзнікае асноўнае пытанне. **Часта самі маладыя спецыялісты кажуць: былі б у нас заробкі па 800 тысяч — мільёну, то лепшага і шукаць не трэба. Але ў сапраўднасці атрымліваецца ці не ўдвая менш.** Як вынік, многія проста **адпрацоўваюць свой абавязковы тэрмін** і з'язджаюць...

Выйсце? Зрэшты, у раёне перакананыя: няглядзячы на нібыта вялікую колькасць вакансій, сёння неабходна рабіць стаўку на... стварэнне новых працоўных месцаў. Але пры гэтым абавязкова — ужо з больш высокай прапановай па зарплаце, пажадана каб такая прапанова стасавалася як мінімум з сярэднім па раёне ўзроўнем. Тут могуць быць да месца ўжо традыцыйныя прадпрыемствы. Але не толькі — не менш перспектыўнымі выглядаюць «прыватныя» праекты, тыя ж фермерскія гаспадаркі, прадпрыемствы па вырошчванні саджанцаў пладовых, ягадных культур і кветак, вытворчасць панэляў для платоў, пенабетонных блокаў. Пакуль гэтыя «нішы» амаль свабодныя, а значыць, тут ёсць магчымасць зарабіць.

Сёння ў Чавусах ёсць вакансіі, «падмацаваныя» мільёнам рублёў, зрэдчас можна пачуць і сярэднюю лічбу зарплаты па раёне — каля 600 тысяч. І ўсё ж гэта, хутчэй, выключэнне. Па большасці свабодных працоўных месцаў прапануецца 300—400 тысяч. А то і менш.

— Апошнім часам шмат кажуць пра згортванне рынку, пра тое, што няма сэнсу шукаць штосьці новае — маўляў, у першую чаргу важна захаваць тое, што ёсць, — зазначае Віктар Сарокін. — Аднак, па-першае, такі падыход вельмі рызыкоўны — на выпадак скарачэнняў заўсёды трэба мець своеасаблівую «падушку бяспекі». А, па-другое, неабходна імкнуцца ў рэшце рэшт вырашыць праблему недахопу працоўнай сілы, і ў тым ліку — за кошт беларускіх «гастарбайтараў» у Расіі. Паводле некаторых ацэнак, на заробкі ў суседнюю краіну паехалі 500—600 нашых жыхароў, прычым многія з тых жа будаўнікоў, у сувязі з сусветным крызісам, ужо пачалі вяртацца. Мяркуючы па ўсім, гэта тэндэнцыя працягнецца і надалей. Але адказ на пытанне, ці застануцца былыя «гастарбайтары» ў раёне або пададуцца транзітам у блізкі па адлегласці Магілёў і ці стануць затрымлівацца маладыя спецыялісты, залежыць толькі ад аднаго — дастатковай колькасці па-сапраўднаму прывабных па аплаце вакансій.

Сяргей ГРЫБ.

Чавускі раён.

У МЯДЗЕЛЬСКАЙ «САНТА-БАРБАРЫ»

Аграсядзібу Аляксандра Галяка ведаюць не толькі на Мядзельшчыне. Сюды, акрамя беларусаў, прыязджаюць адпачыць і расіяне, і прыбалты. Сваю цікавую назву сядзіба атрымала з лёгкай рукі мясцовых жыхароў: аконныя праёмы формай вельмі нагадваюць застаўку сусветна вядомага і надзвычай папулярнага ў нас на пачатку 90-х амерыканскага серыяла «Санта-Барбара». Так назва і прыжылася.

ГАСЦЯВАЎ САМ СЯРГЕЙ БЯЗРУКАЎ

Знаёмства з «Санта-Барбарай» пачынаецца з яе агароджы, якая заслугоўвае самага падрабязнага аповеду. У каменную кладку па ўсім перыметры ўмацаваны разнастайныя прадметы побыту дасавецкага, савецкага і постсавецкага перыядаў. Тут можна ўбачыць і старадаўнюю нямецкую швейную машынку, і сапраўдныя каменныя жорны, і прас, які працаваў на вуглях.

— Усе зараз імкнуцца рабіць «даўніну», ствараць музеі, — расказвае Аляксандр Антонавіч пра развіццё беларускага аграэкатурызму. — У мяне таксама музей — усё, што тут сабрана, звязана з маім жыццём. Мне 51 год. Усе прадметы, якія сталі часткай дэкору ўнутры дваровай тэрыторыі, маюць непасрэднае дачыненне да маёй сям'і, з кожным звязана нейкая гісторыя. Напрыклад, швейную машынку «Singer» калісьці мая бабуля падарыла маёй жонцы. Жорны былі прывезены з вёскі, дзе я нарадзіўся. Настольны гадзіннік застаўся ўспамінам аб этапе майго жыцця, калі я займаўся гандлем (прадаваў розныя рэчы, у тым ліку і кітайскія гадзіннікі). Прас на вуглях застаўся ў спадчыну ад бабулі.

Часткай агароджы стала і надзейна ўмураванае 500-кілаграмовае металічнае кола, прывезенае, паводле слоў гаспадара, з самога Кёльна. Некалі яно было ўсталявана на піларме, а ў 90-х гадах трапіла на Мядзельшчыну, дзе нямецкі прадпрымальнік збіраўся арганізаваць адпаведную вытворчасць. Праўда, піларму тут так і не пабудавалі (нерэнтабельна было), а велічэзнае кола трапіла да Аляксандра Антонавіча і цяпер замест вытворчай выконвае эстэтычную функцыю.

— Кладку агароджы мы ў асноўным рабілі самі, — патлумачыў гаспадар, — мой бацька яе некалі вылажыў, а я пазней рэканструяваў, узняў вышэй, стылізаваў, аздобіў рознымі прадметамі.

Дзе-нідзе па перыметры агароджы трапляюцца шкляныя каляровыя бутэлькі, выкладзеныя па крузе такім чынам, каб былі бачны толькі донцы. Яны гарманічна ўпісаліся ў фактуру каменнай кладкі. «За кошт гэтай шкляной прасторы агароджа візуальна становіцца «лягчэйшай», — патлумачыў сваю ідэю Аляксандр Антонавіч.

Цікава, што на роўных з прадметамі побыту элементамі дызайну агароджы сталі і сапраўдныя транспартныя сродкі — матацыкл «ІЖ-56» і старэнькая «Волга» шыкоўнага руковага колеру.

— Матацыкл раней належаў майму цесцю, — расказвае гісторыю сваёй калекцыі гаспадар. — Ён служыў у Маскве, у будаўнічым батальёне, зарабіў нейкія грошы і купіў там «ІЖ-56». На гэтым « Іжы» ён і вярнуўся з арміі ў 58-м. Цесць на той час лічыўся самым багатым кавалерам. З яго матацыклам звязана гісторыя ледзь не ўсёй вёскі. Адзін ездзіў на ім на спатканні, другі — на хрысціны. Матацыкл яшчэ быў на хаду, калі я зацэментаваў яго ў сцяну.

Руковая «Волга» 1966 года выпуску даталася Аляксандру Галяку ад сваякоў. «Мой далёкі родзіч прыехаў на ёй з Эстоніі пасля развалу Саюза. Там ён працаваў шахцёрам і купіў гэтую «Волгу» ў дырэктара шахты. У ружовы колер я пафарбаваў яе сам. Мяркую зрабіць з яе альтанку, дзе можна пасядзець, адпачыць, адчуць атмасферу таго часу, выпіць кубачак чаю».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЯК НАКОНТ ТАГО, КАБ ПАМЫЦЦА?

У вёсцы з прыгожай назвай Калінаўка, што ў Дубровенскім раёне, пражывае 315 чалавек. Гэта цэнтральная сядзіба СВК імя Чарняхоўскага, якая летась была добраўпарадкаваная і набыла статус аграгарадка. Тут асфальтаваныя дарогі і ўвесь набор аб'ектаў сацкультбыту: школа, Дом культуры, крамы, ФАП. Захавалася і грамадская лазня — дарэчы, адна з нямногіх у сельскай мясцовасці. Таму гэткі рэдкі аб'ект і прыцягнуў маю ўвагу.

Лазня раней належала мясцоваму сельгаспрадпрыемству. Але паколькі яна не акуплялася, а патрабавала год ад году ўсё большых выдаткаў, то была перададзена на баланс Дубровенскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Летась, калі ўзводзілі аграгарадок, капітальна адрамантавалі і лазню. Цяпер і знешне, і ўнутры гэты аб'ект выглядае прыгожа.

Сёлета лазню выпальваюць адзін раз у два тыдні — па суботах. Звычайна ў «памыечную» суботу прыходзяць сюды каля 30 чалавек. У лазні адна зала і парылка. Мыюцца людзі ў дзве змены: адразу жанчыны, потым мужчыны.

Абслугоўвае лазню адзін чалавек — Сяргей Кароль. Ён дрывасек, пальшчык і касір — усё ў адной асобе.

Вяскоўцы, з якімі вяла размову, выказваліся за тое, каб лазня працавала кожную суботу. Напрыклад, мясцовы механізатар абгрунтаваў сваё пажаданне так:

— Большасць мужчын, што працуюць з тэхнікай ад пасяўной да ўборачнай, маюць патрэбу памыцца пасля цяжкай працы. Душавых на мехдвары няма. А свая лазня, калі і ёсць каля дома, то выпаліць яе вечарам пасля працоўнага дня сілы не хапае.

Вялікае значэнне гэты аб'ект мае для адзінокіх пажылых людзей, у якіх няма асабістай лазні. А на погляд загадчыцы Калінаўскага ФАПа Святланы Касаржэўскай, наяўнасць лазні садзейнічае павышэнню агульнай культуры вяскоўцаў. Калі ёсць у іх патрэбнасць часцей памыцца, то яны і апранаюцца чысцей, і ў доме, на падворку больш актыўна сочаць за парадкам.

Дарэчы, у Калінаўцы загадчыцы ФАПа як маладому спецыялісту выдзелілі пад жыллё катэдж. Пасля чаго, два гады адпрацаваўшы па размеркаванні, яна вырашыла застацца тут.

Старэйшына вёскі (яна ж — дырэктар мясцовай школы) Галіна Марчанка расказала, што ў калі ёсць старыя? А ён не зважаў на заўвагі. Ля новых дамоў да таго ж яшчэ і ўмовы стварылі, каб сем'і трымалі на падворку жывёлу і тым самым падтрымлівалі сябе матэрыяльна.

Кіраўнік не памыліўся: у бацькоў тых дзяцей з'явілася жаданне прыгожа абставіць пакоі новай мэбляй, купіць новую вопратку сабе і дзецям. Вядома, разам з кіраўніком гаспадаркі ў гэтым напрамку працавалі старшыня сельскага Савета, дырэктар школы і кіраўнік Дома культуры...

Так што людзей «лечыць» не толькі «бізун», але і «пернік». А жывучы ў чысціні, і сам будзеш цягнуцца да прыгожага.

А як жа з лазнямі ў Дубровенскім раёне наогул?

Галоўны інжынер прадпрыемства «Жыллёва-камунальная гаспадарка» Таццяна ПАЛТАРАК паведаміла, што на балансе ў іх знаходзяцца ўсяго тры лазні: у раённым горадзе Дуброўна, пасёлку Асінторф і вёсцы Калінаўка. Усе яны стратныя і негатыўна ўплываюць на эканамічнае становішча ЖКГ. Сабекошт аднаго месца — 24 тысячы рублёў, аплачваецца ж толькі тры тысячы. Адпаведна 21 тысяча рублёў — гэта страты для прадпрыемства. Тым не менш, раённыя ўлады і камунальнікі разумеюць, што лазні трэба ўтрымліваць. Таму летась з раённага бюджэту была выдзелена датацыя на гэтыя паслугі, але толькі на мінулы год. Сёлета ў сувязі з крызісам у райвыканкаме не змаглі знайсці сродкі, каб падтрымаць гэты від паслуг у вёсках. Як пойдзе працэс далей, жыццё пакажа.

Вольга ШУТАВА.

У Беларусі пачаўся сумесны праект Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». З яго каардынатарам Алегам БЯЛЯЧЫЦАМ гутарыць наш карэспандэнт.

ЗАМУЛЕНЫМ ВОКАМ ДАЛЁКА НЕ ЎБАЧЫШ

— Зразумела, чаму ААН надае вялікае значэнне развіццю мясцовага самакіравання, правядзенню падобных праектаў у краінах з пераходнай эканомікай, у СНД, у прыватнасці. А якая цікавасць у Еўрапейскага саюза да нашых мясцовых праблем? Няўжо там сваіх праблем мала?

— Сапраўды, Праграма развіцця ААН надае вялікае значэнне развіццю мясцовага самакіравання. Дарэчы, у Дэкларацыі правоў чалавека ўтрымліваюцца палажэнні аб праве на ўдзел у кіраванні дзяржавай, праве асобы на самавызначэнне і г.д. Менавіта ўдзел чалавека ў самакіраванні пэўнымі тэрыторыямі, няхай самымі дробнымі, дазваляе яму лепш і глыбей раскрыцца як асобе, яе творчаму патэнцыялу, зрабіць нешта карыснае для сябе, сваёй сям'і, малой радзімы, суайчыннікаў і будучых пакаленняў.

Што датычыцца інтарэсу Еўрапейскага саюза ў рэалізацыі праекта менавіта ў Беларусі, то гэта пытанне мне задаюць часта. Людзей цікавіць, з якой нагоды ЕС фінансуе праекты на тэрыторыі краіны, якая не ўваходзіць у Еўрасаюз. Тады я задаю сустрэчнае пытанне: «А вы хочаце, каб у вас былі добрыя суседзі па лесвічнай пляцоўцы?» Пытанне рытарычнае. Так і Еўрасаюз, як наш непасрэдны сусед, зацікаўлены ў тым, каб краіны, якія мяжуюць з ім, развіваліся паспяхова, прадказальна, дэмакратычна, каб там не было ваенных, этнічных, рэлігійных канфліктаў, экалагічных праблем. І гэта зразумела, бо «агульнаеўрапейскі дом» не можа быць паспяховым без парадку ў яго асобных «кватэрах». Адсюль маральнае і фінансавае садзейнічанне Еўрасаюза ў развіцці самакіравання ў Беларусі.

У Еўрасаюзе, зразумела, праблем больш чым дастаткова, але каб іх не станавілася яшчэ больш, у Бруселі за лепшае лічаць праводзіць палітыку добрасуседства. А таму ён выдаткоўвае пэўныя сродкі на правядзенне такіх праектаў, як наш.

— І нам ёсць чаму павучыцца ў Еўропы, напрыклад, у тым, як лепш наладзіць працэс самакіравання?

— Так. У еўрапейскіх краінах насельніцтва прымае даволі актыўны ўдзел у вырашэнні мясцовых гаспадарчых праблем. Гэта абумоўлена тым, што там рэальным самакіраваннем пачалі займацца значна раней і па асобных кірунках прасунуліся даволі далёка наперад. Важным элементам мясцовай улады, напрыклад, у Чэхіі, з'яўляецца, з аднаго боку, строгая падсправаздачнасць кіраўнікоў муніцыпалітэтаў, мэрый сваім выбаршчыкам, а з іншага — пастаянны кантроль за дзейнасцю выбранай улады. Такое спалучэнне дае неблагія вынікі. Лайдаку і абібоку, які выпадкова трапіў у крэсла мэра, мала перспектыў быць перавыбраным на другі тэрмін. Дарэчы, даволі часта ў Еўрасаюзе мясцовыя выбарчыя пасады не аплачваюцца, гэта пытанне прэстыжу. Нам, зразумела, да гэтага яшчэ далёка. Хоць і ў еўрапейскіх краінах не ўсё добра і гладка, таму выбіраць з іх вопыту трэба самае станоўчае і асцярожна адаптаваць да нашых умоў. Але ў цэлым у Еўропе варта павучыцца эфектыўнаму вядзенню спраў.

— Ну тады яшчэ некалькі слоў аб мэтах і задачах праекта.

— Праект разлічаны на два гады. Яго асноўная мэта — дапамога беларускім рэгіёнам у падрыхтоўцы і рэалізацыі Мясцовых стратэгій устойлівага развіцця, садзейнічанне ў пошуку шляхоў вырашэння мясцовых праблем уласнымі сіламі. Хочацца спадзявацца, што ўдзельнікі праекта за гэты тэрмін навучацца аб'ядноўваць свае і знешнія рэсурсы для рэалізацыі рэгіянальных ініцыятыў і праграм. А гэта не зусім простая справа.

Мерапрыемствы праекта таксама прадугледжваюць адкрыццё інфармацыйных цэнтраў у рэгіёнах, выпуск метадычных публікацый, правядзенне інфармацыйна-навучальных семінараў, плануюцца нават замежныя паездкі для знаёмства з практыкай іншых краін у сферы мясцовага самакіравання.

— Як вынікае з назвы праекта, ён у асноўным скіраваны на ўзаемадзеянне з мясцовай уладай. Чаго ёй не хапае, каб адэкватна скажам, рэагаваць на сваім узроўні на наступствы крызісу?

— На мой погляд, нестае ўмення своечасова ўбачыць і выкарыстаць тыя рэзервы і магчымасці, якія ёсць амаль у кожным горадзе, пасёлку, вёсцы. З-за паўсядзённых шматлікіх бягучых спраў у выканкамаў не даходзяць рукі да іх выкарыстання. Ёсць такое паняцце: замуленае вока — калі ты быццам бы ўсё бачыш, але не заўважаеш, што побач. У нашым выпадку гэта рэсурсы для далейшага развіцця. Скажыце, ці ўсе старшыні сельскіх саветаў імкнуцца задзейнічаць такі важны рэсурс, як творчасць мясцовага насельніцтва, яго здольнасць бачыць мясцовыя праблемы і прапаноўваць шляхі іх вырашэння? Напрыклад, тых людзей, якія хочуць і могуць зрабіць нешта добрае. Ці возьмем патэнцыял грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Ён мясцовай уладай, на жаль, зусім не выкарыстоўваецца ці выкарыстоўваецца вельмі нязначна, эпізадычна, ад выпадку да выпадку. Станоўчыя прыклады можна па пальцах пералічыць.

— І што, на ваш погляд, у цэлым перашкаджае мясцовай уладзе эфектыўна выкарыстоўваць яе паўнамоцтвы для абуджэння ініцыятывы насельніцтва?

— Псіхалогія ўтрыманства, якая яшчэ моцна сядзіць у нашых галовах. Падчас падрыхтоўкі праекта мы праехалі амаль усю Беларусь. І ведаеце, даволі рэдка сустрэлі ў прадстаўнікоў мясцовай улады сучаснае разуменне і зацікаўленае стаўленне да плённай работы з грамадскасцю. А з яе ўдзелам і дапамогай можна вырашаць пэўныя надзённыя праблемы. Калі-нікалі мы чулі здзіўленне ад нашых суразмоўцаў у кабінетах выканкамаў на прапанову падключыцца да праекта. Маўляў, а навошта нам гэта трэба? У адным з невялікіх гарадоў старшыня выканкама шчыра выказаў характэрную для многіх яго калег думку: усё залежыць ад нашага гарадастваральнага прадпрыемства. Атрымае яно буйны дзяржаўны заказ — будуць там добра справы ісці, значыць, будзе і наш горад няблага жыць. Абанкруціцца завод — цяжка прыйдзецца і яго жыхарам. Ведаеце, вельмі зручная пазіцыя для тых мясцовых кіраўнікоў, якія не хочуць, як кажуць у народзе, варушыцца, рабіць нейкія захады па змякчэнні наступстваў крызісу на тэрыторыі Савета, шукаць і ўкараняць новае, рызыкаваць, нарэшце. Ведаюць: дзяржава не кіне на волю лёсу гарадастваральнае прадпрыемства, ад якога залежыць дабрабыт жыхароў горада. Трэба толькі пачакаць.

— І вы ўпэўнены ў тым, што рэалізацыя праекта дазволіць абудзіць у правільным кірунку энергію насельніцтва? Якім чынам? Бо нярэдка ажыццяўленне на 100 працэнтаў карыснай ідэі тармозіцца з-за элементарнай адсутнасці невялікай сумы грошай.

— Ну, вядома, адным праектам, нават вельмі паспяховым, пераламаць псіхалогію ўтрыманства часткі мясцовых кадраў, якая складвалася дзесяцігоддзямі, яшчэ ў савецкія часы — гэта з галіны фантастыкі. А вось хоць бы трохі зварухнуць мысленне людзей, у тым ліку і ў кабінетах мясцовай улады, дапамагчы ім адчуць, што рэальная справа ім па сілах — у межах яе дасягальнасці. Таму пад асобныя ідэі мясцовага насельніцтва некаторых раёнаў будуць выдаткаваны гранты памерам ад трох да васьмі тысяч долараў ЗША. Бо, сапраўды, у нашым жыцці так бывае, што для развіцця карыснай ініцыятыўнай справы мясцовага маштабу не хапае нязначнай сумы грошай. Мы іх на канкурснай аснове прадаставім. Бо ў мясцовых бюджэтах усе фінансавыя рэсурсы, як правіла, ідуць на патрэбы аператыўнага характару: адрамантаваць водаправод, дах, плот, аднавіць дарожнае пакрыццё і г. д. І выдаткоўваць грошы са сціплага мясцовага бюджэту на нешта новае, нязведанае, якое яшчэ невядома ці прынясе плён — вялікая рызыка для старшыні сельсавета.

— А якая, на ваш погляд, справа была б карыснай?

— Ды кожная справа карысная, нават у межах адной вясковай вуліцы. Карысным можа быць і выкарыстанне альтэрнатыўных крыніц паліва, арганізацыя прыдарожнага сэрвісу, той жа аграрны турызм і шмат што іншае. Адно з уражанняў ад паездак па Беларусі: амаль паўсюдна ў вёсках і пасёлках усталёўваюцца аднолькавыя нятанныя бетонныя агароджы. Розныя па якасці вырабу і афарбоўцы, яны не заўсёды ўпрыгожваюць вуліцы, часам псуюць яе знешні выгляд. Бо, як мне здаецца, беларуская вёсачка ці пасёлак страчваюць сваю аўтэнтычнасць. Няўжо нельга абысціся без гэтых стандартных бетонных блокаў пліт, а вярнуцца да традыцый бацькоў, скажам, зрабіць плот з прутоў хмызняку ці іншага недарагога падручнага матэрыялу? Каб вёска выглядала па беларуску. Асабліва гэта датычыцца аграсядзіб, дзе турыстам важна адчуць нашу аўтэнтычнасць. Гэта менавіта тая праблема, якую мясцовае насельніцтва здольнае вырашаць самастойна і без прыцягнення значных фінансавых сродкаў. Але паўтаруся: мы гатовыя прафінансаваць асобныя прапановы з месцаў з тым, каб яны сталі прыкладам для іншых.

— У якой стадыі рэалізацыі зараз знаходзіцца праект?

— Днямі завяршыўся разгляд заявак з месцаў. Перад гэтым мы ў раёнах для прадстаўнікоў мясцовых уладаў правялі шэраг семінараў, на якіх пастараліся даходліва растлумачыць мэты праекта. У Гомелі прайшоў ужо пяты з серыі гэтых шасці «азнаямленчых» семінараў у рэгіёнах Беларусі. Раней аналагічныя сустрэчы былі праведзены ў Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. У Гомелі разам з прадстаўнікамі мясцовай улады абласнога і раённага ўзроўняў і грамадскіх арганізацый мы абмеркавалі парадак адбору перспектыўных «пілотных» рэгіёнаў. Тыя, хто патрапіць у наш спіс, могуць разлічваць і на фінансавую падтрымку. Яе атрымаюць не менш за 24 тэрыторыі, мы ім дапаможам у распрацоўцы Мясцовых стратэгій развіцця. Ці, інакш кажучы, вызначыць на перспектыву найбліжэйшага дзесяцігоддзя кірункі і прынцыпы дзейнасці, па якіх будуць развівацца вёска, пасёлак, малы горад. Далей рэалізацыя праекта будзе засяроджана ў так званых «пілотных» рэгіёнах.

— Якімі павінны быць Мясцовыя стратэгіі ўстойлівага развіцця асобных невялікіх тэрыторый, бо ў кожнай свая спецыфіка і свае магчымасці?

— Мясцовыя стратэгіі ўстойлівага развіцця ці, як іх яшчэ называюць, Мясцовыя парадкі дня-21, — гэта кансалідаваны погляд на тое, якой улады і насельніцтва хочуць бачыць будучыню сваёй малой радзімы. У адрозненне ад стратэгій сацыяльна-эканамічнага развіцця, што прымаюцца ўладамі, тут ёсць важны элемент непасрэднага ўдзелу насельніцтва, бізнэс-колаў, грамадскіх і рэлігійных аб'яднанняў у яе распрацоўцы і выкананні. Можна сказаць, што ўлада разам з грамадствам вырашае будучыню тэрыторыі, а грамадства, у сваю чаргу, прымае ад улады частку адказнасці за рэалізацыю стратэгіі і, як вынік, за развіццё тэрыторыі.

Прычым вельмі важным момантам з'яўляецца тое, што значнае месца ў Мясцовай стратэгіі займае экалагічны напрамак. Ніякія дзеянні не павінны рабіцца за кошт нанясення шкоды прыродзе і будучым пакаленням.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

КАЛІ ПЕСНЯ ПЯЕЦЦА, ЗНАЧЫЦЬ, ДОБРА ЖЫВЕЦЦА

І тчэ, забыўшыся, рука...

— Наш край багаты на таленты, — з гонарам расказвае старшыня Дуброўскага сельскага Савета Марыя Чычко. — У Дуброве, напрыклад, жыве знакаміты бондар Іван Макаравіч Ляхавец, творы якога неаднаразова дэманстраваліся на розных выставах. А Алена Міронаўна Карась з Данілевічаў і вышываннем займаецца, і ткацтвам. Традыцыі, што бяруць вытокі з даўніны, у раёне, як відаць, не згасаюць. Іх падтрымлівае і маладое пакаленне. Сёстры Алена і Галіна Буцько зарэкамендавалі сябе з самага лепшага боку, выконваючы народныя і эстрадныя песні. Ансамбль «Вясёлыя рабяты» нашага сельскага Дома культуры выступае ў многіх вёсках раёна, а вучань Дуброўскай школы Коля Ляхавец стаў пераможцам абласнога конкурсу аўтарскай песні. Сельсавет, чым можа, дапамагае ўсім мясцовым талентам. Ёсць у нас і дзве вельмі адметныя бабулі...

Іх я прыкмеціў і запомніў яшчэ ў 2007 годзе, калі ў Рэчыцы праходзіў рэспубліканскі фестываль «Дажынкі». У адведзеным месцы на вуліцы (надвор'е было ў той дзень выдатнае) сядзелі дзве бабулі і, не звяртаючы ні на кога ўвагі, старанна рабілі сваю справу. Адна з іх ткала на кроснах, другая ж ладзіла кудзелю. Людзі спыняліся каля жанчын і з цікаўнасцю сачылі за тым, як лёгка і суладна лётаюць іх рукі. Тут жа былі развешаныя ручнікі, навалачкі, прасціны, накідкі на падушкі, пакрывалы, па якіх вадзілі карагоды валошкі і ружы. Прыгажосць якая!

Знаёмлюся. Настасся Уладзіміраўна і Ганна Сямёнаўна Астаповічы. Адна 1931-га, другая 1934 года нараджэння. З вёскі Дуброва Лельчыцкага раёна. Напэўна, стрыечныя сёстры, сваячкі? Ды не. Аднавяскоўкі, сяброўкі. Захапленні ў абедзвюх аднолькавыя: ткацтва, вышыванне, песні. Розніца толькі ў адным была. Уладзіміраўна нарадзіла траіх дзяцей, а Сямёнаўна — адзінаццаць. У яе ўжо 28 унукаў і 14 праўнукаў. Супакоіцца б нам, смяюцца абедзве, дык не ж, яшчэ і ў хоры спяваем, і за кросны, каб паказаць майстар-клас, сядаем. І тут жа ўздыхаюць: а ўсё адно, няма таго, што раней было...

І вось мы ў Дуброве. Пабылі і ў іх дома, і ў сельскім Доме культуры, куды Настасся Уладзіміраўна перадала свае кросны і дзе загадчыца Вольга Аляксееўна Астаповіч (таксама) пранікнёна расказвала пра іх.

Уявіце сабе, гаварыла яна, які талент у гэтых жанчынак, якіх усе ў вёсцы паважаюць. Настасся Уладзіміраўна з маленства спявала народныя песні і скакала так, што яе хацелі забраць у Мінск, «у артысты», ды маці не пусціла, бо ў сям'і яна была старэйшая і без яе падмогі ў сялянскай гаспадарцы цяжка было б абысціся. Таму што Марыя Апанасаўна разышлася са сваім мужам з-за таго, што той уступіў у калгас, і адна выхоўвала дзяцей. Да вайны Насця закончыла толькі тры класы і больш не вучылася. Тым не менш за ёй зноў прыязджалі з Мінска, ды маці зноў дала адмову, бо лічыла, што вясковай дзяўчыне трэба не ў артысты ісці, а ў хлебаробы.

Так яно і атрымалася потым. Праца ў калгасе, сям'я, штодзённыя клопаты. Але нішто не магло спыніць яе захаплення песнямі. Спачатку яны гучалі проста так, калі яна збірала гурт дзяўчат ці жанок, а потым, калі ў 1975 годзе ўтварыўся ў Дуброве фальклорны ансамбль, які назвалі, дарэчы, «Анастасія», дык там яна спявала для ўсіх, як кажуць, першым голасам, а другім — Ганна Сямёнаўна. Як выказалася Вольга Аляксееўна, яны ўдзвюх «выцягвалі» ўвесь ансамбль, бо і салістамі выступалі, і дуэтам, і ў хоры, ды Сямёнаўна яшчэ па-майстэрску вершы са сцэны чытала.

Дзе толькі не апладзіравалі фальклорнаму калектыву з Дубровы! І ў Мазыры, і ў Гомелі, і ў Мінску, і ў іншых гарадах. Нягледзячы на тое, што абедзве Астаповічы і гаспадарку вялі асабістую, і ў калгасе працавалі (дарэчы, Сямёнаўна даяркай была), ніводнай рэпетыцыі яны не прапусцілі, ды і зараз яшчэ не абмінаюць хор. Больш за тое, калі адбываюцца ў вёсцы пракладка першай баразны ў час веснавой сядзібы, зажынкі ці дажынкі, або касавіца, звяртаюцца да Настассі Уладзіміраўны і Ганны Сямёнаўны. Бо ведаюць: без іх удзелу і свята не свята. Яны так народны абрад правядуць, што людзі доўга яго памятаць будуць, за працу шчыра возьмуцца.

Калі песня пяецца, значыць, добра жывецца, кажуць Астаповічы, якія, апроч усяго іншага, з'яўляюцца адмысловымі майстрыхамі. У хаце Уладзіміраўны нібы сапраўдны музей ткацтва і рукадзелля, столькі ў яе вышыванак, пакрывалаў, сурвэтак, падузорнікаў, укладанак, падушачак і Бог ведае чаго яшчэ. Ды гэта не ўсё, кажа яна і дастае з шафы іншыя рэчы, выраблены яе працавітымі рукамі. Глядзіш на ўсё гэтае харство і думаеш: колькі цярпення і ўмення трэба было мець, каб злучаць нітку з ніткай, умела перадаваць і спалучаць усе адценні колераў на тых вырабах, дакладна падбіраць патрэбную каляровую гаму.

— Здаралася, што на адну вышыванку ў мяне ішло два тыдні, — расказвае Настасся Уладзіміраўна. — Я і ткала, і абшывала ўсю сям'ю, чаму навучылася ў сваёй маці. Сястра Люба, на дзесяць гадоў маладзейшая за мяне, таксама ткаць умела. А вось дачка Вольга, якая ў Гомелі жыве, толькі вязаць можа.

Кросны былі і ў бацькоў Ганны Сямёнаўны, і яна таксама вучылася ткацкай справе ў сваёй маці. І калі яна перавагу ў вышыванні аддае крыжыку, дык Настасся Уладзіміраўна — гладзі. Але ў абедзвюх атрымліваюцца рэчы што трэба. Дарэчы, увесь свой артыстычны гардэроб яны аздобілі вышываннем. Больш таго, вышылі сарочкі і для моладзевага ансамбля «Вясёлыя рабяты».

У Ганны Сямёнаўны прадметаў ткацтва і рукадзелля дома таксама многа, але менш, чым у Настассі Уладзіміраўны. Толькі адных падушак яна аддала сваім сынам і дочкам ажно дваццаць пяць. А колькі яны з Настассяй Уладзіміраўнай падарылі тых вышыванак знаёмым і родзічам і ганарацца, што плён іх працы ўпрыгожвае жыллё дарагіх ім людзей.

Абедзве бабулі — сапраўдныя хадзячыя энцыклапедыі фальклору. Яны ведаюць сотні песень, прыпевак, і адну з іх Ганна Сямёнаўна праспявала нам. І скажу: голас адчуваўся!

Жывуць яны асобна ад сваіх замужніх ужо ды жанатых дзяцей, трымаюць такую-сякую гаспадарку, у меру сваіх сілаў апрацоўваюць зямлю. У Сямёнаўны, напрыклад, ёсць кабанчык, восем курэй, трыццаць сотак зямлі, атрымлівае звыш 430 тысяч рублёў пенсіі. Жыць, як гаворыцца, можна. Прыблізна тое ж самае і ў Настассі Уладзіміраўны. Але калі яны прыходзяць у Дом культуры ў свой ансамбль, калі іх запрашаюць правесці спрадвечныя абрады касавіцы ці зажынак, на душы ў жанчын становіцца яшчэ святлей: яны запатрабаваныя. А гэта — шчасце...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.
Фота Адама ЖОГЛЫ.

У МЯДЗЕЛЬСКАЙ «САНТА-БАРБАРЫ» ГАСЦЯВАЎ САМ СЯРГЕЙ БЯЗРУКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У глыбіні двара можна пабачыць драўляныя скульптуры. «Было натхненне — нешта рэзаў сам (напрыклад, вунь тую саву), — кажа гаспадар, — а чалавечыя фігуры (мужчыну і жанчыну) па маёй просьбе выразаў адзін наш мясцовы майстар». Побач лавачка. Можна пасядзець, адпачыць у цяньку. Тут жа — фантан са скульптурай пузатай жабы і з жывымі рыбкамі. Між іншым, гэта першы фантан, які з'явіўся ў вёсцы Нарач. Гаспадар лічыць яго своеасаблівым «прарывам» у мясцовым ландшафтным дызайне: «Ніхто раней і не думаў, каб на прысядзібнай тэрыторыі разбіваць фантан. Звычайна ва ўсіх градкі-агародзікі былі», — усміхаецца Аляксандр Галяк.

Аграсядзіба «Санта-Барбара» — гэта прасторны двухпавярховы будынак, які знешне нагадвае ці то казачны замак, ці то фазэнду якога-небудзь дона Ліонсіа, ці то загарадную вілу Мэйсана з незабыўнага серыяла.

— На першым паверсе жывём мы з жонкай, — працягвае экскурсію гаспадар. — Абедзве дачкі ўжо выраслі (цяпер адна вучыцца ў інстытуце, другая выйшла замуж і жыве пад Мінскам).

Другі паверх, дзе размешчаны чатыры пакоі, прызначаны для гасцей. Без цеснаты, «у камфортным рэжыме», як вызначыў сам гаспадар, ён адначасова можа прыняць у сябе з начоўкай 12 чалавек. «А калі праездам, толькі пад'есці, дык магу і 20 чалавек пасадзіць. Месца хопіць». Можна ў Галяка і вяселле сыграць. Толькі на начлег усіх гасцей размясціць не атрымаецца, але гэтага, як правіла, і не патрабуецца.

На першым паверсе ёсць утульная камінная зала з асобным уваходам (каб госці адчувалі сябе больш свабодна), прасторная банкетная зала. Уся мэбля — драўляная (ручной работы!), як і стол, і падлога, і сцены, аздобленыя драўлянай вагонкай. (Уяўляеце, які тут цудоўны пах дрэва?!) «Мэблю рабіў мой бацька, ён сталяр, — тлумачыць Аляксандр Антонавіч, — а планачкі я сам лобзікам рэзаў, накладаў «лускў слой за слоем. Было натхненне, сёння, мо ўжо і не ўзяўся б...» Калі ёсць ахвота, госці «Санта-Барбары» могуць паглядзець тэлевізар, паспяваць караоке, папарыцца ў лазні.

Ва ўнутраным дворыку (якраз паміж двума флігелямі) размясцілася сапраўдная аранжарэя пад адкрытым небам: буйныя кветкі велічынёй з невялікія дрэвы нагадваюць джунглі ў мініяцюры. На невялічкай плошчы ўтварыўся штучны трапічны лес. «Гэта мая жонка вырошчвае, — пракаментаваў гаспадар. — Кветкам тут падабаецца».

І, між іншым, не толькі кветкам. Недахопу ў кліентах у «Санта-Барбары» няма. Чарга распісана ажно да кастрычніка. Але гэта не значыць, што восенню-зімой сядзіба пустуе. Восенню да Галяка штогод прыязджаюць дайверы, якія на Блакітных азёрах займаюцца падводным паляваннем. Зімой з'язджаюцца кампаніі сустракаць Новы год. «Яшчэ прыязджаюць групы, якія ў мяне традыцыйна святкуюць свае дні нараджэння, — пералічвае гаспадар. — Людзі гэта рэспектабельныя, заможныя, ездзяць па розных краінах, а адзначаць дзень нараджэння штогод едуць толькі да мяне».

Гасцяваў у «Санта-Барбары» і вядомы расійскі акцёр Сяргей Бязрукаў. «Ён тады здымаўся ў Мінску ў фільме «У чэрвені 41-а», — узгадвае Аляксандр Галяк. — Калі ў яго надарылася «фортка», ён на два дні прыехаў да мяне са сваёй жонкай Ірынай. Мы звазілі іх на Блакітныя азёры (акцёр ніколі не быў у нашым краі), пакаталі на лодцы. Але яго хутка пазналі, і ён збег».

— Першыя кліенты знайшлі мяне самі, — узгадвае Аляксандр Антонавіч. — У той час яшчэ не быў адкрыты турыстычны комплекс пад Мінскам, і ўсе ехалі да нас, на Мядзельшчыну. Пакуль была адкрыта мяжа з Літвой (гэта дзесьці 1992 год), прыязджалі і адтуль. Людзі пабудуць, ацэняць, адзін аднаму раскажуць, так і перадавалася інфармацыя. Увогуле, я тут меркаваў адкрыць кавярню, а атрымалася аграсядзіба. Зараз працую па папярэдніх замовах. Гэта дазваляе будавацца далей, развівацца і паралельна прымаць людзей.

Абслугоўвае сваіх кліентаў Аляксандр Антонавіч разам з жонкай. Дапамагае і дачка, калі прыязджае на выхадныя. Беларускія нацыянальныя стравы гаспадар і гаспадыня гатуюць самі. Іх фірменныя стравы — мачанка, драныя бліны, калдуны, бабка са шкваркамі, юшка. Некаторыя кліенты, каму падабаецца экзатычная кухня, прыязджаюць са сваім кухарам. Напрыклад, двойчы на год у «Санта-Барбару» наведваюцца госці з Азербайджана. Вось яны гатуюць шашлыкі па сваім нацыянальным рэцэпце.

Суткі знаходжання ў «Санта-Барбары» (з двухразовым харчаваннем) каштуюць у межах 70 тысяч рублёў з чалавека. Гэта пры ўмове, што вы прыязджаеце не адзін, а групай 8—12 чалавек. Інакш выйдзе даражэй. «Гасцей прымаю ў асноўным па выхадных, — папярэджвае гаспадар. — Аднак калі ў мяне на выхадныя запланавана вяселле, значыць, групу я магу прыняць толькі ў прамежку з панядзелка па пятніцу».

Самым складаным у сваім занятку Аляксандр Галяк лічыць псіхалагічны аспект. Людзі прыязджаюць розныя, з розных рэгіёнаў. Калі адначасова гасцююць некалькі груп, трэба іх так размясціць, каб яны не перашкаджалі адзін аднаму. Калі на вяселле збіраюцца незнаёмыя паміж сабой людзі, іх трэба неяк аб'яднаць, згуртаваць. «Я адказны за псіхалагічны камфорт, — кажа гаспадар. — Гасцям павінна быць камфортна. А гэта ўжо справа тэхнікі. Я музыкант-самавучка. Акардэаніст. У маладосці іграў на вяселлях, таму работа з людзьмі мне ў прынцыпе знаёмая. Мне бліжэй масавыя мерапрыемствы (вяселлі, банкеты, юбілеі), хоць магу працаваць і па індывідуальнай замове».

Аляксандр Антонавіч — аматар спорту. На суседняй з сядзібай тэрыторыі ён збіраецца зрабіць спартыўную пляцоўку для гульні ў валейбол і ў вялікі тэніс. У перспектыве мяркуе ўсталяваць у «Санта-Барбары» і спартыўныя трэнажоры.

— Я хачу развіваць новыя турыстычныя маршруты, — дзеліцца планамі гаспадар. — Вадзіць групы ў паходы, даць людзям магчымасць адпачыць на прыродзе і пазнаёміцца з нашым Нарачанскім краем. А маю сядзібу выкарыстоўваць як турбазу. Напрыклад, вы з сябрамі прыехалі да мяне на тры дні і два з іх захацелі адпачыць на прыродзе. Я складаю праграму, разбіваю бівак на прыродзе і вязу вас туды. Можна павазіць гасцей па раёне, прапанаваць пераначаваць у іншай сядзібе (але папярэдне трэба скааперавацца з іншымі гаспадарамі аграсядзіб). Я магу завесці гасцей на сваю радзіму — у вёску Церлюкі, што за 5 км адсюль. Там вельмі прыгожыя мясціны, сажалка. Можна дамовіцца з Нацыянальным паркам і наладзіць стаянкі на Блакітных азёрах. Гэта ўсё ў перспектыве. Пакуль што трэба закончыць спартыўную пляцоўку.

Прадпрымальнікам-пачаткоўцам у сферы аграэкатурызму Аляксандр Антонавіч раіць звярнуць асаблівую ўвагу на месцазнаходжанне сядзібы, на стан экалогіі навакольнага асяроддзя, на забяспечанасць добрымі пад'язнымі дарогамі. Акрамя таго, у кожнай сядзібы павінна быць свая адметная «іскрынка», на якую і трэба рабіць націск.

Добрым словам узгадаў гаспадар і мясцовыя ўлады — не замінаюць працаваць, не абмяжоўваюць палёту фантазіі і творчых памкненняў. Адзіная праблема — адсутнасць газу. Сядзіба аціпляецца дровамі. Зімой пакуль натопіш такі будынак — спацееш. Але работы па падвядзенні газу ў вёску Нарач ужо распачаліся. Значыць, хутка «Санта-Барбара» стане турыстычным аб'ектам з усімі выгодамі цывілізацыі.

Інга МІНДАЛЁВА.

Мядзельскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

ТАЛЕНТЫ І ПРЫХІЛЬНІКІ

Нягледзячы на ўсеагульныя перажыванні наконт крызісу, на ўзнагароды для маладых выканаўцаў «Славянскі базар» сёлета шчодры. Акрамя асноўных узнагарод — статуэтак «Ліра» і грашовых прэмій, аб якіх мы ўжо расказалі — арганізатары, партнёры і спонсары прысудзілі мноства дадатковых. Па традыцыі Спецыяльныя прызы Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі атрымалі лепшыя выканаўцы з нашых краін — на гэты раз без аніякай інтрыгі сучасныя ноўтбукі перайшлі ў рукі Дзімы Даніленкі і Андрэя Коласава. Андрэю таксама была прысуджана паездка на дваіх у Санкт-Пецярбург і спецыяльная прэмія імя Уладзіміра Мулявіна — «За лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы і высокае выканальніцкае майстэрства», а Дзіму, як і прадстаўніку Малдовы Пашы Парфенію — прызы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД: сертыфікат на права запісу сольнага альбома з «запасам» у 150 тысяч расійскіх рублёў.

Літоўца Іеронімаса Мілюса варта было б ухваліць ужо толькі за тое, што хлопец разбавіў эстрадную ціш ды гладзь рок-опернымі партыямі і паказаў, дзе і як менавіта жыве рок. Дабаўце да гэтага «толькі» яшчэ безумоўны талент, асаблівую харызму і бездакорны вакал — і стане зразумела, чаму менавіта прадстаўніка Літвы асацыяцыя расійскай прэсы выбрала альтэрнатыўным пераможцам конкурсу і ўручыла свой прыз. (Ці пачне калі-небудзь адкрыта выказваць сваё меркаванне і беларуская прэса — пытанне рытарычнае.) Канкурсанту з Бразіліі Роджэру Рыка спонсары падарылі плеценую з саломы... модную кепку, а таксама нацыянальны беларускі ўбор, якому хлопец узрадаваўся, як дзіця. А вось Гульсум Макітавай з Казахстана за захаванне нацыянальных традыцый дастаўся не столькі памятны, колькі карысны прыз — грашовая прэмія ў 2 тысячы долараў ад Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пераможца конкурсу маладых спевакоў Дзмітрый ДАНІЛЕНКА з маці Людмілай Міхайлаўнай, сястрою Наталляй і яе дзецьмі Катарынай і Вікторыяй.

Пераможца конкурсу маладых выканаўцаў у Віцебску Дзмітрый Даніленка:

«Я НЕ ЗБІРАЮСЯ БЫЦЬ ДРУГІМ БАСКАВЫМ!»

— Лайма Вайкуле яшчэ да пачатку конкурсу выказвала сваю прыхільнасць да вас, што спарадзіла мноства чутак пра «загадзя вырашаную» перамогу...

— Праўда? Упершыню пра гэта чую ад вас. Сам я надзвычайна хваляваўся, і хоць марыў перамагчы, але ўпэўненасці ў гэтым не было ніякай. Мяне яшчэ і цяпер чамусьці не адпускае хваляванне.

— Падчас выступлення заўважыла ў вас на руцэ чырвоную нітку — гэта, калі не памыляюся, абярэг ад сурокаў?

— Не, гэта ўвогуле на ўдачу, — Дзіма дэманструе правае запясце. — Я быў у Іерусаліме ля Сцяны плачу, там павязалі гэтую нітку і сказалі, што пакуль не спадзе сама, трэба насіць, не здымаючы.

— Кажуць, што Філіп Кіркораў, які напісаў музыку да вашай конкурснай песні «Фантастыка», застаўся задаволены выкананнем?

— Шчыра кажучы, не ведаю — я так накруціў сябе перад выступленнем, што быў крыху ў эмацыянальным тумане. Здавалася б, усяго адна песня, але напрыканцы так стаміўся, выклаўся на 100 працэнтаў і не меў сілаў заставацца на сольны канцэрт Філіпа, але, думаю, яшчэ будзе магчымасць пагутарыць асабіста і абмяняцца ўражаннямі.

— Маленькая ці вялікая, але мара — перамагчы — спраўдзілася. Якая наступная — выспацца, а мо, банальна ачуняць?

— Ачуняць... і адпачыць. Паеду куды-небудзь, дзе цёпла і добра.

— Яўна не ў халаднаваты Пецярбург?

— Ну, у Пецярбургу цяпер таксама цёпла, але хочацца ўсё ж бліжэй да мора — паўднёвага, маю на ўвазе.

— Па няпісанай славянскай традыцыі, пасля «Славянскага базару» пераможцы спрабуюць свае сілы на «Еўрабачанні». Мо і вы думаеце над гэтым?

— Сапраўды, думаю — цікавы конкурс, варта было б паспрабаваць. Але пакуль нават не ведаю, ці ад Беларусі, ці ад Расіі, ці яшчэ ад нейкай краіны — увогуле не заглядваю так далёка, як там складзецца. Магчыма, увогуле не атрымаецца, бо конкурсы гэтыя зусім розныя: тут пераважае вакальнае майстэрства, на «Еўрабачанні» задача ўдзельніка — здзівіць, «скочыць лепш, вышэй, мацней» за іншых, паказаць штосьці незвычайнае, і не абавязкова пры гэтым мець выдатныя вакальныя здольнасці...

— Магчыма, нейкія парады наконт «Еўрабачання» даваў літоўскі канкурсант Іеронімас Мілюс — у яго летась ужо быў вопыт выступлення там?

— На гэту тэму мы яшчэ не гутарылі, але я абавязкова спытаюся ў яго пра некаторыя закулісныя падрабязнасці.

— Калі не сакрэт, на што думаеце патраціць прыз Гран-пры — усё ж 10 тысяч долараў сума не маленькая?

— На падарункі маім родным, часткова на адпачынак... А калі яшчэ нешта застанецца — на замежныя сувеніры. Цяпер жа крызіс, усё даражэе, — аджартоўваецца Дзіма.

— Мы чулі, як вы цудоўна спяваеце па-беларуску і па-руску. Песні на якіх яшчэ мовах ёсць у вашым рэпертуары?

— Паколькі я вучуся ў кансерваторыі, а ўся оперная музыка — гэта Італія і Германія, то спяваю адпаведна на італьянскай і нямецкай. Пару песень ёсць на англійскай і французскай, усе гэтымі мовамі я валодаю дрэнна, шчыра прызнацца. Думаю, калі вярнуся з адпачынку — свежанькі, бадзёры — займуся гэтай праблемай.

Акрамя музыкі, прызнаецца Дзіма, цяпер часу практычна ні на што не хапае — нават на асабістае жыццё. Таму, калі журналісты пачалі актыўна распытваць, ці ёсць на што спадзявацца прыхільніцам, якіх у спевака ўжо цяпер вельмі многа, ён сарамліва пагадзіўся: «Напэўна, ёсць...»

ШТО МНЕ БАСКАЎ, ШТО Я БАСКАВУ

Не заўважыць падабенства гэтых двух артыстаў проста немагчыма: голас, рэпертуар, касцюмы, нават прычоска — адзін у адзін. Аднак, паколькі салодкагалосы салавей расійскай эстрады, спаслаўшыся на нездароўе, у Віцебск не прыехаў і тым шчасліва пазбегнуў непрыемных роспытаў, аддувацца за абодвух давялося канкурсанту і яго камандзе. Тым больш, калі высветлілася, што генеральны прадзюсар Дзмітрыя Даніленкі — Барыс Шпігель, былы цесць Баскава; што песня «Фантастыка», якая прагучала на конкурсе, таксама першапачаткова была напісаная для Баскава, і, нарэшце, што менавіта залаты голас Расіі кіраваў сёлета адборам канкурсантаў.

— Параўноўваюць з Баскавым? Не самае дрэннае параўнанне, хачу вам сказаць, — перакананна Аксана Раманенка, выканаўчы прадзюсар Дзмітрыя Даніленкі. — Тады можна лічыць падобнымі ўсіх артыстаў з акадэмічнай манерай выканання і з оперным рэпертуарам. А чаму Баскаў не прыехаў на конкурс, трэба спытацца ў яго, я раней працавала з Мікалаем, але мы ўжо даўно не кантактуем.

— У маёй сям'і няма прафесійных музыкантаў, але ў мамы вельмі добры слых, у таты — голас, дзед быў скрыпачом-самавучкам, а з мяне атрымаўся гэткі ўдалы мікс, мне здаецца. Вучыўся ж я вакалу сапраўды збольшага па песнях Баскава, — расказвае сам Дзмітрый Даніленка. — Але я не хачу «замяніць» ці «змяніць» яго — расійская эстрада вялікая, месца ўсім хопіць. І быць другім Мікалаем Баскавым я дакладна не збіраюся, пастараюся стаць першым Дзмітрыем Даніленкам.

БЕЛАРУСІ НЕ ЗДРАДЗІЎ

Дзіўны феномен: мы ганарымся былымі землякамі, якія ўжо за мяжой дасягаюць вяршыняў у якой-небудзь справе — і не стамляемся нагадваць, што гэта «нашы людзі», але разам з тым не даруем, калі гэтыя землякі выказваюць прыхільнасць да іншых краін — абвінавачваем у кароткай памяці, няўдзячнасці і г.д. Вось і на навіну пра тое, што ў пераможцы «Славянскага базару» цяпер расійскае грамадзянства, многія ўспрынялі ў штыкі — збег, здрадзіў... З дапамогай Дзімавай мамы Людмілы Міхайлаўны Даніленкі мы паспрабавалі расставіць кропкі над «і» ў гэтым няпростым пытанні.

— Яшчэ да паступлення ва ўніверсітэт транспарту ён паступіў у музычны каледж, — узгадвае мама. Але мы сумняваліся ў яе перспектыўнасці, параілі яму выбраць «нармальную мужчынскую прафесію», тым больш што Дзіма добра вучыўся ў матэматычным класе. Аднак толькі ён паступіў у БелДУТ, і 1 верасня я прыходжу дадому і бачу карціну: на ўсю кватэру гучыць песня Баскава, а Дзіма сядзіць на канапе са слязамі на вачах. «Што такое, — пытаюся, — ты не рады, што паступіў у інстытут?» — «Не. Мама, я сумняваюся, ці правільна я зрабіў». І тады я вырашыла: прыкладу ўсе намаганні, каб сын не здраджваў свайму прызванню.

Дзіма адразу пачаў займацца вакалам у дасведчанага прыватнага педагога, усе пяць гадоў у ВНУ удзельнічаў у розных конкурсах. Да перамогі ў «Славянскім базары» меў ужо тры Гран-пры міжнародных конкурсаў (у Чарнігаве, Смаленску і Маскве). І паўсюль з ім ездзіла мама, добраахвотна выконваючы ролю прадзюсара, дапамагаючы падбіраць рэпертуар і забяспечваючы самую гарачую падтрымку.

— Многія неадназначна ўспрынялі навіну пра тое, што Дзіма перабіраецца ў Маскву і працуе з расійскімі прадзюсарамі...

— Калі ён удзельнічаў у тэлевізійным конкурсе «Фэст маладых», абяцалі далейшы ўдзел у міжнародных конкурсах. Па-мойму, двойчы Дзіма падаваў заяўку на «Славянскі базар» у Беларусі — і яго не прапускалі, спасылаючыся на «акадэмічную манеру выканання». Усе знаёмыя казалі: вось бы здарыўся цуд і ён прабіўся ад Расіі — але мы ў гэта не верылі... Як бачыце, цуды ўсё ж бываюць — Дзіма не толькі прабіўся, але і рэабілітаваў і сябе, і сваю манеру выканання, узяўшы Гран-пры. Значыць, так было Богу патрэбна.

— Ці часта сын цяпер бывае дома?

— Вельмі рэдка і ненадоўга — крыху адпачыць, убачыцца з намі і з сябрамі. Але Беларусі Дзіма не здрадзіў, паверце...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Андрэй Коласаў:

«ДЛЯ КУХАРА, Я ЛІЧУ, НЯДРЭННА!»

Усё ж меў рацыю кіраўнік БДА «Песняры» Вячаслаў Шарапаў — у сёлетняга прадстаўніка Беларусі байцоўскі характар. Бо ўмець дастойна — не, нават не прайграваць, але саступіць трыумф і пры гэтым шчыра парадавацца за сяброў-супернікаў — справа часам больш цяжкая, чым не падхапіць галавакружэнне ад поспехаў. Андрэю гэта ўдалося: сваім 2-м месцам ён задаволены і з гумарам адзначае, што для прафесійнага кухара такое прызнанне сярод прафесійных выканаўцаў — гэта вельмі нават няблага.

— Адпачываць? Не, я хоць і добра перанервавaўся, але не стаміўся. Трэба працаваць далей. Неўзабаве планую паўдзельнічаць у конкурсе ў Македоніі, ужо ведаю, што адна з песень, якую выканаю, гэта будзе «Always» Бон Джові. А адпачну крыху падчас паездкі ў Санкт-Пецярбург, якую мне прысудзілі ў якасці прыза — заадно пагаворым крыху з Дзімам наконт Гран-пры... *(Смяецца.)*

— Усе канкурсанты адзначалі прыязную, цёплую атмасферу; а сапраўднае сяброўства з кімсьці ў цябе завязалася?

— З Роджэрам Рыко з Бразіліі — ён назваў мяне сваім лепшым сябрам і паабяцаў зноў прыехаць у Беларусь. А дуэтам хацеў бы праспяваць з сербам Ненадам Чэранічам.

...І ўсё ж — колькі б ні сцвярджала старшыня журы Лайма Вайкуле, што конкурс — гэта ўсяго толькі суб'ектыўнае меркаванне некалькіх чалавек, няхай сабе і музычных прафесіяналаў, колькі б ні нагадвала, што мноства «зорак» запалілася і без перамог у творчых спаборніцтвах — на п'едэстале заўжды хапае месца толькі на аднаго. Ім стаў сёлета Дзмітрый Даніленка — уладзянец Гомеля, цяпер жыхар Санкт-Пецярбурга (а ў недалёкай будучыні — Масквы). Артыст, пасля перамогі якога журналісты з Беларусі і Расіі з гонарам зазначылі: «Наш!» — і ледзь не пасварыліся на гэтым сам спявак пераконвае, што не ны на «сваю» і «не сваю», — хоць расійскае грамадзянства, але казаўжды застануцца ў Беларусі. кі, якія, адклаўшы ўсе справы, Гомеля падтрымаць таленавітага ват сястра артыста з Харватыі з дачушкамі прыехала!). Магчыма, та падтрымка і ўмоўна родныя дазволілі спеваку разгарнуцца на голасу. «Вы паверыце, што яшчэ ён вельмі моцна прастудзіўся, і мы з дапамогай урача спрабавалі прывесці ў парадак звязкі?!» — не стрымлівала радасных эмоцый дырэктар маладога артыста. Мы — паверылі на слова і ў думках яшчэ раз паапладзіравалі Дзіму, на гэты раз за сілу волі.

Пра тое, чаго яшчэ мы не ведалі пра Дзмітрыя Даніленку, мы і пагаварылі з самім героем адразу пасля перамогі.

Дзіцячая экспертыза

Чарапашка для нашай Машы...

Па добрай традыцыі ў рамках «базару» вось ужо ў сёмы раз праходзіць дзіцячы музычны конкурс. У ім бяруць удзел дзеці ва ўзросце ад 7 да 12 гадоў.

Сёння другі дзень конкурсу. Спаборніцтвы распачнуцца а шостай гадзіне ўвечары. Хто выйграе Гран-пры, а гэта цэлых 5000 долараў ЗША, — інтрыга! За перамогу змагаюцца прадстаўнікі 16 краін свету. Сярод іх упершыню талент з Таджыкістана.

Сёлета міжнароднае журы ўзначальвае наш зямляк — народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны. Цікава, што сярод членаў журы і ўдзельнікі міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні мінулых гадоў — Юлі з Нідэрландаў, Міхай Трайстарыу з Румыніі, Нушка са Славеніі. А, бадай, самым папулярным членам журы сярод дзяцей як канкурсантаў, так і з публікі стала расійская спявачка Варвара — сама шматдзетная маці: чэрці за яе аўтографам выстройваюцца. Яна сказала мне, што будзе ацэньваць тое, як арганічна «ўпісваецца» кожны канкурсант у сцэну. А яшчэ паабяцала хадзіць на ўсе рэпетыцыі, бо юныя спевакі ў адрозненне ад дарослых канкурсантаў могуць і расхвалявацца падчас выступленняў, а пры гэтым мець вялікі талент.

Безумоўна, «галоўная» публіка юных выканаўцаў — дзеці. Таму ў якасці эксперта ад гледачоў я запрасіў свайго старэйшага сына Міхаіла. Гэтаму «ганаровому члену журы» ужо 4 з паловай гады. Эксперту ў канцэртнай зале «Віцебск», дзе і праходзяць усе дзіцячыя туры «базару», вельмі спадабалася тэатралізаваная цырымонія, падчас якой юныя «зорачкі» перазнаёміліся паміж сабой і выбіралі парадкавы нумар сваіх выступленняў на конкурсе. Для гэтага спачатку трэба было ўзяць яблычак з нумарам. Потым кіпуць «чароўны» куб, бы яшчэ на «карце» «царства муз» самастойна адлічыць колькасць «кропак», што выпадзе на кубе. І ў выніку вызначыць сабе парадкавы нумар выступленняў. Так ужо, дарэчы, атрымалася, што прадстаўніцы нашай краіны Марыя Новік і Лаліта выйдуць на сцэну пад нумарам 9 (адпаведна ў першы і другі дзень).

Эксперту ад народа спадабалася «казачная» (нефармальная) сустрэча канкурсантаў. «Чараўнік» царства песні і яго памочніца правялі «Вечар дружбы» весела.

Усе будучыя «зорачкі» атрымалі «хвіліну славы» — трохі паспявалі. Навічок — прадстаўнік Таджыкістана — зачараваў выкананнем папулярнай песні Баскава (пра парыжскую іншаземку — памятаеце?), а дзяўчынка з Узбекістана так спела шлягер Пугачовай пра Арлекіна (нават на калені стала), што члены журы літаральна «праслязіліся». Але нашаму эксперту найбольш спадабаўся маленькі прадстаўнік Украіны — Андранік. Калі ён пачаў выконваць украінскую песню, ледзь шкло не вылецела ў круглай зале — такі моцны голас у гэтага маленькага чалавечка.

Наша зямлячка — самая маленькая па ўзросце ўдзельніца конкурсу — 7-гадовая Маша Новік, якая займаецца вакалам пад кіраўніцтвам знакамітага беларускага педагога спадарыні Стацэнкі, скарыла эксперта і журы сваёй шчырасцю і дзіцячай непасрэднасцю. Добрыя ўражанні ў эксперта пакінула і 11-гадовая Лаліта. Пажадаем ім удачы.

Між іншым, калі мой «калега» потым пацягнуў мяне да вельмі цікавага віцебскага помніка — клоуна з сабакам, што недалёка ад амфітэатра, нашы беларускія «зорачкі» якраз былі там — цэрлі нос клоуну і лапку сабаку на ўдачу (ёсць такая ў Віцебску прыкмета). І пажадалі ўдачы адна адной. Маша трымала чарапашку. Прызналася, што гэта падарунак Ксюшы Сітнік, дзякуючы якому цяпер яна больш не хвалюецца, бо ведае, што ўсё будзе на конкурсе добра. Так і будзе, Маша і Лаліта!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НА ШЭРАГУ РЭК — ЗАМОР РЫБЫ

На шэрагу рэк сталічнай вобласці назіраецца летні замор рыбы. Як паведамілі ў абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету, масавая гібель рыбы зафіксавана на ўчастках рэк Нёман, Свіслач, Случ, Талька. Экалагічнае бедства выклікана негатыўным збегам акалічнасцяў. Увесь чэрвень ішлі моцныя дажджы, і вада з рэк заліла пойму. Затым настала спякотнае надвор'е. Ад высокіх тэмператур затопленая раслiннасць пачала гніць, што абумовіла рэзкае зніжэнне долі кіслароду ў вадзе.

Алег ПАХОЛКІН, «Мінск—Навіны».

Эксклібрыс «Звязды»

ЦЯПЕЛЬЦА Ў ПОЛІ

Мацяш, Н. І.

У прыгаршчах ветру: вершы, пераклады, эсэ/ Ніна Мацяш. — Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. — 144с.

Чытаць сапраўдную паэзію — найвялікшая асалода. Чытаць новую кнігу знакамітай паэтэсы Беларусі Ніны Мацяш, да творчасці і жыццёвага лёсу якой была заўсёды ўважлівай «Звязда», — і шчаслива, і скрушна. Апошняе з тае прычыны, што няма сярод нас аўтаркі. Яна развіталася з зямным светам напрыканцы мінулага года. Нечакана, неспадзявана, паспеўшы прыняць удзел у традыцыйным літаратурным свяце, якое летась ладзіў Брэсцкі аблвыканкам у Пінску. Шчаслива, з ноткамі ўзвышэння чытаюцца яе радкі таму, што і паэзіі, выпеставанай прыгожым талентам, асаблівай, зоркавай, вятрыскавай, словам, сапраўднай, і знакаў сакраментальных, выключна важных для тых нашчадкаў, хто застаецца з жаданнем развіваць прастору духоўную, на старонках невялікага зборніка «У прыгаршчах ветру» — звышдастаткова. «Калі кветка — знак мастацтва,/ калі птушка — тон жыцця,/ як нязраненай застацца / у жыцці невыбіраным?»

Цяплом вее ад выпеставаных светлым розумам і высокімі пачуццямі радкоў. Генадзь Праневіч, які напісаў прадмову да кнігі зямлячкі, заўважыў: «Узіранне ў высокае неба ідэала, у свет ідэальных каштоўнасцяў, сувымярэнне іх з рэчаіснасцю і ўнутраным маральным законам, «напісаным Богам у сэрцы адзінага чалавека» (Ф. Скарына), — вось тая сакральная сфера, у прасторы якой б'ецца, пакутуе, шукае выйсця і разгадкі Боскай задумы і ўласнага лёсу творчы дух паэтэсы».

У кнізе побач з арыгінальнымі вершамі змешчаны пераклады з французскай, польскай і ўкраінскай моў, у гэтым шэрагу — і пераствараннe Нінай Мацяш па-беларуску паэтычных адкрыццяў лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі Віславы Шымборскай. Змешчаны ў кнізе і эмацыйныя, публіцыстычна-завостраныя эсэ Ніны Мацяш пра французскую паэзію, Віславу Шымборску і Ліну Кастэнку. У адным з іх Ніна Мацяш піша: «Не бывае спелага паэта без яго звязу з людзьмі, з усім вакольным светам, без саўдзелу і асэнсавання жыцця». Чытайце кнігу «У прыгаршчах ветру» — і наноў адкрывайце жыццё!..

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

ТЭСЦІРАВАННЕ «МІНСК-АРЭНЫ» ПАЧАЛОСЯ

Сталіца прымае чэмпіянат Еўропы па веласпорце

Сёння ў Мінску стартуе чэмпіянат Еўропы па веласпорце на трэку. Удзел у ім возьмуць каля 300 спартсменаў з 27 каманд. Як паведаміў намеснік міністра спорту і турызму Дзмітрый Шычко, праца над арганізацыяй спаборніцтваў пачалася адразу пасля таго, як Мінск атрымаў права на іх правядзенне. Паводле яго слоў, на велатрэку «Мінск-арэны», дзе пройдзе чэмпіянат, створаныя ўсе ўмовы для правядзення спаборніцтваў на найвышэйшым узроўні. Акрамя таго, намеснік міністра паведаміў, што гасцям прапанаюцца лепшыя гатэлі, ад якіх да «Мінск-арэны» будзе наладжаны транспартны рух, акрамя таго, гасцей і ўдзельнікаў першынства Еўропы чакае культурная праграма ў беларускай сталіцы.

Над арганізацыяй спаборніцтваў папрацавалі шматлікія структуры Мінгарвыканкама, пацвердзіў начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама Міхаіл Юспа. У гасцей Мінска будзе магчымасць пазнаёміцца з гістарычнымі каштоўнасцямі Мінска, акрамя таго, ім прапануюць спектаклі з рэпертуару вядучых тэатраў. Дырэктар «Мінск-арэны» Павел Галкін расказаў, што вопыт правядзення такіх спаборніцтваў наша краіна пераймала ў замежных суседзяў. І паводле яго слоў, «Мінск-арэна» павінна справіцца з гэтым першым сур'ёзным выпрабаваннем. Ён расказаў, што за дзень да адкрыцця спаборніцтваў, калі раніцай рабілася апошняя падрыхтоўка, яму асабіста падзякавала польская дэлегацыя, раней гэта зрабілі прадстаўнікі Францыі і Італіі. Павел Галкін выказаў меркаванне, што чэмпіянат Еўропы паслужыць выдатнай рэкламай нашай сталіцы і да нас не толькі на спаборніцтвы, але і на трэніровачныя зборы будуць прыязджаць замежныя спартсмены, што пойдзе на карысць і беларускім атлетам.

Высока ацаніў магчымасці велатрэка «Мінск-арэны» прэзідэнт камісіі па трэку Еўрапейскага саюза веласіпеднага спорту Энрыка Дэла Каза. У прыватнасці, ён адзначыў, што размаўляў з замежнымі дэлегацыямі, і яны задаволеныя. Акрамя таго, ён паведаміў, што Еўрапейскі саюз скарыстаўся тым, што ў Мінску будаваўся велатрэк, і даў права правядзення чэмпіянату Еўропы менавіта Беларусі. Цяпер Мінск штогод будзе ўключацца ў каляндар міжнародных спаборніцтваў: тут могуць праводзіцца этапы Кубка свету, чэмпіянат Еўропы, а магчыма, і чэмпіянат свету.

Галоўны трэнер беларускай каманды Алег Іваноў назваў фаварытамі турніру зборныя Вялікабрытаніі, Германіі і Расіі. Паводле яго слоў, у агульнакамандным заліку беларусы яшчэ «не дараслі» да прызавых месцаў. Аднак беларускія веласіпедысты змогуць пазмагацца за медалі ў асобных дысцыплінах, у прыватнасці, у групавых гонках і ў скрэтчы. Галоўнымі надзеямі беларусаў з'яўляюцца Алена Амелюсік і Аксана Папко, Юрый Юрчанка і Сяргей Сакавец.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ОАО «ВИТЕБСКОБЛРЕСУРСЫ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складских помещений с элементами благоустройства, гаражей и иного имущества, расположенного на ул. М. Горького, 197 в г. Витебске, единым лотом.

В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Литер
1.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50614 (здание складских помещений) общей площадью 690 кв. м, (год постройки – 1969) в том числе составные части:	В1/к
1.1.	Площадка – 1550 кв. м	А
1.2.	Камень бортовой - 115,15 м	а1
1.3.	Участок ограждения - 7,55 м	б1
1.4.	Ворота въездные – 5,9 м	б2
1.5.	Участок ограждения – 12,35 м	б3
1.6.	Участок ограждения – 2,20 м	б4
1.7.	Участок ограждения – 118,3 м	б5
1.8.	Участок ограждения – 2,85 м	б6
1.9.	Ворота въездные – 5,90 м	б7
1.10.	Участок ограждения – 30,35 м	б8
1.11.	Калитка – 1,5 м	б9
1.12.	Труба дымовая – 1 кв. м	
1.13.	Уборная – 3 кв. м	
2.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50616 (здание гаражей) общей площадью 53 кв. м (год постройки – 1993).	
3.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59952 (сооружение специализированное энергетики – электрическая сеть) протяженностью 233,7 м	
4.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59951 (сооружение специализированное энергетики – тепловая сеть) протяженностью 83,1 м	

Земельный участок площадью 0,2681 га, кадастровый номер 240100000003000118 предоставлен в постоянное пользование для содержания и обслуживания существующих зданий по ул. М. Горького, 197 в г. Витебске.

Начальная цена лота – 331 259 229 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 30 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Аукцион состоится **27 июля 2009 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **24 июля 2009 года** до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(0212)27 23 16 – ОАО «Витебскоблресурсы».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ ОАО «БЕЛТРАНСГАЗ»

№ лота	1
Характеристика объекта	**здание столовой КС Ивацевичи** (инв. 1990) – капитальное строение с инвентарным номером 122/С-2233 площадью 417 кв.м, в т.ч.: покрытие газонное территории столовой (инв. 1980), покрытие железобетонное площадки столовой (инв. 7086), покрытие из тротуарной плитки столовой (инв. 7087), ограждение металлическое столовой (инв. 7088); **склад магазина Ивацевичи** (инв. 1876) – капитальное строение с инвентарным номером 122/С-2221 площадью 42,0 кв.м, в т.ч.: покрытие железобетонное площадки склада магазина (инв. 7089)
Местонахождение объекта	2,2 км юго-западнее дер. Холопья Ивацевичского района Брестской области на земельных участках: с кадастровым № 123400000001000484 площадью 0,0207 га и с кадастровым № 123400000001000482 площадью 0,1261 га
Продавец	Открытое акционерное общество «Белтрансгаз»
Начальная цена продажи (руб.)	266 499 000
Сумма задатка (руб.)	26 649 000
Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»	

ПРИМЕЧАНИЕ: Для участия в аукционе необходимо в адрес организатора аукциона подать заявление, подписать соглашение с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» и представить:

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка 252, УНП 290433924.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о проведении аукционов по продаже объектов городской коммунальной собственности, утвержденным решением Брестского горисполкома от 07.09.2006 № 1416.

Договор купли-продажи объекта с победителем аукциона заключается Продавцом в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукционных торгов и подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 10-ти календарных дней с даты проведения торгов сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона.

Аукцион состоится 18 августа 2009 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 16.07.2009 г. до 17.30 16.08.2009 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46. Телефоны: 23 81 92, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»

23 июля 2009 года состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Жабинковский сахарный завод»**, расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина.

Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления.

Повестка дня собрания:
«О согласовании предоставления благотворительной (спонсорской) помощи»

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник — пятница), начиная с 15 июля 2009 г. по 22 июля 2009 г., по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 23 июля 2009 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 23 июля 2009 года, 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 13 июля 2009 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — **паспорт,** представителю акционера — **паспорт и доверенность.**

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ДСУ № 64, г. БОРИСОВ» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объектов недвижимости расположенных в г. Борисов, ул. Зеленый городок, промузел «Зеленый городок»:

Лот № 1: здание бытового корпуса (в т.ч. асфальтное покрытие), об. пл. 689 кв.м. Начальная цена с НДС – 95 244 893 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,8116 га.

Лот № 2: здание мастерской (в т.ч. асфальтное покрытие, ворота), об. пл. 570,6 кв.м. Начальная цена с НДС – 61 047 401 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,3548 га.

Цены снижены на 50 %.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 18.04.2009 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **22.07.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к

У абарачэнні — прамавугольная манета

З сённяшняга дня Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне сярэбраную памятную манету «І. Рэпін», якая выпушчана ў рамках міжнароднай манетнай праграмы «Мастакі свету», паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі галоўнага банка краіны.

Манета мае намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925 і масу 28,28 грама. Яна прамавугольнай формы памерам 40,00 на 28,00 мм. Адчаканена памятная манета на АТ «Манетны двор Польшчы» якасцю «брыльянт-анцыркулейтэд» з прымяненнем метаду тампадрукавання. Тыраж манеты складае да 15 тысяч штук.

Ігар ГРЫШЫН.

Шануй сваё

«У ГРУНВАЛЬДСКАЙ БІТВЕ БЕЛАРУСЫ НЕ ПАДАЛІСЯ ТЭЎТОНЦАМ ПАМЯРКОЎНЫМІ!..»

РОЎНА 599 гадоў таму, 15 ліпеня 1410 года, адбылася Грунвальдская бітва. Гэтае словазлучэнне ведаюць, бадай, усе. Але што дакладна было ў гэты дзень, скажуць не многія. Пра простыя і не зусім простыя акалічнасці Грунвальдскай бітвы мы гутарым з доктарам гістарычных навук, прафесарам Універсітэта культуры і мастацтваў Анатолем ГРЫЦКЕВІЧАМ.

Я вельмі спадзяюся, што ў наступным годзе мы далучымся да святкавання 600-годдзя бітвы. Бо гэта ў вялікай ступені наша перамога і наша гісторыя — чаму мы ўвесь час яе некаму аддаём?!

«Тэўтонцы хацелі захапіць нашу зямлю і анямечыць беларусаў»

— Анатоль Пятровіч, давайце дамо агульнай тэорыі: хто з кім біўся ў Грунвальдскай бітве?

— Білася беларуска-літоўскае войска разам з саюзным польскім войскам супраць нямецкага Тэўтонскага рыцарска-манаскага ордэна. Але «манаскага» такога асаблівага, дзе манахі павінны былі не маліцца, а ваяваць — каб распаўсюджваць веру Хрыстову сярод язычнікаў (паганцаў). У Тэўтонскім ордэне былі не толькі немцы — туды прыязджалі для практыкі рыцары з усіх краінаў Еўропы: былі і англійскія, і бургундскія, і французскія, нават з Пірынейскага паўвострава. З нашага боку — беларусы, палякі, летувісы, балты, чэхі на чале з Янам Жыжкам, невялікая група татараў. Пішуць і пра «рускіх рыцараў», але калі разабрацца, то гэта былі ці то тры, ці то адна «смаленская харугва». А Смаленск — гэта ж на той час беларускі горад!..

— Гэта была агрэсія ордэна? Яны на нас пайшлі?

— Так, гэта была частка іх захопніцкай праграмы. Бітва вырашыла лёс: ці будзе далей Тэўтонскі ордэн працягваць сваю агрэсію, захопліваць новыя землі і анямечваць людзей, як анямечылі прусаў і часткова яцвягаў.

— А вось гэты іх ваяўнічы паход, калі і адкуль ён пачаўся?

— Ён пачаўся ў XIII стагоддзі, калі скончыліся ў асноўным крыжовыя паходы ў Святую зямлю. Тэўтонцы знайшлі для сябе поле дзейнасці — гэта Прыбалтыка, дзе былі ці не апошнія няхрышчаныя людзі. А заадно вырашылі ахрысціць і тых, хто быў побач, — праваслаўных беларусаў і каталікоў-палякаў.

— Палякаў з каталіцызму яны вырашылі хрысціць у каталіцызм?

— Так-так!.. *(Смяецца.)* Тут гаворка ішла, безумоўна, пра захоп земляў. А ў нас — пра захоп і хрышчэнне ў сваю веру. Ім трэба было пашыраць сваю тэрыторыю, але рабілася гэта пад рэлігійнай шыльдай.

— Хто кіраваў гэтымі паходамі?

— Сам ордэн. Фармальна ён падпарадкоўваўся імператару Свяшчэннай Рымскай імперыі. Але дзейнічаў амаль самастойна.

— А нейкая роля Папы Рымскага была ў гэтым?

— Апасродкавана ордэн падпарадкоўваўся і Папу...

— Значыць, ён ухваляў гэтыя крывавыя паходы?

— Бывала. А бывала, і без Папы абыходзілася... Тады ў Грунвальдскай бітве ўдзельнічалі практычна ўсе камандзіры атрадаў і зямель Тэўтонскага ордэна. І сам Вялікі Магістр Ульрых фон Юнгінген.

— Пра якую колькасць войскаў ідзе гаворка з абодвух бакоў? Вы казалі пра харугвы. Харугва — гэта колькі?

— Гэта па-рознаму. Увогуле гісторыкі лічаць, што не такая ўжо і вялікая колькасць ваяроў там была. Прыблізна лічаць так: 25-35 тысяч з нашага боку, крышачку менш — з нямецкага. Але ў іх быў лепшы парадак, яны былі больш падрыхтаваныя да баёў. Яны ўвесь час змагаліся, былі больш спрактыкаваныя. А ў нас змагаліся, калі пачыналася вайна. Таму, улічваючы іх падрыхтоўку, можна сказаць, што сілы былі роўныя. І таму падчас самой бітвы было ваганне, невядома было, хто пераможа. Лёс бітвы вырашыўся літаральна ў канцы...

— Дарэчы, месца бітвы было абумоўлена загадзя ці войскі сустрэліся там спантанна?

— Вядома, абумоўлена. Перад любой бітвай месца доўга выбіралася загадзя. Бо не на любым жа полі можа адбыцца такая маштабная баталія, трэба ж, каб было дзе развярнуцца. Грунвальдскае поле задаволіла абодва бакі.

«Ягайла ўвесь час маліўся, таму Вітаўт узяў ініцыятыву ў свае рукі»

— Анатоль Пятровіч, давайце адновім падзеі 15 ліпеня 1410 года: як усё адбывалася?

— Раніца для абодвух бакоў пачалася з малітвы — без гэтага ніводная бітва не магла адбыцца. Войскі пастроіліся — і адны, і другія. Ягайла ўвесь час маліўся — паўсюль пра гэта пішацца. Ён вельмі сумнявaўся ў тым, што ці пераможа. Думаў, што калі больш памоліцца — дык пераможа. Скончылася тым, што Вялікі Магістр ордэна прыслаў Ягайлу два мячы, каб ён урэшце пачаў бітву, бо колькі чакаць?! А Вітаўт ірваўся ў бой. Тым больш што нашы ваяры ўжо не маглі чакаць, бо ўявіце — на ліпеньскай спякоце сядзець ва ўсім гэтым жалезе!..

— А фармальна хто там быў галоўны — Вітаўт ці Ягайла?

— Фармальна — Ягайла, але фактычна камандаваў Вітаўт, бо Ягайла ўвесь час маліўся. Толькі пасля, калі ўжо кіпеў бой, Ягайла стаў актыўна кіраваць ягонай хадой, нават паслаў у гушчар сваю прыдворную харугву... Усім вядомы такі эпізод. На правым флангу былі воіны Вялікага Княства Літоўскага і Рускага, як яно тады называлася. У пэўны момант лёгкая конніца «не вытрымала» націску нямецкіх рыцараў — і пачала адступаць. Рыцарам падалося, што яны перамагаюць. Пачаўся крык: «Літва ўцякае!» Яны натхніліся — і за імі паімчаліся іншыя, каб біць «уцекачоў». Гэта звычайная тактыка беларусаў!.. Тое самае рабіў пасля і Канстанцін Астрожскі! Уцякалі-ўцякалі, строй ворагаў перамяшаўся, ніякага парадку ўжо не было, і тады наша конніца развярнулася — і давай секчы тых тэўтонцаў...

— Дарэчы, першымі ў той дзень наступалі тэўтонцы?

— Першым усё-такі пачало наступаць войска Вітаўта. Немцы спецыяльна не ішлі наперад, яны ж выкапалі «воўчыя ямы»: зверху прысыпаныя галлём, а ў ямінах завостраныя калы... І некаторая частка нашай конніцы трапіла туды і загінула...

— Анатоль Пятровіч, але ж такія яміны былі распаўсюджанай фішкай у той час, чаму нашы так купіліся?!

— Хіба што не было добрай выведкі. А трэба было гэта зрабіць... Але пасля нейкім чынам змаглі зламаць першы наступ, разбілі нямецкую пяхоту і пачалі ціснуць на варожую конніцу. Вось тады пачалася самая бітва... А другая палова дня 15 ліпеня — гэта калі немцаў абкружылі і пачалі знішчаць па поўнай праграме. У палон спачатку не бралі, у палон бралі ўжо ў самым канцы — тых, хто ўцякаў, каб пасля атрымаць выкуп. На карціне Матэйкі адлюстравана, як загінуў сам Вялікі Магістр — яго працялі рагацінай з жалезнымі канцамі. Выжыць пры гэтым было немагчыма... Фактычна тады выратавалася і ўцякла толькі адна нямецкая харугва — і беглі яны ажно да Мальбарка (Марыенбурга), дзе схаваліся. Іх, вядома, маглі дагнаць і перахапіць. Але ж немцы кінулі абоз з багаццем — і нашы спыніліся, каб захапіць гэты абоз, а заадно — знішчыць 5000 чалавек чэлядзі, якая таксама была ўзброеная.

Вялікі князь ВКЛ Вітаўт.

У палон спачатку не бралі, у палон бралі ўжо ў самым канцы — тых, хто ўцякаў, каб пасля атрымаць выкуп.

— Колькі па часе працягвалася бітва?

— Каля 5-6 гадзін. Былі пэўныя перапынкі для пастраення войскаў.

— Што ж дапамагло нам перамагчы, калі немцы былі лепш навучаныя і ўзброеныя?

— Дапамагла расцярушанасць іхніх харугваў, якая адбылася, як я казаў, дзякуючы нашай хітрасці. Дапамагло вельмі кваліфікаванае ўступленне ў бой нашых харугваў — па чарзе, каб не было балагану.

Вялікі князь ВКЛ Ягайла.

Гэтая тактыка была незнаёмая для рыцараў... Дарэчы, пасля бітвы нашы войскі яшчэ стаялі там пару дзён — хавалі забітых: і нашых, і іхніх.

— І ворагаў таксама хавалі?

— Так, збольшага па меркаваннях бяспекі — ад непахаваных целаў магла пачацца эпідэмія...

— Анатоль Пятровіч, давайце лакалізуем: дзе знаходзіцца Грунвальдскае поле?

— Ля мястэчка Грунвальд, тады гэта была тэрыторыя Тэўтонскага ордэна, якая ўжо пачала называцца Прусіяй, бо немцы захавалі назву тых плямёнаў, якія там жылі. Цяпер гэта тэрыторыя Польшчы, блізкая да Калінінградскай вобласці. На тым месцы стаіць помнік, штогод адбываюцца святкаванні. Вось толькі беларусы ніколі афіцыйна не ездзілі... Я вельмі спадзяюся, што ў наступным годзе мы далучымся да святкавання 600-годдзя бітвы. Бо гэта ў вялікай ступені наша перамога і наша гісторыя — чаму мы ўвесь час яе некаму аддаём?! Дарэчы, ящчэ ў лютым мы з групай гісторыкаў і неабыякавых людзей напісалі ліст з прапановай да 600-годдзя ўсталяваць помнік у гонар Грунвальдскай бітвы...

«Напярэдадні бітвы адбылося грандыёзнае паляванне ў Белавежскай пушчы...»

— Анатоль Пятровіч, а чаму бітва адбылася менавіта там, чаму мы так далёка залезлі?

— Залезлі таму, што разбіць ворага на яго тэрыторыі было лепей. А заадно і каб на сваёй тэрыторыі не было знішчэнняў, якія заўсёды ўчынялі крыжакі. Мы пайшлі насустрач, каб не пусціць іх сюды.

— Дык выведка ў той час добра працавала?

— Выведка працавала добра. Тады ўпершыню абодва бакі зрабілі планы паходаў — з вымярэннем адлегласці, нанясенне пунктаў... Планы трымалі ў таямніцы. Калі ў Бярэсці Ягайла з Вітаўтам сабраліся ящчэ за год да бітвы, то была выстаўленая такая ахова, што ніхто не ведаў, пра што яны гавораць! І немцы даведаліся пра паход, калі ўжо вялікае войска пайшло туды! Да паходу і да бітвы мы падрыхтаваліся ладна. Напярэдадні адбылося грандыёзнае паляванне ў Белавежскай пушчы — трэба ж было войска карміць. Упалявалі і насалілі столькі мяса!.. А потым павезлі да Віслы, па Вісле спусцілі да самага месца бітвы.

— А каго білі ў пушчы — зуброў, дзікоў?

— А ўсіх, хто бег, таго і білі! *(Смяецца).*

Магістр Тэўтонскага ордэна Ульрых фон Юнгінген. Гравюра 17 ст.

Грунвальдская бітва — паказчык, што беларускі народ ужо ў тыя часы змагаўся за сваю незалежнасць, за сваю дзяржаву. Гэта — сведчанне вялікага вайсковага майстэрства беларусаў. Напамін, што мы — нацыя рыцараў і асілкаў. Гэта зараз існуе прыкры стэрэатып пра рахманых і памяркоўных беларусаў. Ведаеце, магістру фон Юнгінгену беларусы не падаліся рахманымі!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

ДАРЭЧЫ

Некалькі дзён таму амбасадар Літвы ў Беларусі спадар Эдмінас Багдонас зрабіў прапанову, каб у 2010 годзе беларусы і літоўцы адзначылі 600-годдзе Грунвальдскай бітвы разам.

Воін пачатку 15 ст.

ЗВЯЗДА
Рэгіёны Расіі — у Беларусі
Сумесны беларуска-расійскі інфармацыйна-інтэгрыйны праект
Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь і рэдакцыі газеты «Звязда»

Калінінградская вобласць

Георгій БООС:

«СЯБРОЎСТВА ПРАВЯРАЕЦЦА ВЫПРАБАВАННЯМІ»

Цеснае ўзаемадзеянне рэгіёнаў Беларусі з Калінінградскай вобласцю мае ўжо даўнюю гісторыю. Супрацоўніцтва развіваецца па розных накірунках і каардынуецца пастаянна дзейным органам — Расійска-Беларускім саветам па доўгатэрміновым супрацоўніцтве Калінінградскай вобласці з абласцямі, міністэрствамі, органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь (РБС). З расійскага боку Савет узначальвае губернатар Калінінградскай вобласці Г.В. Боос, з беларускага — намеснік прэм'ер-міністра Беларусі А.У. Кабякоў. У актыве супрацоўніцтва — нямала высокіх вынікаў, перспектыўных праектаў, сумесных планаў і ініцыятыў. Ці адбіваецца на нашым партнёрстве сусветны фінансавы крызіс? Што прадугледжваецца ў гэтых складаных сацыяльна-эканамічных умовах для агульнага поспеху? На гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае калінінградскі губернатар Георгій БООС.

— Органы выканаўчай улады вобласці робяць магчымыя захады для стварэння спрыяльных умоў па рэалізацыі двухбаковых дамоўленасцяў нашых гаспадарчых суб'ектаў і арганізацый, — адзначыў Георгій Валянцінавіч. — Вызначальнай умовай у крызіснай сітуацыі становяцца абмежаванні ў фінансавых сродках, у адпаведнасці з якімі і давядзецца ўносіць карэктывы па выкананні дасягнутых дамоўленасцяў паміж бакамі. Але галоўным акцэнтам, якога, як я ўпэўнены, неабходна прытрымлівацца ў сумеснай працы, павінна стаць павышэнне адказнасці бакоў за безумоўнае выкананне сваёй часткі сумеснай працы. Да гэтага нас абавязваюць выклікі часу. І я бачу ў гэтым не толькі ўзмацненне жорсткасці патрабавальнасці перш за ўсё да самога сябе, але і рэсурс для далейшых поспехаў. У тым ліку і ва ўмацаванні сяброўскіх сувязяў. Сяброўства, як вядома, правяраецца выпрабаваннямі.

Што датычыцца актуалізацыі Праграмы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Калінінградскай вобласці з Рэспублікай Беларусь на 2006—2010 гады, то мы яе ажыццяўляем рэгулярна — на штогадовых пасяджэннях Расійска-Беларускага савета. На чарговым 8-м пасяджэнні Савета ў Мінску прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідоркім і мной падпісаны План мерапрыемстваў па супрацоўніцтве Калінінградскай вобласці Расійскай Федэрацыі з Рэспублікай Беларусь на 2009 год. Усе планы, у тым ліку па супрацоўніцтве з беларускімі рэгіёнамі, уключаюць канкрэтныя мерапрыемствы для выканання і адначасова вызначаюць прыярытэтныя кірункі работы органаў дзяржаўнай улады і гаспадарчых суб'ектаў розных формы ўласнасці.

— Якія перспектывы бачацца вам у цяперашніх умовах па развіцці вытворчай кааперацыі з беларускімі партнёрамі?

— Перспектыўным кірункам інтэграцыі расійскага і беларускага бізнэсу, які пашырае гарызонты збыту прадукцыі і закупак сыравіны, можа стаць рэалізацыя на тэрыторыі Калінінградскай вобласці сумесных інвестыцыйных праектаў з выкарыстаннем прэферэнцый, якія прадастаўляюцца Федэральным законам «Аб Асобнай эканамічнай зоне ў Калінінградскай вобласці», які ўвайшоў у дзеянне з 1 красавіка 2006 года. Гэты нарматыўна-прававы акт увёў новае паняцце — рэзідэнт АЭЗ у Калінінградскай вобласці. Рэзідэнтам АЭЗ можа стаць юрыдычная асоба, якая адпавядае патрабаванням закона і рэалізоўвае інвестыцыйны праект на тэрыторыі Калінінградскай вобласці з аб'ёмам капітальных укладанняў не менш за 150 мільёнаў расійскіх рублёў, інвеставаных на працягу трох гадоў. Цяпер у якасці рэзідэнтаў АЭЗ у Калінінградскай вобласці ажыццяўляюць сваю дзейнасць 56 арганізацый з задэклараваным аб'ёмам капітальных укладанняў 33,8 мільярда расійскіх рублёў. Амаль палову рэзідэнтаў АЭЗ складаюць арганізацыі з замежным капіталам. На жаль, беларускія інвестыцыі складаюць толькі 0,6 працэнта ад агульнага аб'ёму замежнага капіталу.

— Якія рэзервы бачаць у Калінінградскай вобласці па актывізацыі супрацоўніцтва з Беларуссю ў рамках праграм Саюзнай дзяржавы?

— Адным з асноўных кірункаў узаемадзеяння Калінінградскай вобласці з Рэспублікай Беларусь, па якіх неабходна актывізаваць супрацоўніцтва, з'яўляецца выкарыстанне калінінградскіх партоў для экспарту беларускіх грузаў. Пытанне аб транзіце беларускіх экспартных грузаў праз парты Калінінградскай вобласці і зацікаўленага ўдзелу Беларусі ў развіцці гэтай партовай інфраструктуры неаднаразова разглядалася на пасяджэннях Урада Саюзнай дзяржавы. Аднак пакуль не ўдалося ліквідаваць розніцу тарыфаў на чыгуначныя грузавыя перавозкі па тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі ў кірунку Клайпедскага порта і партоў Калінінградскай вобласці. Дзейныя тарыфы з'яўляюцца стрымальным фактарам пастаўкі беларускіх грузаў праз калінінградскі порт, у прыватнасці, калійных угнаенняў, прадукцыі машынабудавання, металургіі. На 8-м пасяджэнні РБС вельмі прадметна абмяркоўвалася гэта тэма пры агульнай згодзе з неабходнасцю вырашэння праблемы і скарачэння затрат пры транспарціроўцы грузаў з Беларусі ў Калінінградскую вобласць.

Важным кірункам з'яўляецца таксама паглыбленне прамысловай кааперацыі ў сферах сельскагаспадарчага і дарожна-будаўнічага машынабудавання, аўтамабільнай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці. У гэтым кантэксце гаворка ідзе, напрыклад, пра стварэнне сумесных зборачных прадпрыемстваў вытворча-тэхнічнага профілю. У прыватнасці, разглядаецца магчымасць зборкі ліфтаў завода «Магілёўліфтмаш». Акрамя таго, абмяркоўваецца стварэнне дылерскіх і сэрвісных цэнтраў прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння. У прыватнасці, запланавана арганізацыя адзінага спецыялізаванага цэнтра па сэрвісным, гарантыйным і паслягарантыйным абслугоўванні беларускай сельгастэхнікі на базе «Балтаграсэрвіса», які з'яўляецца дылерам Мінскага трактарнага завода.

Агульная зацікаўленасць існуе ў стварэнні гандлёва-лагістычных цэнтраў для сустрэчнага прасоўвання калінінградскай і беларускай прамысловай прадукцыі — вытворча-тэхнічнага прызначэння і спажывецкіх тавараў, папярова-белавой, мэблевай, тэкстылю і трыкатажу, абутку, прадуктаў харчавання.

Маргарита МЕЛЮХОВА:

«ГЛАВНОЕ БОГАТСТВО СВЕТЛОГОРСКА — БАЛТИЙСКОЕ МОРЕ И ВОЗДУХ»

Есть в Калининградской области на побережье Балтийского моря очень красивый, оригинальный и ухоженный город-курорт — Светлогорск. Чем же он хорош? Этот вопрос наш корреспондент задал директору расположенного здесь пансионата «Волна» Маргарите МЕЛЮХОВОЙ, которая любезно согласилась провести небольшую экскурсию по Светлогорску для читателей «Звязды».

— Человек, впервые попадающий в наш город, сразу заметит его первую «изюминку»: здесь все улицы своеобразны. Сохранились виллы в стиле «фахверк», а также памятники архитектуры еще со времен Восточной Пруссии. Особенно привлекает неповторимость архитектурной среды исторической части Светлогорска. Плюс к этому во время прогулки по городу наши гости быстро убеждаются, что попали просто в... ботанический сад. Ведь растительное великолепие местной городской среды имеет не одну достопримечательность. Достаточно сказать, что деревья и кустарники — всего около 1200 видов — собраны здесь из самых разных уголков земного шара. Но главное богатство Светлогорска — это Балтийское море и воздух. Очень благоприятны у нас условия для закаливания: вода в море бодрящая и поднимающая тонус, а пляж хорошо проветривается.

— Как обстоят дела со здешним загаром?

— Наше прибалтийское солнышко не всегда бывает щедрым на тепло, так что по-настоящему солнечных дней у нас несколько меньше, чем в Сочи, но здешний загар по красоте ничуть не уступает сочинскому. Если быть абсолютно точным, то в среднем у нас в году — 135 солнечных дней, а необходимая биологическая ультрафиолетовая активность длится пять месяцев. В Сочи, между прочим, этот показатель всего на полтора месяца больше. А еще у нас есть балтийская вода, которая богата различными солями, позитивно воздействующими на рецепторы кожи. Да и само купание в море доставляет большое удовольствие.

— А что можно сказать о втором богатстве Светлогорска — воздухе?

— Воздух у нас чист, прозрачен и насыщен ароматами моря, хвои и цветов. Поэтому Светлогорск является круглогодичным курортом.

— И приехав сюда, можно остановиться в пансионате «Волна»?

— Да. Наш пансионат — это 7-этажное здание с прекрасными террасами, парковкой. Для желающих поправить свое здоровье есть хороший реабилитационный и лечебный центр, где отдыхающих ждут лазеротерапия, массаж, грязелечение, мини-сауна «кедровая бочка», сауна с бассейном, магнитотерапия, мониторная очистка кишечника, парафиновые маски, ультразвуковая терапия, сухая углекислая ванна, «соляная пещера», ароматерапия, гидромассаж, жемчужная ванна, косметический массаж лица, фитнес, дискотека, фито-бар. Все эти услуги оказывает квалифицированный медперсонал с использованием современной аппаратуры. У нас лечатся люди, перенесшие инфаркт миокарда, страдающие гипертонической болезнью и атеросклерозом, а также заболеваниями желудочно-кишечного тракта, кожными болезнями, связанными с нарушениями обмена веществ, и урологическими заболеваниями.

— Пансионат «Волна» работает только как санаторий?

— Наш пансионат — это еще и бизнес-центр, где проводится масса самых значимых мероприятий правительства России, всего Северо-западного региона с участием приграничных стран, поэтому мы работаем еще и как отель-гостиница. На нашем сайте www.hotelvolna.ru и воспользовавшись нашим электронным адресом reception@hotelvolna.ru желающие могут заказать у нас номер или путевку на лечение. Замечу, что с 2000 по 2004 год мы плотно сотрудничали с Министерством социального обеспечения Республики Беларусь по части оздоровления белорусских граждан. За эти годы у нас побывало и оздоровилось более пяти с половиной тысяч человек. Мы гордимся такими показателями, так как до сих пор получаем письма благодарности из Беларуси.

— А если вернуться к экскурсиям?

— Мы предлагаем их на любой вкус: по маршруту Тевтонского Ордена, а также в Калининград, Балтийск, на Куршскую косу, в Литву и Польшу. У нас можно совершить прогулки: по городу (пешком и конную) — по маршруту теренкура; по воздуху — на дельтаплане; на дно морское — с аквалангом.

— А можно у вас отдохнуть, что называется, интеллектуально?

— Да, можно посетить концерты классической музыки в органном зале, сходить в кино, встретиться с интересными людьми. Кроме того, у нас есть услуги трансфера и визовой поддержки. Так что приглашаем жителей Республики Беларусь побывать у нас.

Мы ждем Вас
по адресу:
Россия, 238560, Калининградская область, г. Светлогорск, Калининградский проспект, 68-6.
Наши телефоны:
(+7 4012) 743666, (+7 4015) 321591, 322498 — работают круглосуточно.
Звоните!
Будем очень рады.
ИНН 3912001960

Курская вобласць

Мікалай ЦЯПАЧКІН: «Узаемадзеянне з беларускімі прадпрыемствамі прамысловага комплексу і перапрацоўкі перспектыўнае»

Сёння Курская гандлёва-прамысловая палата прадстаўляе інтарэсы малога, сярэдняга і буйнога бізнэсу, ахопліваючы сваёй дзейнасцю ўсе сферы прадпрымальніцтва ў гэтым расійскім рэгіёне — прамысловасць, транспарт, будаўніцтва, сельскую гаспадарку, міжнароднае супрацоўніцтва. Як ва ўмовах фінансавага крызісу яна развівае ўзаемадзеянне з беларускімі партнёрамі? На гэта і шэраг іншых пытанняў карэспандэнт «Звязды» папрасіў адказаць прэзідэнта Курскай ГПП Мікалая ЦЯПАЧКІНА.

— Мы сталі ініцыятарамі стварэння рэгіянальнага Цэнтра субкантрактацыі, які дапамагае малому і сярэдняму бізнэсу знайсці новых партнёраў, — адзначыў Мікалай Міхайлавіч. — Адначасова Курская ГПП рэалізуе Пагадненне аб супрацоўніцтве з Беларускай гандлёва-прамысловай палатай. Устаноўленыя партнёрскія сувязі з Мінскім, Віцебскім, Брэсцкім і Гомельскім аддзяленнямі БелГПП. Падпісаныя дакументы прадугледжваюць садзейнічанне прадпрыемствам, арганізацыям і асацыяцыям у пытаннях развіцця і паглыблення ўсіх формаў знешнеэканамічнай дзейнасці, абмен інфармацыяй аб кірунках двухбаковага гандлю, пашырэнне кантактаў прадпрымальніцкіх структур, арганізацыю і правядзенне выставаў-кірмашоў, канферэнцый, семінараў, круглых сталоў. Ужо ў гэтым годзе плануецца правесці ў Курску выставу-кірмаш беларускіх тавараў, а ў Беларусі — выставу-кірмаш курскіх тавараў. Мы ўдзельнічаем у падрыхтоўцы праекта пагаднення аб супрацоўніцтве з Курскай абласной думай. Ёсць намер падпісаць пагадненне аб супрацоўніцтве з Курскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам. Мы ўдзельнічаем у падрыхтоўцы праекта пагаднення

«Спадарыня... Дазвольце ёй застацца!
«Звязда», 8 красавіка

«...НЕ ВЕДАЮЧЫ МОВЫ,
САПРАЎДНЫМ БЕЛАРУСАМ НІКОЛІ НЕ СТАНЕШ»

Напісаць у любімую газету збіралася даўно, але ўсё неяк адкладвала...

Сёння ж, калі на яе старонках ідзе такая гучная размова аб стане роднай мовы, змаўчаць ужо не магу, не магу хаця б таму, што я адна з вельмі многіх вучняў, вучаніц выдатнага беларускага моваznаўцы і пісьменніка, чалавека вялікай душы і сэрца Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага, які ўсё сваё жыццё прысвяціў служэнню Мове. Гэта яго пяру належаць «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы», «Крылатыя словы і афарызмы», «Гістарычная граматыка беларускай мовы», «Само слова гаворыць», «Прыпыніся на часіну», «Радасць і боль», «З далёкіх дарог» і іншыя добрыя, мудрыя кніжкі.

Мы ліставаліся з ім. На святы ён заўсёды падпісваў мне арыгінальныя паштоўкі з партрэцікамі Ф. Скарыны, М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, прысылаў кнігі (свае і пра славутых людзей Беларусі), часопісы і газеты з цікавымі артыкуламі. Я ж, як магла і ўмела, чым-небудзь дзячыла: віншавала з юбілеямі праз радыёперадачу «Жадаю вам», сяды-тады высылала пасылачкі з вясковымі прысмакамі... Апошняе маё пісьмо з маім артыкулам у раёнцы «Няхай жыве родная мова» яму чытала ўжо яго верная спадарожніца Серафіма Андрэеўна...

Сёлета 13 лістапада споўніцца 20 гадоў, як Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі пайшоў з жыцця. А найгалоўнейшы боль і клопат яго — усё жыве. Сведчаннем таму і дыскусія вакол «Спадарыні...». Нізкі паклон і газеце, і ўсім яе аўтарам-чытачам за дасведчанасць, за пераканаўчасць, за рашучае жаданне бараніць сваё, не шкадуючы сіл. І адстаяць!

Я родам з Капыльшчыны, з сялянскай сям'і. Скончыла гісторыка-філалагічны факультэт педінстытута імя М. Горкага (цяпер педуніверсітэт імя М. Танка), працавала выхавальніцай дзіцячага дома, школы-інтэрната, выкладала мову і літаратуру (беларускую, рускую, нямецкую), гісторыю і грамадазнаўства, 24 гады была намеснікам дырэктара школы. Мела запрашэнне на паступленне ў аспірантуру, але адмовілася, таму што хацела, як той любімы герой Андрэй Лабановіч з трылогіі «На ростанях», вучыць роднай мове вясковых дзяцей. Вучыла, нялёгкай гэтай справе аддала ўсё сваё свядомае жыццё. Што ж на фінішы? Ды, як ні балюча гэта прызнаць, усцешнага мала — не чутно нідзе нашай беларускай, праўду пісала адна з чытачак: каб не радыё, дык і насамрэч забыўся б, у якой краіне жывеш. Там яшчэ — дзякаваць стваральнікам — ёсць «Моўная хвілінка» і «Роднае слова», ёсць «Помні імя сваё» — перадача, якая кранае душу не толькі зместам (доўгі час я жыла надзеяй пачуць там прозвішча бацькі, што прапаў без вестак), але і добрай мовай.

Залішне будзе казаць, што я вельмі люблю яе, што ўсюды і заўсёды стараюся і пісаць, і размаўляць толькі на ёй. Нават тады, калі вельмі цяжка. Але ж...

Лячылася неяк раз у санаторыі, адчувала сябе вельмі кепска. А тут — свята надыходзіць, Дзень настаўніка. І просяць мяне выступіць. Спачатку адмовілася, казала, што мне цяжка нешта гаварыць на публіку. Але ж потым падумала, што маё выступленне можа стаць прапагандаю роднага слова, і згадзілася. Знайшла, што сказаць, прадумала, як, прачытала верш аднаго з любімых сваіх паэтаў Сяргея Грахоўскага «Народная настаўніца», потым два свае, невялікія...

Не чакала, што будзе такая ўвага, што пасля выступлення да мяне будуць падыходзіць зусім незнаёмыя людзі, будуць дзякаваць, што я стану, можна сказаць, самым знакамітым чалавекам у санаторыі. Ужо назаўтра са мной усе хораша віталіся, а некаторыя мужчыны нават галантна цалавалі руку, гаварылі камплімenты. У тым ліку — нашай мове. Маўляў, вельмі ж хораша гучыць! І шкада, што так мала людзей на ёй размаўляе.

А летась мяне запрасілі ў сталіцу на вяселле пляменніцы. Зноў жа (хай прабачыцца!) рашыла скарыстаць яго, гэтае вяселле, яшчэ і для прапаганды роднага слова. Так і гаварыла, што віншую маладых са шлюбам, што ён, у адрозненне ад рускамоўнага «брак», ад роднаснага «любіць», «любы», «любая», «любоў». І таму перш за ўсё я жадаю маладым любові, без якой не бывае добрай, трывалай сям'і. Далей ішлі вершаваныя пажаданні.

І зноў мяне (найперш мову!) зачаравана слухалі, зноў грымелі апладысменты. Што самае цікавае — людзі падыходзілі і, просячы прабачэння за памылкі, таксама гаварылі са мной па-беларуску.

Выступала я і на свяце вёскі (цяпер яны сталі традыцыйнымі), на пахаваннях сваіх землякоў, па-беларуску пастаралася падпісаць і сціплы помнік маме. Пакуль на вясковых могілках ён, вось гэткі, адзін. Але ж папрашу, каб так падпісалі і мой. Завяшчанне я яшчэ не напісала, а «Запавет» — вось:

Як памру, то завязіце
На грудок высокі,
Каб мне бачыць ясна неба,
Сінія аблокі.
Як пабачу, пахавайце
Ля маёй матулі —
Пры дарозе, пад бярозай,
Каб мне чуць зязюлю.
І прыходзьце, хоць зрэдчасу
На грудкі-магілы.
Успамінайце добрым словам:
Мы дабру вучылі.

А яшчэ — любові да людзей, да зямлі, да радзімы. Не ведаю, як іншыя, а я вершы і песні пра любоў да Беларусі на рускай мове катэгарычна не прымаю — я ім не веру і ўсё! У адной вось, напрыклад, спяваюць:

Светлоглазые, светлорусые,
Белорусы мы, белорусы мы,
Белорусы мы, белорусы мы.

Ды хоць сто разоў (мне так здаецца) праспявай гэтае «белорусы мы», а не ведаючы мовы, сапраўдным беларусам ніколі не станеш! Затое, як жа прыгожа гучыць зусім просценькае (нядаўна пачула па радыё):

Бела-беларусачка,
Бела-беларусачка,
Мілая спадарыня.

Яна — і мілая, і спадарыня — упэўнена, застанецца, не толькі ў вершах і песнях — запануе ў побыце. У тым ліку дзякуючы любай «Звяздзе», яе журналістам і яе чытачам, якія, насуперак усяму, «помняць імя сваё». З вялікай радасцю я заўсёды слухаю песні на словы майго земляка з Капыльшчыны Адама Русака: «Толькі з табою», «Не шукай ты мяне», «Бывайце здаровы» і многія іншыя. Іх нельга не спяваць, іх нельга не любіць. Гэта шчасце, што ў нас нарэшце з'явіўся новы беларускамоўны міністр культуры. У дзень прызначэння мне нават званілі калегі пыталіся: ці чула навіну? Я казала, што чула, чытала і вельмі рада, што цяпер буду чакаць і нейкіх зрухаў у бок беларушчыны, і таго, што загаворыць па-беларуску міністр адукацыі, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі. Менавіта ім трэба падаваць прыклад іншым.

І апошняе. Дыскрымінацыя нашай роднай мовы пачалася не ўчора. Пра яе я пісала ў раённую газету, выступала на нарадзе з удзелам прадстаўніка Міністэрства асветы. На жаль, не была пачутай. І думаю, каб мы, ды ўсе, больш гаварылі і крычалі, а не маўчалі, дык мо і не мелі б сёння таго, што маем.

Ганна Іванаўна ВЕРАМЕЙ,
в. Языль, Старадарожскі раён.

P.S. *Прабачце: напісала — быццам у царкве паспавядалася, нават лягчэй крышку стала.*
І з гэтым памерці гатова:
Не марна жыццё пражыла.
Каб толькі была наша мова,
Краіна валошкай цвіла!

Васіль ТКАЧОЎ

ПРА ВАЙНУ

Апавяданне

НЕ, я не хадзіў тады яшчэ нават у школу, калі ў нашай вёсцы зрабілі брацкую магілу, а потым паставілі на ёй помнік салдату. Я, відаць, быў яшчэ у той час зусім малы, бо не помню нават зусім таго дня. Помню толькі, што помнік той з'явіўся перад маімі вачыма неяк адразу, нечакана, не было не было яго, і раптам — вось ён перад табой: глядзі, хлопчык, гэта салдат. Чаму ён такі вялікі і суровы — даведаешся пазней. Гэта цяпер я разумею, што ў жыцці чалавека настае той момант, калі ён нешта заўсёды пазнае і запамінае ўпершыню.

Хадзіў, вядома ж, каля таго помніка я і раней, калі, мабыць, мама вадзіла мяне яшчэ за руку, а мо я трымаўся за яе падол. Хоць помнік і быў, але я не бачыў яго — не бачыў так, як трэба было бачыць: не дарос. Усяму, сапраўды, свой час. А ўжо калі быў вучнем, мы штогод прыходзілі да помніка ў Дзень Перамогі, нехта са старэйшых абавязкова расказваў пра вайну, а мы чыталі вершы — таксама пра вайну. Даверылі і мне аднойчы прачытаць на памяць верш, аднак я схібіў, не дачытаў яго да канца: расплакаўся. Мяне супакоіла настаўніца Вольга Кандратаўна і выцерла мне сваім насавіком слёзы. Я даў сабе слова больш не пускаць слязу, калі буду чытаць зноў верш на наступны год, але мне не далі больш яго, — ні на наступны год, ні пазней. Былі ў нас чытальнікі, якія не плакалі. Яны і дэкламавалі. Няхай. А я тым часам, пакуль яны расказвалі, чытаў прозвішчы салдатаў, што былі выбіты на помніку, і мне так іх было шкада, што я румзаў яшчэ мацней, але ўсе глядзелі на таго, хто чытаў верш, і мяне не заўважалі. Гэта і добра, што не заўважалі: няма чаго выстаўляць слёзы напаказ.

Помнік добра быў відаць з акна нашай хаты, і я, калі рабілася сумна, падоўгу глядзеў на салдата. І хоць ён адвярнуўся ад мяне і я бачыў толькі шырокую спіну, я ўсё адно бачыў яго вочы, і так шкадаваў, што глядзіць ён уніз, ніяк сабе пад ногі, а мне вельмі хацелася, каб азірнуўся ён на нашу новую школу, на нашу хату, якую пабудавалі мае бацькі замест той, што згарэла ў вайну. Ды багата чаго мог бы ўбачыць салдат, каб павярнуўся: і ферму, і млын, і кузню...

— Ён, сынку, усё бачыць, не хвалюйся, — суцяшала мяне мама, калі я сказаў ёй пра тое, што непакоіла.

Хоць я і не разумеў, як ён бачыць, калі стаіць спінай да ўсяго, але пагаджаўся з мамай: мамы ўсё ведаюць. Ды і не толькі мамы — таты таксама, а калі паслухаць майго, то без яго б і зусім не было брацкай магілы. Не раз і не два апавядаў ён мне, калі трохі падрос, як збіралі яны, вяскоўцы, косці дзе толькі можна было і звозілі на пагорак, дзе меркавалася быць брацкая магіла. За вёску ішоў цяжкі бой, шмат было забіта салдатаў, і самі ж салдаты хавалі тых, хто загінуў. У іх, аказваецца, была свая пахавальная каманда. Але калі ім там было глыбока капаць ямкі, і калі прайшоў час, дажджы і веснавыя ручаіны размылі пагрбенні. І яшчэ плугі, калі пачалі апрацоўваць людзі зямлю, пачалі натыкацца на косці.

— У нас тады спрэчка адбылася, — прыгадваў тата, — па такім пытанні. Трапляліся і конскія косці, іх звозілі разам... І хацелі таксама закапаць з салдацкімі: маўляў, і яны ж, коні, ваявалі, як і людзі... Няхай побач спяць людзі і коні. Чубіліся ажно. Але перамаглі тыя, хто быў толькі за салдатаў. Конскія косці пахавалі асобна, за вёскай. Правільна, безумоўна, зрабілі. А ты як думаеш?

Я тады, відаць, толькі пашкадаваў, што коням не ставяць помнікаў.

❑ ❑ ❑

— Хавошка і Наталля ідуць ужо да сваіх хлопцаў, — мама паглядзела ў акно і ўбачыла на дарозе, што цягнулася пад горку, жанчын, якія з вузельчыкамі нетароплівала, пытаючыся ў бацькоў: я хавошая?) і Наталля былі ўжо амаль каля помніка. Так ішлі яны і тады, калі я, зусім яшчэ маляўка, праскраўся ўслед за імі да помніка, схаваўся ў кусце бэзу, сядзеў, не дыхаючы: мне карцела ведаць, што будуць рабіць там жанчыны. Яны ж расклалі на хустцы ежу, запомніў толькі, што былі там чырвоныя яйкі, селі перад хусткай на мурог, наліялі ў чаркі самагонкі з нейкай трафейнай зялёна-сіняй бутэлькі: дзве для сябе, дзве — для сваіх мужоў, якія не прыйшлі з вайны. Паднялі свае чаркі.

— За вас, хлопчыкі, — сказала Хавошка. — Чуеце вы там нас хоць ці не?

— Вядома ж, чуюць, — больш упэўнена прамовіла Наталля. — Як гэта не чуюць? Чуюць, яны чуюць нас, дзеўка!..

Хавошка нічога не адказала, а працягвала гаварыць далей:

— Прыйшлі вось мы з Наталляй вас праведаць. Заадно і пагаманіць, пра сваё жыццё расказаць.

— А, можа, пра наша жыццё не трэба? Няхай спяць яны спакойна там... пад зорачкай, — насупілася Наталля.

Хавошка на гэты раз не пагадзілася:

— А каму ж нам тады яшчэ расказаць, як не ім? Ды і навошта тады ішлі сюды? Слёзы свае паказаць хіба толькі?.. Навошта ім нашы слёзы?

Наталля змоўчала.

— Жывём мы добра...

— Так-так-так, — гэтыя словы Хавошкі спадабаліся Наталлі, яна затрэсла галавой, падбіла пасмачку валасоў пад чорную хустку.

— Жывём мы добра, — паўтарыла тое ж самае Хавошка. — Вось і Наталля пацвярджае...

— Пацвярджаю. А як жа.

— Сёлета разжыліся на парсючкоў, я і Наталля. Без тлушчу цяжка, адна бульба ў рот не лезе. Яшчэ каб кароўка была, то і зусім бы гора не ведалі. Нам бы хоць адну на дваіх...

— Скажы, скажы майму, што Васілёк ужо ўлетку працадні зарабляе ў калгасе — каня водзіць, — папрасіла Наталля.

Хавошка надзьмулася:

— А сама хіба не можаш? «Скажы Хавошка, папрасі Хавошка». Я памаўчу, кажы ты.

Наталля не адразу пагадзілася, але ўжо калі набралася смеласці, рашучасці, сказала радасна і гучна:

— Мікола, а Васілёк наш каня водзіць, хлеб зарабляе!

І расплакалася. Хавошка пачала яе супакойваць, але, здагадаўшыся, што не дасць ёй рады, працягвала далей:

— Жыта сёлета кусціцца хораша, снапы павінны быць добрыя, то найму людзей, няхай хатку перакрыюць. Печ яшчэ тая, што пры табе зроблена была, Пятро. А што ёй, печы, зробіцца? На яе не капае, Ну што, дзеўка, ці не пара нам? А то вунь — чуеш? — школьнікі ў горан дзьмуць і барабаняць... Скора будуць... Прыбраць трэба скацёрку... Ды пастаім, паслухаем школьнікаў... Там і Пецька мой...

— І мой Васілёк прыфранцыўся ў новыя парткі і сандалеты... Сам на сябе зарабіў... Давай, давай, маладзіца, прыбіраць... Затыкні бутэльку, затыкні, каб не вылілася смала тая. Можа, Мітрафан з гармонікам прыйдзе, як той раз. Тады зноў пасядзім пасля дзяцей, песні паспяваем для сваіх хлопчыкаў...

Калі падрос, мне было соромна, што я сядзеў у кусце і падслухоўваў салдацкіх удоў. А тады я радаваўся, што чуў яшчэ нешта пра вайну... Слухаў і радаваўся... Ці не блазнюк, га?

❑ ❑ ❑

На школьным двары было людна. Дзяўчаткі старэйшых класаў рвалі кветкі на клумбах, рабілі букеты і ўручалі іх кожнаму ахвотнаму. А такіх было многа. Іван Іванавіч, дырэктар школы, больш займаўся тым, што не адпускаў ад сябе кіраўніка групы піянераў, якія прыехалі з Эстоніі на свята: тут, у брацкай магіле, пахаваны іх земляк. Прыехалі яны ўчора, засветла, таму паспелі пазнаёміцца з вёскай, пабывалі і каля помніка, а начавалі па хатах: ахвотных прыняць «інастранцаў» знайшлося шмат. Аднак на другі дзень па вёсцы папаўзлі чуткі, што гэтая замежная малеча паводзіць сябе з пагардай, грэбуе ежай, фыркае, не падабаліся ім нават прасціны ў асобных паспадароў; хаця прасціны як прасціны, ежа як ежа.

Аднак на школьным двары было не да гасцей, кожны займаўся сваёй справай. Настаўнік гісторыі і стваральнік музея баявой славы Мікалай Кірылавіч паказваў месца кожнаму класу, дзе той павінен стаяць, пацікавіўся, ці ўсе, каму трэба выступаць, гатовы. Упэўніўся: усе. Крыху ў баку ад дзятвы стаяў Мітрафан з гармонікам, яму якраз ад хаты бліжэй праз школьны двор да помніка, таму затрымаўся, рашыў панаэіраць за жыццём. А тут і каманда: «На пра-ву! Шагам-арш!..» — каманду падаў гісторык, ён тут кіраваў парадам, а дырэктар і госць з Эстоніі пайшлі да брацкай магілы напарадзе, трымаючы ў руках кветкі. За імі — гарніст і барабаншчык, а там і ўсе.

Мікалай Кірылавіч ішоў збоку, наглядаў, каб калона не дужа расцягнулася. Хаця калонай назваць вучняў гэтай невялічкай, памяраючай школкі, якіх спрасаваў у адно цэлае гісторык, можна было толькі з вялікай нацяжкай: у класе засталося па сем-восем чалавек, аднак усе хлопчыкі і дзяўчаткі ішлі да брацкай магілы з вялікай гордасцю, з адчуваннем сваёй значнасці і годнасці ў гэтым свяце, да якога рыхтаваліся не адзін дзень.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

У малога патніца? Дайце яго скуры «падыхаць»

36,6°

Патніца — часты спадарожнік маленькіх дзяцей летам. Чым яна небяспечная і як ад яе пазбавіцца?

Патніца — гэта захворванне скуры, выкліканае ўзмоцненым потааддзяленнем. Выглядае як россып ружовых плямак або пухіркоў, напоўненых празрыстым смесцівам, якія часцей за ўсё размяшчаюцца на спіне, шыі і плячах малога, а таксама ў пахвінных і падпахавых упадзінах.

Патніца можа праявіцца ў любую пару года, але летам яна ўзнікае значна часцей, бо яе асноўны правакатар — пераграванне. Адбываецца закупорка потавых залозаў, і пот ужо не можа выходзіць на паверхню скуры. Нярэдка патніца з'яўляецца падчас хваробы, бо пры павышанай тэмпературы дзіця моцна пацее. Дробныя пухіркі высыпаюць і на ягадзіцах пад падгузкамі.

Сама па сабе патніца не страшная і часта не парушае самаадчування дзіцяці, аднак яна робіць скуру ўразлівай да розных інфекцыйных працэсаў, «адкрываючы вароты» мікробам.

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫ ДЗІЦЯ АД ПАТНІЦЫ?

Лепшая дапамога пры патніцы і яе ж прафілактыка — правільны гігіенічны догляд дзіцяці. Перш за ўсё, далікатную і лёгка ранімую скуру малога трэба трымаць у чысціні. Абавязковыя працэдуры: паветраныя ванны, падмыванні і купанне. Неабходна па некалькі разоў на дзень распранаць малога і даваць яму пабыць галышом. Але толькі не на скразняку і не пад прамым уздзеяннем сонечных прамяняў!

Дзіця варта купаць кожны вечар перад сном, а ў спякотнае надвор'е для прафілактыкі патніцы трэба павялічыць колькасць водных працэдур. Раніцай і ўдзень дазвольце малому паплюхацца ў вадзе з любімымі цацкамі. У ваду можна дадаваць слабы раствор марганцоўкі або адвары супрацьзапаленчых траў — шалфею, рамонку, ваўчкоў, мяты, кары дуба. (Аднак з травянымі ваннамі варта быць асцярожнымі ў сувязі з шырокім распаўсюджваннем алергічных рэакцый у дзяцей.) З прафілактычнай мэтай на складкі на целе малога можна наносіць тальк або крухмал. Апошнія ўбіраюць лішнюю вільгаць і пот, перашкаджаючы развіццю патніцы. (Памятайце, што тальк спачатку наносіцца на руку, а затым размяркоўваецца па целе дзіцяці. Непасрэдна на скуру малога тальк насыпаць нельга. Яго пападанне ў лёгкія небяспечнае.)

ЯК СУЦІШЫЦЬ СВЕРБ?

Эфектыўны содавы кампрэс. Для яго прыгатавання спатрэбіцца шклянка гатаванай вады пакаёвай тэмпературы і чайная лыжка соды. Усё добра перамяшайце, намачыце ў растворы марлю, складзеную ў некалькі слаёў, адцісніце і прыкладзіце да пашкоджанай скуры. Соду можна таксама дадаваць у ванну пры купанні.

Калі ж сып не знікае, з'явіліся элементы з белавата-жоўтым змесцівам, неадкладна звярніцеся да доктара, які вызначыць дакладную прычыну пагаршэння стану малога і прызначыць медыкаментозныя прэпараты.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

«Некалі Алёны мылі ручнікі, а цяпер пра гэта дбаюць мужыкі...»

Хто каго?

Што было — было (калі не падманваюць): новы беларус, багатыр, сваё дзяцінства рашыў успомніць — устаў да сонейка, узяў нейкую наварочаную вудачку, пайшоў на бераг, начапіў на кручок чарвячка...

Адзін раз закінуў яго ў Чорнае мора — нічога, другі — таксама, трэці — рыбка! І залатая! Кажа яму чалавечым голасам: «Адпусці мяне, браце... Выканаю любое тваё жаданне». Мужык патыліцу пачухаў: «Ды няма ў мяне, — кажа, — ніякіх жаданняў. Усё, што хацеў, купіў. Хіба што... Ведаеш, рыба, — няма ў мяне зоркі героя. Пакуль...». «Не пытанне, — шэпча яму палонніца, — адпусціш — будзе». І хвастом віль-віль, бо ў вадзе ж апынулася! А мужык — і ў той жа момант — у... акопе... З апошняй гранатай... А вакол яго «тыгры» нямецкія. «Э-э, рыба, — не сваім голасам закрычаў «герой», — мы так не дамаўляліся! Я ж не пасмяротна ў цябе зорку прасіў». Пракрычаў гэта і прачнуўся. У халодным поце. Бо страшна.

Страшна (ну само сабой, кожнаму) траціць жыццё і здароўе, грошы, багацце (якое ні ёсць), волю, дах над галавой, камфорт... А вось гэты мужык са здымка (па меркаванні Валерыя Гаўрыша з вёскі Навасёлкі Пастаўскага раёна), можна сказаць, галоўнае страціў — жонку. Як? Ды дурны быў — прыходзіў дадому і крычаў: «Ну што — нагулялася? Цэлы дзень без работы сядзіш!..». Збрыдзела ёй расказваць, што яна рабіла, чым займалася, сабрала манаткі і дамоў, да бацькоў — на той бераг. А мужык цяпер сам і дзяцей корміць, і гаспадарку вядзе, і адзежу мые. Жонка, бедная, з таго берага (бачыце — удалечыні?) толькі пазірае на яго ды часам пяе:

Ты плыві, плыві, плыві
Уніз па рэчцы, лодачка.
Без мяне ты пажыві,
Сокал мой, Валодзечка.
Мо адчуеш смак яды,
У бульбе паўпіраўшыся?
Можа, зведаеш тады,
Як я «нагуляўшыся»?

Не зашкодзіць мужыку... Далібог! Пра што — «каб лепш, дык навошта» — піша другі наш пастаянны аўтар Міхаіл Паўлавіч Дубовік з вёскі Арэшкавічы Бярэзінскага раёна:

Хто жанкам не спачувае —
Хай іх працы паспытае:
Пастаіш дзянёчак ракам —
Будзеш злосны, як сабака!

А нельга ж, бо рынак цяпер: чаго добрага... прададуць.

Не верыце? І дарэмна: не так даўно на ўласныя вочы аб'яву ў газеце бачыла — маўляў, прадаецца шматфункцыянальнае прыстасаванне. Называецца — «Жанчына». Вартасці: можа прыбіраць, гатаваць, кахаць, капаць, зарабляць, шыць, мыць, прасаваць. Недахопы: шумавое забруджванне, паступовы знос, можа рыпець. Кошт — дагаворны»...

Мужыка там, дарэчы, таксама прапаноўвалі — адна жанчына другой... Тая аж вушам не паверыла. Кажа: «Чаму прадаеш? Ён што — надзіманы?». «Не! Сапраўдны, жывы!.. А толку — халера — як ад надзіманага!».

Зрэшты, што гэта мы? Так пра мужыкоў не трэба, бо ёсць сярод іх проста душкі! Прычым узорна-паказальныя. Вось палюбуйцеся (з «падачы» Вольгі Паўлаўны Лабажэвіч з Клецка):

Акуратны муж Сымон!
І шануе жонку ён:
Варыць, мые па суботах.
У сваіх рыбацкіх ботах...

Адкуль абутак такі ? Ды купіў, бо ён — апроч іншага — яшчэ і рыбак. Прычым адмыслovы:

Шчупака лавіў, стараўся;
Ад натугі аж... (сарваўся, папаўся).
Але жонка хай не ные —
Сам штаны свае памые.

Што, безумоўна ж, добра. Іншае пытанне, дзе? Ну, ён будзе мыць іх...

Адказ — у тым жа канверце з Клецка:

Працавіты ў нас народ.
Ды сляпы, нібыта крот:
Далей носа ніц не бачыць —
Там, дзе мые, там рыбачыць.

Што, безумоўна ж, няправільна!

Апроч Вольгі Паўлаўны сцвярджае гэта (і як!) Уладзімір Сітнік са Старадарожчыны:

Ледзь прыцёг няўломак Казік.
Да ракі звычайны тазік.
Што ж у ім? Адно — шкарпэткі.

Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

Іх ён мыў — штогод, улетку.
І збіралася там бруду —
Без дурных — не меней пуду...
А ўжо што было смуроду...
Так і губім мы прыроду.

Шчасце, што цяпер спецыяльныя інстанцыі ёсць, якія берагуць-ахоўваюць яе, якія, калі што, могуць і за руку злавіць. З усімі адсюль наступствамі, пра якія рыфмаваным радком піша спадарыня Чыгрынава з в. Забалацце Вілейскага раёна:

Ото ж Ясь набраўся страху —
Уцякаў — стралой — ад штрафу...
І цяпер з усмешкай горкай
Бач, палошча... свае порткі.

Дарэчы, ад яе ж, ад Любові Міхайлаўны, і мудрая заўвага:

У чароце ля ракі
Заспявалі кулікі:
Каб сваё гняздзечка звіў,
У машыне б порткі мыў.

Што казаць — прасцей з ёй — асабліва — з «аўтаматам»: адзежу, бялізну ў барабан закінуў, парашку дадаў, адну-другую кнопку націснуў — і галава не баліць: усё памыецца, папалошчацца, выкруціцца. Застанецца толькі павесіць. Прагрэс! Вось бы ў кожную хатку яго: кожнай гаспадыні па пральнай машыне, каб разагнулася, каб не «злавала, як сабака».

Ці хаця б па Сымону, гэта значыць, па мужыку, які б мог паспагадаць, падставіць сваё дужае плячо, каб, хоць месцамі, хоць зрэдчас, а спраўджвалася ідылічнае, «намаляванае» спадаром Федаракам са Скідзеля:

Некалі Алёны мылі ручнікі,
А цяпер пра гэта дбаюць мужыкі:
Лета, надвячорак, беражок Усы...
Мые дзядзька Зосім
жончыны трусы.

Мяркуючы па іх (калі ласка, кіньце вокам на здымак) не слабая ў дзядзькі жонка! Ё мужыку што ў рукі ўзяць, ёсць што выкруціць!

Хоць яны гэтага і не любяць. Пра што (як раней казалі, ад імя і па даручэнні) пішуць сужэнцы Астроўскія з Мінска:

Здымак, быццам, Клешчука...
Ды пацехі мала,
Калі жонка мужыка
Паласкаць паслала.

Хоць, здавалася б, што тут такога — па сённяшнім часе магла б і далей... Паласаць. І пайшоў бы... Як піша спадар Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна:

Падаўся б самотны
На пошукі шчасця
У бацькавых ботах
І з дзіўнаю снасцю.

Такой, сапраўды, цяпер рыбы не наловіш. А тым больш вялікай.

Дарэчы, заўважалі — рыбакі, калі хваляцца ўловам, рукі ўшыркі разводзяць. І ведаеце, хто перамагае ў паказе пра найбольшую рыбу? Той, у каго рукі даўжэйшыя. Усё элементарна. Пра тое ж, элементарнае, відавочнае, і радкі Зоі Пятроўны Янучок з вёскі Нагорнае Клецкага раёна. Яна, не інакш, песню ўспомніла — пра той бераг (Малінін спявае). Ну і выдала... З прыпевам:

Ходзіць Ваня
на змярканні
Да знаёмай рэчкі,
Порткі мые, успамінае
Любыя сустрэчкі:
«Вунь на тым беражку
Мая Маня жыве,
Мо і зараз бяжыць
На спатканне ка мне?...
Але кладка сплыла
Па халоднай вадзе...».
І працуе мужык...
І насустрач не ідзе!

Вось такая трагедыя. У Мані. Ды і ў мужыка. Без яе. Дакладней, безумоўна ж, без іх, дзяўчат і жанчын, бо

Халастыя варты жалю...
Ды куды ж падзецца?
Дзеўкі ў горад паз'язджалі —
Там лягчэй жывецца.

У нейкім сэнсе праўду піша Міхаіл Паўлавіч Дубовік з Бярэзіншчыны: у горадзе, прынамсі, кладку не зносіць, гаспадаркі няма, градаў, барацьбы з фітафторай і каларадскім жуком. А з іншага боку —

З горада ў вёску
Едзем мыць бялізну,
Хоць зусім не блізка —
Сто кэмэ прыблізна.
Можа, мы здурнелі?..
Маем досвед горкі:
Тут — вада з крынічак
І зусім без хлёркі, —

прызнае Віктар Федарака са Скідзеля. А наогул —

Можа так задумаў Божа?
Можа час настаў такі —
Дзе няма ў кішэнях грошай,
Там адны халасцякі.

Трапная заўвага (аўтар — зноў жа спадар Дубовік)! Хоць і сумная. А халасцяк, між іншым (калі ён халасцяк — гэты мужчынка са здымка?), — прыгожы. Кабетам толькі адрас дай — заўтра тамака будуць. І не паглядзяць — з грашыма, без грошай — застануцца, альбо яго з сабой павязуць...

А далей бабка, як мяркуе спадар Старых з Гомеля, надвое варажыла:

Гэты хлопец-небарака,
Мусіць, нейчы ён прымака,
Што ў жонкі не зрэдчасу
«Кватаруе» пад абцасам?..
Не, мужчына ён нармальны
І... узорна-паказальны:
На сябе ўзяў паласканне:
Жонка — толькі для кахання.

Вось як бывае! Бо

У азёрным краі нашым
Хлопцы — удалыя:
Самі звараць суп ды кашу...
І бялізну мыюць, —

піша спадар Гаўрыш з Пастаўшчыны. І дадае: каб яны яшчэ і гарэлкі не пілі...

Але пра гэта мы пагамонім іншым разам. А зараз на развітанне яшчэ адна ўсмешка — з канверта, да конкурснага здымка, ад спадара Федаракі:

У суботу ранкам,
Ды такім пявучым
Выйшаў Клаўдзін Янка
Паласкаць анучы...
Рыбак глузду не дае:
Чаму рыба не клюе?

Што і казаць — многа вакол таемнага, незразумелага. Але ж калі варушыць мазгамі, калі думаць і назіраць, раіцца з мудрэйшымі, чытаць іх кніжкі ды яшчэ і пісаць — непазбежна паразумнееш. Што і назіраецца, без перабольшвання, за ўсімі ўдзельнікамі конкурсу. Таму — далучайцеся (здымак дадаецца). А мы падвядзём вынікі папярэдняга этапа (нагадаем — на здымку тады сюжэт не толькі вясёлы быў, але і вясельны — хлопец хлопца на руках трымаў...) То лепшыя радкі пра іх, па меркаванні вялікага чытацкага журы, склалі спадарыня Лабажэвіч з Клецка, Васільева з Гомеля, Малевіч з Мядзельшчыны, Тарасік з Мінска, спадары Гарачоў з Іўеўшчыны, Гаўрыш з Пастаўшчыны, Старых з Гомеля, сужэнцы Астроўскія з Мінска... З чым пагадзілася і журы маленькае — рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на чацвёрты квартал застаецца ў Мінску.

Вось і ўсё. Калі не лічыць нашай шчырай удзячнасці ўсім, хто напісаў. І гэткіх жа шчырых прабачэнняў тым, чые радкі не змясцілі. Па-першае, выбіралі самыя-самыя, па-другое... У тэксце прозай слова (словы) можна папраўіць, а то і замяніць, у вершаваным — цяжка, бо, як вы разумееце, разбурацца «ўся канструкцыя». Таму просьба да кожнага з канкурсантаў — перш, чым заклеіць канверт, яшчэ раз прачытайце тое, што напісалася, яшчэ раз праверце. Поспехаў вам! А нам — хочацца верыць — задавальнення ад чарговага агляду конкурснай пошты.

Валянціна ДОЎНАР.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

РАПТОЎНАЯ АТАКА

Аўтарскі конкурс-8 працягваецца заданнем № 11 майстра спорту Пятра Шклудава (Наваполацк):

Белыя: a1, a3, b4, c3, e1, g1, g3, h4 (8). **Чорныя:** a5, b6, d2, d6, e3, e5, f4, f6, h2 (9). Выйгрыш.

Па-за конкурсам разгледзьце яшчэ тры яго камбінацыйныя праблемы:

№ 1. Белыя: b4, c3, c5, d2, d4, g1, h2 (7). **Чорныя:** a3, a7, b6, d8, f4, g3, g5, g7, h4 (9).

e5 (f6) e3 (c5) cd4, b6, e1 (g3) e7, f2x.

№ 2. Белыя: a1, a3, a7, b2, d2, f6, h2, h6 (8). **Чорныя:** b4, b6, c5, d4, d8, f2, f4, f8, h4, h8 (10).

bc3, c7, e7, g7, a3, g1 (b2 A) c3, g3, c5x. A (g3) f4 (b2) c3, f4, f2x.

№ 3. Белыя: a1, c3, d2, f4, f6, g3, g5, h4 (8). **Чорныя:** a3, a5, b4, c5, c7, d6, g7, h2, h8 (9).

Перавага белых. Пераканайцеся ў гэтым самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

А ў рамках **бліца-49/1** развяжыце 100-клетачную канструкцыю 7 на 8:



Белыя: 10, 16, 31, 43, 46, 48, 50 (7). **Чорныя:** 8, 12, 13, 26, 28, 37, 40, 42 (8). І тут белым дапамагае раптоўная атака.

Тэрмін для адказаў — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

**ВЫНІКІ Б

ПРА ВАЙНУ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

— Падцягнуцца-а! — папрасіў голасам ротнага старшыны гісторык, і калі дзеці падцягнуліся, падабралі нагу, то было відаць, што Мітрафан з гармонікам значна адстаў...

Але ён стараўся, як мог, тэпаць услед за ўсімі кірзовымі чобатамі.

❑ ❑ ❑

Тупаценне дзіцячых ног было далёка чуваць. Калона ішла пад гукі горна і дробны стук барабана.

— Ужо блізка, — падняла галаву ў бок дарогі, што вяла ад школы, Хавошка. — Дзе гэта нам, дзеўка, тут стаць так, каб нікому не перашкаджаць? Каб не таптацца пад нагамі... Давай выйдзем за агародку, ага?

— Ага. Давай. Пачуем, што будуць казаць. Не глухія.

Неўзабаве калона была ўжо каля помніка, не прымусіў сябе доўга чакаць і Мітрафан, ён стаў побач з Хавошкай і Наталляй, павітаўся, а потым, бы незнарок, адным вокам зазірнуў у клуначак, які трымала Наталля: там у шчылінку каля вузельчыка ўбачыў рылца бутэлькі, задаволена хехекнуў і папрасіў тых не разыходзіцца пасля ўсяго. Хаця пра тое ж самае яго хацелі папрасіць і жанчыны. Жаданні супалі, і яны, навастрыўшы зрок, пачалі ж тады сумленне? Не, не, не ў яго характары такое, і не прасіце, людзі добрыя!..

Так і сказаў дырэктару:

— Я ж не быў на вайне... Даруйце... Прабачце... Калі што не так...

Не менш чым хвілінай раней Мітрафан, разгубіўся і сам дырэктар. Ён паглядзеў спярша на людзей, і тыя не маглі не заўважыць, што адчувае сябе Іван Іванавіч крыху ніякавата, аднак потым быццам знайшоўся і папрасіў Мітрафана сыграць для ўсіх франтавую мелодыю. На выбар. Пачуўшы пра такую просьбу, у Мітрафана засвяціўся твар, а неўзабаве пальцы пабеглі па гузіках гармоніка... Ён іграў і спяваў:

Ты ждешь, Лизавета,
От друга привета,
Ты спишь до рассвета.
Все грустишь обо мне.
Одержим победу,
К тебе я приеду
На горячем боевом коне.

І непрыкметна Мітрафану пачалі падпяваць. Спярша дырэктар, потым госць з Эстоніі, гісторык, калгаснікі, школьнікі.

Хавошка лёгенька, нібы забаўляючыся, варсанула у бок Наталлю, а калі тая зірнула на яе, сказала сур'ёзна і патрабавальна:

— *А ты чаго? Не адставай!..*

Над вёскай плыла песня:

Приеду весною,
Ворота открою,—
Я с тобой, ты со мною
Неразлучны навек,
В тоске и тревоге
Не стой на пороге,
Я вернусь, когда растает снег!..

Ці тое ад таго, што жанчыны перад гэтым выплі па кроплі, ці з якой іншай нагоды, але іх галасы вылучаліся ў гэтым стыхійным людскім хоры... Нават Мітрафан прыцішыў свой барытон: бяжыце, бяжыце наперад, дзеўкі, няхай ведаюць усе, што вы ёсць, што жывяце, не скарыліся нягодам... Я ўжо за вамі буду. Так і быць.

❑ ❑ ❑

Каля помніка неўзабаве зрабілася ціха. Свята пакацілася ў бок школы. Дзеці, расчуленыя ад убачанага і пачутага, расслабіліся, пачалі дурэць: вядома ж, ім хацелася паказаць гасцям з Эстоніі, што яны дома героі, а не абы-хто. Ім ніхто і не рабіў заўваг. Няхай пацешацца. Сёння — можна. Сёння такі дзень, калі, кажуць, і генералы штурхаюцца. Беспарадкава нехта калацію палачкамі па барабане, а ў горан таксама хацелася падзьмуць кожнаму, таму даносілася сюды, да помніка, нейкая бяссэнсіца.

Для госця з Эстоніі святочны стол накрыла жонка Івана Іванавіча, іх дамок на тэрыторыі школы, туды ж запрасілі і гісторыка Мікалая Кірылавіча, але ён спаслаўся, што пакуль не можа, трэба прасачыць, каб у школьнай сталоўцы дзеці былі накормлены і напоены. «Я хутка! Пакуль вы там тое ды сёе, і з'яўлюся. На мяне не глядзіце». Іван Іванавіч здзівіўся: «Хіба там няма каму прасачыць?» — «А, і праўда!»

Каля помніка засталіся Хавошка, Наталля і Мітрафан. Жанчыны зноў расклалі на абрусе ежу, паставілі пачатую бутэльку гарэлкі — гэта раней, калі былі маладыя, прыносілі яны сюды самагон, цяпер яны гэтым не займаюцца: ёсць, дзякаваць Богу, за што купіць з заводскай этыкеткай. Мітрафан коса паглядзеў на спакусу, папытаў:

— І колькі ўжо год вы сюды прыходзіце, бабы?

Хавошка і не прыгадвала:

— А мне здаецца, што я тут і жыву. Пра Наталлю не скажу. Наталля, а ты?

— Кожны год прыходзім. Ці ж ты не ведаеш, Мітрафан? — напаўняючы чаркі, сказала Наталля.

Мітрафан уздыхнуў:

— Вам, бабы, помнік таксама трэба паставіць. За вернасць.

Утварылася паўза, і яе нарэшце пастаралася запоўніць Хавошка:

— Не трэба нам помнік, Мітрафан. А каб мужчына падвярнуўся варты майго, і выйшла б. Крывіць душой не стану. Хацелася мужыка. Але не было за каго ўчапіцца. Ды і ты вось на гармоні толькі рыпаеш, больш нічога не заўважаеш... А цяпер ужо позна. Што ўжо цяпер? Хаця пагаварыць можна, і тое весялей. Асабліва ўзімку. З катом усё жыццё і прагаманіла. З кароўкай. Цяпер вось — з казой... Так і жыву.

— Давайце выпʼем, — падняла сваю чарку Наталля.

Мітрафан падаў чарку Хавошцы, якая неяк паводдаль ад «стала» ўладкавалася на мурагу, затым узяў сваю чарку, ціха сказаў:

— За вашых мужыкоў, бабы. За ўсіх, хто спіць у гэтай брацкай магіле. За ўсіх!..

Выпілі. Пачалі закусваць, і Мітрафан раптам заплакаў. Жанчыны гэта заўважылі, здзіўлена пераглянуліся. Што гэта з ім? Мужчына крадком змахнуў слёзы, сам, не чакаючы, пакуль здагадаецца пра гэта Наталля, напоўніў сваю чарку, даліў жанчынам, якія амаль не дакрануліся да гарэлкі, падняў пітво, паказаў усім сваім выглядам: давайце, жанчынкі, моўчкі выпʼем, хопіць слоў, колькі іх было слоў, а карысці! Каб жа яны, словы тыя, ды спраўджваліся!.. Не ўстануць... Не падымуцца... Не вернуцца... Хоць крычы, хоць плач... Хоць што!..

На вачах Мітрафана зноў бліснулі слёзы.

— Мітрафан, з чаго б?.. — Хавошка паказала на ягоны твар.

Не ўсё, не ўсё жанчыны ведаюць пра вайну.

❑ ❑ ❑

Мітрафану Нямеччына ўспамінаецца часцей, чым што. Асабліва часта прыходзіць яна ў сны, і тады ён радуецца, што прачнуўся сярод ночы, хоць і разумее, што больш не засне. А сам пасля варочаецца ў ложку з боку на бок, на спіне ён зусім спаць не можа: пасля рудніка аслаблі лёгкія, на спіне задыхаецца.

І вось цяпер, каля помніка, Хавошка зачапіла тое, чаго ён больш за ўсё баяўся на свеце, хаця і здагадваўся, хаця разумеў, што людзі не дурні, усё ведаюць, чаму не пабраўся ён ні з кім шлюбам, так і пражыў бабылём Тым больш — гарманіст, тым больш — высокі, шырокі ў касці, прыгожы чалавек.

Гадоў колькі таму да яго прыязджаў з суседняй вёскі ягонага веку дзядзька, як яго зваць-велічаць, у вёсцы ніхто не цікавіўся, а Мітрафан ведаў гэтага чалавека даўно — з Нямеччыны, калі яны разам эксплуатаваліся немцамі на тым праклятым рудніку. Ён таксама быў не жанаты, і пасля таго, як падзяліліся яны тым, што хвалявала і непакоіла абодвух, вырашылі з'ездзіць у сталіцу, да дактароў, каб даведацца, чым яны горшыя за іншых мужчын? З'ездзілі, і даведаліся. Цяпер часта Мітрафан успамінае той высокі стол, за якім ён стаяў і пісаў па прымусу наглядчыкаў сваю аўтабіяграфію. Такія аўтабіяграфіі, кажуць, пісалі і дзяўчаты. А за сцяной быў усталяваны рэнтген, і ягоны прамень забіваў тым часам у гэтых маладых людзей бацькоў і мацярок...

Вельмі шкадаваў пасля Мітрафан, што яму не хапіла якога года, каб трапіць на вайну. Выжыў бы — ён сказаў бы тады сваё слова пра вайну, выканаў бы просьбу Івана Іванавіча. Не выжыў — сказалі, мабыць, пра яго нешта іншыя ...

❑ ❑ ❑

Як даўно і нядаўна было ўсё гэта!

Я зноў прыехаў у сваю вёску на 9 Мая. Паклаў кветкі на кладах да таты і мамы. З акна сваёй хаты, як і раней, доўга глядзеў на брацкую магілу: да яе ніхто не ішоў. Няма ні Хавошкі, ні Наталлі, ні Мітрафана. Памерлі Іван Іванавіч і Мікалай Кірылавіч. Няма і школы. Некалькіх хлопчыкаў і дзяўчынак возяць у суседнюю вёску, там сярэдняя школа. Наша васьмігодка згарэла ў грубах той, сярэдняй.

Каб жыла мама, яна б мне абавязкова сказала: «Схадзі, сынок, да брацкай магілы... Падмяці там, прыбяры... Недзе ж і наш дзядзька Хведар пахаваны... Схадзі, паглядзі, як там...»

Я пайшоў. Узяў што трэба, і пайшоў... А потым да мяне падышоў хлопчык з граблямі, моўчкі пачаў гарнуць у валок леташняе перапрэлае лісце, а пазней з'явіўся другі хлопчык, трэці, прыбеглі дзяўчаткі, прытупалі таксама з нейкім рабочым інструментам дзве бабулі, якіх я, прабачце, не ведаў, мабыць, прыехалі будуць.

Яны, відаць, таксама пачулі сваіх мацярок, гэтыя людзі. І жывых, і мёртвых.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (14 ліпеня).

Па гарызанталі: Пустыня. Здор. Кета. Гоман. Пол. Друк. Анкер. Сажа. Інтарэс. Апалак. Кар. Каркас. Страта. Балота. Дан. Юнак. Справа. Ротар. Горы. Кіп. Натура. Ляда. Абух. Сал. Араб. Згода. Наследнік.

Па вертыкалі: Джунглі. Борт. Матор. Лютня. Крона. Нерпа. Тарка. Смак. Пас. Пасаг. Закон. Барон. Ярд. Елка. Улада. Ост. Бас. Вір. Адрас. Сын. Стэп. Русак. Рот. Каланада. Жар. Тавар. Грак. Кана. Абабак.

ПАЙШЛО ДЗЯЎЧО Ў ДЗІЦЯЧЫ САДОК

На слыху

У 11 гадзін ночы 19-гадовая дзяўчына разам з трыма знаёмымі весела бавіла час на тэрыторыі аднаго з дзіцячых садкоў у Гомелі. Пакінуць месца забавы кампанія магла толькі праз агароджу. Адна з шукальніц прыгод, калі пралазіла, захрасла. Ды так, што давялося выклікаць супрацоўнікаў МНС: каб вызваліць нагу, якая апынулася паміж металічнымі прутамі. Выратавальнікі справіліся з задачай — з дапамогай спецыяльнага інструмента. А можа, увогуле не трэба было шукаць прыгод на сваю... нагу?

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КУПАННЕ І ПІКНІК НА САЖАЛЦЫ СКОНЧЫЛІСЯ ТРАГІЧНА

10 ліпеня каля 22 гадзін у рацэ Бярэзіна ў Бабруйску патанула 40-гадовая жанчына, рабочая мясцовага прадпрыемства. 12 ліпеня ўдзень у вадаёме ў вёсцы Кісялёва Буда Клімавіцкага раёна ўтапіўся 30-гадовы мясцовы жыхар, які нідзе не працаваў. Паводле сведак, мужчына быў нецвярозы. Целы тапельцаў шукаюць.

Алена КАЗЛОВА.

ЛІЛЕІ ПАД ДАЖДЖОМ

У выхадныя зноў дождж. Асабліва даняў у суботу: як пачаўся на світанні, то сыпаў, сыпаў... А на рынку поўная «безнадзёга». Прадаўцы і пакупнікі пад парасонамі, а тавар прыкрыты плёнкай.

Шкада было куранят, якія ад холаду ціснуліся ў клетках.

Прапаноўвалася бульба з гуркамі ды памідоры з ягадамі — тавар знаёмы. Праўда, ягад значна паменшала. Клубніцы знікаюць, а найбольш чарніц ды парэчак.

На рынку было б сумна, калі б не кветкі. Яны напамінаюць пра лета і пра тое, што яшчэ ёсць надзея на сонца і цяпло. Кветкі прадаюць на пасадку.

Тыдні два таму рынак запаланілі касачы. Выкапаныя з карэннем, яны стаялі ў вёдрах і прыцягвалі ўвагу каляровай гамай. Тут барвова-залаціста-белыя, а там — сіне-фіялетавыя. Касачы — кветкі вытанчаныя і вельмі прыгожыя, але ўсё ж па дэкаратыўнасці ўступаюць лілеям. Апошнія выглядаюць больш велічна.

Настаў час лілей. Можна выбраць і пасадзіць каля свайго дома. Лілеі — даволі папулярныя кветкі, і праязджаючы па прыватным сектары, з акна аўтобуса бачыш, што яны растуць на многіх участках.

У прыродзе існуе каля ста відаў лілей, але на рынку выбар адносна невялікі. Мне падалося, што гатункаў не набярэцца і дзесяці, а ў вочы найперш кідаецца іх колер. Але большасць лілей у жоўта-залацістай гаме, многа чырвоных, а вось белых — адзінкі. Лілеі барвовага ці цёмна-фіялетавага колеру прыцягваюць увагу, але, на мой погляд, яны саступаюць белым. Не магу сцвярджаць, што лілея Царская самая прыгожая, але яна вельмі эфектная. А яшчэ ёсць лілеі Тыгровыя, Давіда, Шафранавыя і інш., а самая высокая лілея Леапардавая — дасягае двухметровай вышыні!

У мінулым лілея лічылася сімвалам чысціні і бязвінасці. Яе выяву можа ўбачыць і на гербе, напрыклад, французскіх каралёў. А сёння гэтыя кветкі ўпрыгожваюць сядзібы, паркі і хораша глядзяцца асобнымі купкамі. Дарэчы, лілеі рэдка выкарыстоўваюцца для букетаў — найлепшае для іх месца — сад, клумбы...

Канец ліпеня і жнівень — час пасадкі лілей. Можна вырошчваць іх і насеннем, але гэта даволі працяглы працэс. Прасцей будзе высаджваць цыбулінкамі, а найлепш купіць расліну падчас цвіцення: хоць бачыш, што набыў.

Я не вялікі спецыяліст па гэтых кветках, але ведаю, што глыбіня пасадкі лілей з надцыбулькавымі карэнямі да 25 см, для іншых — на 10—12 см, а вось для белай — 3-5 см.

Калі лілеі пасадзіць не на адкрытай прасторы, а пры частковым зацненні, то яны лепш растуць і больш пышна цвітуць. На зіму кветкі не выкопваюць, а ўкрываюць карэнне лісцем ці торфам.

Але з пакупкай лілей не трэба спяшацца. Вось я пахадзіў па рынку і не магу сказаць каб нейкі гатунак прываражыў. Кветкі прыгожыя, асабліва пад дажджом — гараць. Толькі хочацца незвычайных, каб зачароўвалі...

І нічога страшнага, што не ўдалася знайсці лілею па душы — неўзабаве яны адыдуць і з'явяцца хрызантэмы — о-о-о, якая гэта прыгажосць!.. Ды ўвогуле кветкі як дзяўчаты — прайшла прыгажуня, вачэй не адарваць, а следам ідзе яшчэ...

Сымон СВІСТУНОВІЧ, фота аўтара.

ВЕРА І МУЗЫКА АЛЯКСЕЯ КРЭЧАТА

Муз-NEWS

Гэтаму хлопцу ёсць на каго раўняцца — знакамітыя музыканты Рэй Чарльз, Стыві Уандэр, Андрэа Бачэлі змаглі насуперак слепаце дамагчыся сусветнага прызнання. Вось і мінчанін Аляксей Крэчат, які рана страціў зрок, тым не менш, не апусціў рукі і вырашыў дасягнуць вяршыняў ва ўлюбёнай справе.

Ён скончыў Інстытут сучасных ведаў па спецыяльнасці «мастацтва эстрады» і выбраў свой стыль — рок-музыка, у якой найлепш раскрываецца дыяпазон голасу ў 2,5 актавы.

Амбіцыі ў Аляксея падмацоўваюцца першымі поспехамі — прызамі міжнародных фестываляў на Мальце і ў Малдове, удзелам у паўфінальных адборах на конкурсы «Новая хваля» і «Еўрабачанне», нарэшце, прэміраваннем ад спецыяльнага фонду Прэзідэнта РБ па падтрымцы таленавітай моладзі. Пачуць голас невідушчага, але надзвычай таленавітага выканаўцы слухачы маглі ў спектаклях Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра, на канцэртах гуртоў «Арызона» і «Шторм»... Цяпер — яшчэ і на дэбютным альбоме Аляксея Крэчата «Вер». На дыск трапілі 13 песень, аўтар большасці з якіх — сам Аляксей; а ў запісе ўдзельнічалі вядомыя беларускія музыканты — Аляксей Старажук, Павел Трацяк, Сяргей Анцішын, Юрый Вашчук і іншыя. Большасць песень — на рускай мове, хоць у якасці прыемнага бонусу ёсць некалькі англа- і беларускамоўных кампазіцый.

Сам Аляксей называе стыль, у якім працуе, жыццесцвярджальным поп-рокам і прызнаецца, што не абмяжоўвае сябе класічнымі музычнымі канонамі: «Мой свет — гэта складаная гармонія, але простая мелодыя, якая звязвае адасобленыя аскепкі, асобныя фарбы і мімалётныя адчуванні ў адно цэлае». Для таго, каб данесці гэта цэлае да шырокага слухача, выканаўцу засталося не так многа — знайсці музыкантаў, гатовых да пастаяннага супрацоўніцтва. Спявак спадзяецца і верыць, што гэта атрымаецца ўжо неўзабаве.

«ГАЛОЎНАЕ НА СВЕЦЕ» ВОЛЬГІ ПЛОТНІКАВАЙ

Спявачка разам з мужам і прадзюсарам Генадзем Маркевічам вырашыла нагадаць слухачам, што артысты па-за сцэнай — такія ж людзі, як і ўсе астатнія, і што галоўнае для іх не шык і бляск, а сям'я і дзеці. «Галоўнае на свеце — гэта нашы дзеці» — песеньку з такой немудрагелістай назвай сямейны тандэм напісаў у суаўтарстве з паэтам Алесем Бадаком.

А для выканання яе былі запрошаныя артысты, у якіх ёсць уласныя дзеці, маленькія і дарослыя. У каманду зорных бацькоў увайшлі Іна Афанасьева, Аляксей Хлястоў, Леся Кодуш і Слава Нагорны, Венера, Ларыса Грыбалёва, Андрэй Хлястоў, Іскуі Абалян, Тарыел Майсурадзе, Галіна Шышкова, Шыр, Алена Грышанава, Сяргей Мінскі і сама Вольга Плотнікава, а таксама яшчэ чамусьці дзявочае трыо «By City» — відаць, як патэнцыйныя мамы. Акрамя таго, у якасці адной з выканаўцаў выступіла і маленькая дачка Вольгі Плотнікавай Аліна, адносна сцэнічнай будучыні якой бацькі, відаць, не жартавалі. «Мы выпадкова падслухалі, як яна напявае прыпеў, і вырашылі жартам запісаць, — сцвярджае Вольга Плотнікава. — Безумоўна, дачка яшчэ вельмі маленькая і не ўсе словы вымаўляе выразна, з-за чаго некаторыя фразы атрымаліся размытымі — але спявала вельмі чыста. У выніку гэты запіс увайшоў і ў канчатковы варыянт песні, а сама яна, на мой погляд, атрымалася вельмі добрай і кранальнай».

Днямі на песню «Галоўнае на свеце — гэта нашы дзеці» з дапамогай тэлепраекта канала «ЛАД» — «Прасоўванне+» — быў зняты кліп, галоўнымі героямі якога сталі таксама дзеці. Але што дакладна з гэтага атрымалася, гледачы ўбачаць толькі ў пачатку наступнага сезона.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.57	21.33	16.36
Віцебск —	4.39	21.30	16.51
Магілёў —	4.47	21.24	16.37
Гомель —	4.52	21.12	16.20
Брэст —	5.14	21.47	16.33
Гродна —	5.23	21.39	16.16

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Ювеналія.*

К. *Генрыха, Давыда, Уладзіміра.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні

...у суседзяў

ВАРШАВА	+27..+29°C	КІЕЎ	+31..+33°C	РЫГА	+19..+21°C
ВІЛЬНЮС	+21..+23°C	МАСКВА	+27..+29°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+22..+24°C

Дзве даты

15 ліпеня

1876 год — у фальварку Пешчын (цяпер Шчучынскі раён) нарадзілася Цётка (Алаіза Пашкевіч), беларуская паэтэса-рэвалюцыянерка. Брала актыўны ўдзел у стварэнні Беларускай сацыялістычнай грамады. Літаратурную дзейнасць пачала ў 1902 годзе пад уплывам творчасці Ф. Багушэвіча. У 1914 годзе рэдагавала часопіс для дзяцей і моладзі «Лучынка». Аўтар зборнікаў вершаў «Хрышчэнне свабодай» і «Скрыпка беларуская», кніг «Першая чытанка для дзяцей-беларусаў» і «Беларускага «Буквара». Вывучала гісторыю беларускага народнага тэатра батлейкі. Яе творы перакладзены на рускую, украінскую, польскую, нямецкую мовы. У гады Першай сусветнай вайны працавала фельчарам у віленскім тыфозным бараку, дзе, заразіўшыся цяжкай хваробай, і памерла ў 1916 годзе.

1606 год — нарадзіўся Рэмбрант Харменс ван Рэйн, славуты нідэрландскі жывапісец, афарыст. Наватарскае мастацтва Рэмбранта вызначаецца дэмакратызмам, жыццёвасцю вобразаў. Пісаў партрэты, у тым ліку групавыя («Начны дазор», 1642), рэлігійныя («Святое сямейства», 1645) і міфалагічныя («Даная», 1636) сцэны.



Цытата дня:

«Адзіны спосаб вызначыць межы магчымага — выйсці за гэтыя самыя межы».

Осцін Кларк (1896—1974), ісландскі паэт.

БЕРАГІНЯ

свет і сусвет
ЧАЛАВЕКА

● У народзе 15 ліпеня ўшаноўвалі Берагіню — ахоўніцу сялянства. Казалі, што ў гэты дзень яна абыходзіць падуладныя ёй тэрыторыі і дапамагае бедным.

● Лічылася, што жанчыны, народжаныя ў гэты дзень, будуць спрытнымі і руплівымі гаспадынямі, вернымі жонкамі, як і багіня-ахоўніца Берагіня.

Берагіня. У культуры ўсходніх славян здавён у ліку духаў-ахоўнікаў асаблівай павагай адрозніваліся жаночыя духі. Відавочна, што іх ўшанаванне пачалося з часоў матрыярхальнага перыяду. У народнай традыцыі берагіні атаясамліваліся з добрымі, станоўчымі сіламі, якія ахоўваюць чалавека. Часцей за ўсё выява берагіні прысутнічала ў разьбярстве ў выглядзе птушкі або рыбы. Часам яе параўноўвалі з русалкай. Сувязь берагіні і вады, а значыць, і пладаноснасці, была відавочнай. Само слова «берагіня» паходзіць ад слова «бераг» і дзеяслова «берагчы, ахоўваць». Каб навучыцца плаваць, удала налавіць рыбы і г.д., неабходна было абрацца «правільны» бераг, які схавае ў цяжкую хвіліну ці дасць магчымасць выйсці з вады і крыху адпачыць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Віншуем з днём нараджэння любую матулю і бабулю **МАРМЫШ Алу Міхайлаўну** з пасёлка Новагарадзейск Нясвіжскага раёна.

Даражэнькая наша, мы цябе вельмі любім і паважаем. Жадаем моцнага здароўя. Нават, калі б мы ўвесь свет змаглі табе падарыць, то і яго было б мала, каб падзякаваць за тваю дабрыню.

Твае дачка Эла і ўнукі Настасся і Сяргей.

Усміхнёмся!

Жонка — мужу:

— Бачу, ты ізноў нічога не злавіў!

— Не, я злавіў адну рыбіну.

— І дзе ж яна?

— Плавае недзе з маім спінінгам...

☺

Дзяўчатам трэба абяцаць увесь свет. А купляць — марожанае.

☺

— Скажы мне хто ты — і я скажу, хто твой сябар!

— Я — мільярдэр.

— Я твой сябар!!!

Усмешка з канверта

Жанчыну, якая пачапіла на сябе аж дзве лісіныя шкуркі, спыталі:

— Навошта вы столькі лісаў павесілі адразу?

— Чым больш лісаў, тым больш паляўнічых, — адказала тая.

☺

Фельчар: «Вось, цётка, будзеце даваць гэтыя лекі свайму старому па дзесяць лыжак на дні».

— А божухна ж мой! Дзе ж я вазьму столькі лыжак? У мяне ж толькі чатыры.

☺

Прынесла бабка суддзі кошык грушаў. Суддзя, не вельмі задаволены гасцінцам, кажа:

— Навошта ты, бабка, прынесла? Твае ж бы дзеткі зласаваліся.

— А дзеткі, даражэнькі, так пабудуць. Я ім скажу, што свінні з'елі.

Сабраў Лявон АНЦІПЕНКА.
г. Шклоў.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zvyazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 3797. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12